# УСТУПНАЕ СЛОВА

«Однако общество должно быть надежно защищено от деструктивных факторов»

*Из обращения Александра Григорьевича Лукашенко с посланием белорусскому народу и Национальному Собранию 19 апреля 2005 г.*

На сучасным этапе развіцця беларускага грамадства наша краіна выйшла на рубяжы, з якіх ужо стала рэальным вырашэнне якасна новых задачаў пабудовы маналітнага грамадска-палітычнага ладу. Гэта тое, што адпавядае нашаму разуменню прэзідэнцкай сістэмы ўлады і месца Прэзідэнта ў ёй. У гэтых умовах павялічваецца актуальнасць курсу «Асновы бяспекі жыццядзейнасці», які з ініцыятывы кіраўніка дзяржавы быў уведзены з 2004 г. у сярэдніх, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь.

У часы, калі польскі народ змагаўся з дыктатурай у сваёй краіне, сярод польскага руху супраціву была распаўсюджаная брашура «Малы канспіратар». У ёй былі змешчаныя парады «часова вольных людзей» з тым, як трэба арганізоўваць падпольную працу. Цяпер беларускае грамадства імкліва набліжаецца да падобнага ладу грамадска-палітычнай дзейнасці і паўстае пытанне бяспечнага вядзення гэткай дзейнасці. Польскі «Малы канспіратар» ізноў набывае папулярнасць, гэтым разам сярод беларусаў.

Аўтары дадзенага дапаможніка прапануюць чытачам сваё бачанне таго, як бяспечным чынам арганізаваць працу падпольнай арганізацыі. Аднак дапаможнік можа быць карысным і для індывідуальных асобаў, якім таксама пагражаюць незаконныя абмежаванні правоў і палітычны пераслед.

Як і «Малы канспіратар», мы ў дадзеным тэксце звяртаем увагу не толькі на асноўныя правілы бяспекі і канспірацыі, але і на прававыя захады абароны сваіх правоў і сваёй дзейнасці – пакуль у нашай краіне захаваліся дэкаратыўныя прыкметы законнасці. Але не трэба забывацца, што ў палітычных справах закон у Беларусі больш не дзейнічае – таму трэба ладзіць сваю дзейнасць такім чынам, каб, па магчымасці, не патрапіць у кіпцюры дзяржавы. У гэтым дапаможніку вы знойдзеце некалькі парадаў пра наладжванне інфармацыйнай бяспекі ў пад-

поллі, пра прэвентыўную абарону памяшкання і асобы, у тым ліку падчас следчых дзеянняў і затрыманняў, пра сродкі прадухілення некаторых правакацыяў з боку ворага. Магчыма, не ўсе выкладзеныя парады будуць для вас прымальныя і абгрунтаваныя – але яны, прынамсі, падштурхнуць вас да больш пісьменнай і рацыянальнай пабудовы працы вашай ініцыятывы.

У якасці дапаможнага матэрыялу змешчаны выбраныя кавалкі з тэксту польскага «Малога канспіратара». У тэксце шырока выкарыстоўваліся і іншыя матэрыялы падобнага кшталту. Аўтары вітаюць як мага шырэйшы распаўсюд і капіраванне гэтага выдання, а таксама спадзяюцца, што адмыслоўцы здолеюць выправіць мажлівыя памылкі і недахопы альбо дапоўняць яго дадатковымі карыснымі парадамі.

Дадзены дапаможнік прызначаны для выкарыстання ў якасці метадычнага матэрыялу для грамадска-палітычных актывістаў і агітатараў ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне сярэдняй тэхнічнай адукацыі. Можа быць скарыстаны падчас падрыхтоўкі і правядзення палітінфармацыяў, у выкладанні дысцыпліны «Асновы ідэалогіі Беларускай дзяржавы».

**Аўтары-ўкладальнікі**

# БЯСЬПЕКА ЯК ПРАЦЭС. ДАВЕР І НАДЗЕЙНАСЬЦЬ

Напачатку – трошкі «філязофіі». У побытавым разуменьні бясьпека ўспрымаецца як **стан** рэчаў, у якім вам нічога не пагражае. Аднак, каб падысьці да больш эфэктыўных спосабаў грамадзянскай самаабароны, вы мусіце адмовіцца ад падобнага стэрэатыпу. Бясьпека (у кантэксьце нашага апавяданьня) – гэта **няспынны працэс** спраўджваньня і ўдасканальваньня паводзінаў ды арсэналу сродкаў абароны, з мэтай арганізаваць вашую грамадзка-палітычную дзейнасьць такім чынам, каб варожы ўплыў ня мог істотна панізіць яе выніковасьць. Няма такога захаду, які можна было б зрабіць аднойчы, каб назаўсёды абараніць сябе ці сваю арганізацыю, бо пагрозы мяняюцца бясконца, увесь час.

Гэтая брашура пакліканая стаць адным зь першых крокаў на вашым шляху **забесьпячэньня права на ўдзел у жыцьці краіны**, які можа доўжыцца ўсё вашае жыцьцё ці, прынамсі, усё жыцьцё, якое вы прысьвяціце палітычнай і грамадзкай актыўнасьці.

## Поўная бясьпека, выдаткі на абарону і выдаткі на атаку

Варта адразу зразумець: стоадсоткавых гарантыяў бясьпекі вам ня дасьць ніхто і нішто (нават страхавы поліс), імавернасьць атакі існуе заўсёды. Ваш шлях – паводзіць сябе такім чынам і карыстацца такімі сродкамі бясьпекі, каб выніковасьць падобнай атакі была ніжэйшая за тыя выдаткі, якіх запатрабуе яе арганізацыя. Гэта дасягальная мэта, нават пры тым аграмадным дысбалянсе сілаў і рэсурсаў, які існуе паміж намі і спэцслужбамі рэжыму. Для гэтага вы мусіце ў першую чаргу абапірацца на тыя якасьці, якія звычайна мае сумленны актывіст і якіх звычайна ня мае служка (найміт) дыктатуры, – гэта ўменьне працаваць бяз грошай і без рэсурсаў, працаваць па-за працоўным часам, сяброўства і бескарысьлівая ўзаемадапамога, маральныя прынцыпы, якія дапамогуць вам захаваць трываласьць у складаным становішчы.

Важна ацэньваць таксама суадносіны паміж выдаткамі на бясьпеку і непасрэднай дзейнасьцю. Калі бясьпека пачынае захінаць тыя задачы, дзеля якіх вы сталі актывістам, – значыць, нешта трэба рэфармаваць.

Асвоіўшы новыя больш эфэктыўныя мэтады працы – пашырайце іх, гэта павялічыць нагрузку на рэпрэсіўна-шпігоўскі апарат і аслабіць ціск на вас.

## Бясьпека і параноя

Часам – асабліва па абедзе ў яснае надвор'е – прыходзіць думка: «Навошта мне гэтая бясьпека? Я маленькі, нікому не цікавы чалавек, а ўсюдыіснасьць спэслужбаў падаецца відавочнай прыдумкай». Часам некаторыя людзі, бачачы вашыя працэдуры абароны, пачынаюць круціць пальцам ля галавы – маўляў, во вар'ят! На гэта можна адказаць шырока пашыранай – у вузкім коле – прымаўкай: **калі ў вас няма маніі перасьледу, гэта яшчэ ня значыць, што за вамі ня сочаць**.

Людзі, якія воляю лёсу прайшлі савецкае войска, маглі засвоіць някепскае выслоўе: лепш перапільнавацца, чым недапільнавацца. Магчыма, вашыя захады празьмерныя, але ў кожным разе лепш выглядаць параноікам, чым быць раздалбаем. Пагатоў гэта верна, калі ад вас залежыць бясьпека іншых людзей.

## Бясьпека, давер, надзейнасьць

Можна сьцьвярджаць, што бясьпека вельмі моцна залежыць ад таго, як вы распараджаецеся сваім *даверам* і што (каго) вы лічыце *надзейным.*

Абодва гэтыя паняткі ўжывальныя ня толькі да людзей, але й да тэхналёгіяў абсталяваньня, крыніцаў інфармацыі і г. д. Трэба ясна разьмяжоўваць *кола даверу* (аб'екты, вартыя даверу) і астатні сьвет, каб правільна будаваць дачыненьні (разьмяркоўваць абавязкі, атрымліваць і перадаваць інфармацыю, піць альбо ня піць разам піва і г. д.). Важна ня блытаць *давер* і прэзумпцыю невінаватасьці. Часам можна пачуць: «Як мы можам праявіць недавер да гэтага чалавека, мы ж нічога кепскага пра яго ня ведаем!» Гэта няправільны падыход: віна – усталёўваецца на падставе неабвержных фактаў, *давер* можна (і трэба) будаваць на інтуіцыі, уражаньнях і жыцьцёвым досьведзе. Кожны новы чалавек на вашым шляху – невінаваты, пакуль не даказана адваротнае, і **кожны ня варты даверу, пакуль не даказана адваротнае.**

*Давер* можа быць непасрэдны – X давярае Y – альбо ўскосны, перададзены: «X давярае Y, які ў сваю чаргу рэкамэндаваў яму Z». Такім чынам, могуць утварацца даволі вялікія *сеткі даверу* з асабіста незнаёмых

асобаў (аднак чым большы памер сеткі, тым большая магчымасьць праколу праз памылковы давер).

*Надзейнасьць* – стаіць блізка да даверу, але ўсё ж гэты тэрмін мы звычайна ўжываем да аб'ектаў, **правераных** тым ці іншым чынам альбо прынамсі збольшага правераных, бо абсалютная ўпэўненасьць часта немагчымая. У адрозьненьне ад даверу, надзейнасьць ёсьць катэгорыя аб'ектыўная – яе ацэнка будуецца (павінная будавацца) не на інтуітыўных прадчуваньнях, а на фактах.

Яшчэ раз зазначым, што і *давер*, і *надзейнасьць* – крытэры ацэнкі, ужывальныя практычна да ўсяго, з чым вы сутыкаецеся. Ці вы плянуеце разьмеркаваць абавязкі ў межах арганізацыі, ці вы зьбіраеце абсталяваньне для офісу, вызначце – магчыма, пісьмова – кола даверу і надзейныя (ненадзейныя) элемэнты і, ужо грунтуючыся на гэтых высновах, дзейнічайце далей.

# 1. АБАРОНА НОСЬБІТАЎ ІНФАРМАЦЫІ І СРОДКАЎ КАМУНІКАЦЫЯЎ

Перад тым як даваць парады, зьвязаныя з вылічальнай тэхнікай і праграмнымі тэхналёгіямі, вызначым нашыя базавыя паняткі *давер* і *надзейнасьць* у кантэксьце гэтае тэмы.

Праграма вартая даверу, калі яна дастаткова **распаўсюджаная** (маецца на ўвазе ў кампутаровым сьвеце, бо распаўсюджанасьць, напрыклад, у Буда-Кашалёве ці нават у Менску нельга ўспрымаць як сур'ёзны аргумэнт), калі яе **код даступны** для праверкі для кожнага, хто пажадае (у прафэсійнай тэрміналёгіі open-source, праграмы з адкрытым кодам), калі дыстрыбутыў (інсталяцыйны дыск) **атрыманы з вартых даверу крыніцаў**. Ня варта захапляцца скачваньнем розных цікавых праграмак з Інтэрнэту, бо існуе шмат сайтаў, дзе вы разам з крэкнутымі праграмамі атрымаеце ў дадатак пару-тройку траянаў. Калі йдзецца пра сродкі шыфраваньня і забесьпячэньня электроннае бясьпекі, пірацкі дыск, куплены з латка ці нават у краме, **не зьяўляецца вартай даверу крыніцай!** Такія праграмы трэба выладоўваць з Інтэрнэту з сайту вытворцы ці купляць праз замежныя Інтэрнэт-крамы. Інакш вы рызыкуеце нарвацца на запушчаную спэцслужбамі ці проста нягоднікамі фальшыўку, якая будзе ўтрымліваць шпігоўскія «закладкі».

Абсалютна *надзейных* праграмаў практычна не існуе, але больш-менш надзейнымі можна лічыць тыя, што былі правераныя прафэсіяналамі ў галіне кампутаровай бясьпекі.

І яшчэ адна папярэдняя заўвага: усе тэхнічныя сродкі бясьпекі інфармацыі і камунікацыі мала чаго вартыя, калі ў арганізацыі пануе бязладзьдзе, адсутнічае дысцыпліна і не выконваюцца дырэктывы начальства. Калі на штаб-кватэры тусуюцца невядомыя асобы, арганізоўваюцца п'янкі і гулянкі з запрашэньнем ненадзейных, сумнеўных і патэнцыйна варожых элемэнтаў – выдаткаваныя на бясьпеку сродкі будуць простым марнатраўствам.

## Як захоўваць інфармацыю на кампутары?

Працу сучаснай арганізацыі немагчыма ўявіць без шырокага выкарыстаньня кампутарнай тэхнікі. У большасьці беларускіх арганізацыяў менавіта на кампутарах, а не на паперы зьмяшчаюцца масівы

інфармацыі, у тым ліку канфідэнцыйнай, якая можа зацікавіць спэцслужбы. Часам гэтая інфармацыя можа стаць падставай для прыцягненьня да адміністрацыйнай альбо нават крымінальнай адказнасьці – у дзейнасьці беларускіх няўрадавых арганізацыяў ужо былі гэткія выпадкі.

Захоўваньне інфармацыі на кампутары больш зручнае для працы, чым захоўваньне яе ў папяровым выглядзе, а таксама ў нейкім сэнсе больш бясьпечнае. Гэта зьвязана з тым, што інфармацыю ў электронным выглядзе значна прасьцей зашыфроўваць і перазашыфроўваць, чым інфармацыю на папяровых носьбітах.

Такім чынам, галоўнае правіла, якім трэба карыстацца пры працы на кампутары, – **шыфруй!** Ваш прыватны кампутар можа быць скрадзены альбо выняты ці канфіскаваны спэцслужбамі, а таксама існуе небясьпека, што да яго могуць атрымаць доступ непажаданыя пэрсанажы. Таму абавязкова трэба карыстацца сродкамі шыфраваньня інфармацыі.

Шыфраваць можна як асобныя файлы, гэтак і цэлыя дыскі. Існуюць таксама «віртуальныя шыфраваныя дыскі» (далей ВШД) – гэта вялікія файлы, якія ўнутры сябе зьмяшчаюць у зашыфраваным выглядзе мноства іншых файлаў. Гэта падобна да zip- ці rar-архіву, адрозьненьне ў тым, што адмысловыя праграмы дазваляюць адчыніць (у кампутаровай тэрміналёгіі «змантаваць») іх так, што зь зьмесьцівам гэтых файлаў можна працаваць як з асобнымі дыскамі (ці каталёгамі), пры гэтым сыстэма аўтаматычна шыфруе тое, што вы пішаце на свой віртуальны дыск, і расшыфроўвае тое, што вам трэба прачытаць. Па заканчэньні працы вы зачыняеце (дэмантуеце) дыск – і інфармацыя становіцца недаступнай. Апісаны парадак працы карысны для няўрадавых арганізацыяў: кожны супрацоўнік мае свой зашыфраваны дыск і толькі ён ведае пароль ад гэтага дыску. Такім чынам дасягаецца дастаткова вялікая ступень карпаратыўнай бясьпекі – ня толькі праз тое, што праца кожнага з карыстальнікаў зашыфраваная і недаступная для «ворагаў», але таксама і праз тое, што супрацоўнікі ведаюць толькі свой сэгмэнт інфармацыі і ня маюць паролю для іншых ВШД. Бадай што, ВШД – адзін з аптымальных сродкаў працы зь вялікай колькасьцю важных файлаў.

Варта згадаць пра такі мэтад абароны інфармацыі, як **стэганаграфія**. Спрошчана, гэта спосаб схаваць канфідэнцыйную інфармацыю,

незаўважна ўнятрыўшы яе ў несакрэтную. Напрыклад, стэганаграфічным зьяўляецца тэкст тэлефанаваньня «Трэба ехаць у Гальшаны – бабуля ўжо нагатавала сочыва зь яблыкаў» – хто ведае, што ў гэтых бяскрыўдных словах схаванае паведамленьне «Ў падпольнай друкарні выраблены наклад улётак». Аналягічна і ў кампутаровай інфармацыі сакрэтнае паведамленьне можна прыхаваць у несакрэтным файле. З гэтай магчымасьці мае сэнс скарыстаць у выпадку, калі трэба ня проста абмежаваць доступ да інфармацыі, але зрабіць сам факт яе існаваньня таямніцай. Напрыклад, файл з дакумэнтам можна «ўплесьці» ў карцінку (здымак з рыбалкі), фільм ці музычны трэк, прычым выніковая карцінка візуальна ня будзе адрозьнівацца ад арыгінальнай, фільм можна будзе глядзець, а музыку слухаць, анічога асаблівага не заўважыўшы. Зразумела, гэты мэтад мае свае заганы. Асноўная – каб сакрэтны файл сапраўды незаўважна «расчыніўся» ў нетрах падстаўнога, памер апошняга мусіць быць сама меней у 15–20 разоў большы за памер сакрэтнага. Так што калі вы будзеце хаваць вялікія файлы, дыскавая прастора будзе выдаткоўвацца вельмі неэканомна, апроч таго, можа ўзьнікнуць праблема знайсьці падстаўны файл патрэбнага памеру.

Калі вы вырашыце пакарыстацца стэганаграфічнымі праграмамі, паклапаціцеся пра тое, каб аніхто ня выдаліў тых файлаў, у якіх таемна захоўваецца вашая інфармацыя (нехта ж можа без асаблівага клопату паставіцца, напрыклад, да музычнага файлу і выдаліць яго, каб вызваліць месца на дыску).

## Паролі

Паролі для шыфраваньня – калі вы не падыдзеце да гэтага пытаньня адказна – стануць вашай праблемай.

Прыдумаць пароль для шыфравальнай праграмы – гэта сур'ёзная задача! Сучасныя сыстэмы ўзлому здольныя з высокай хуткасьцю перабіраць розныя варыянты пароляў з выкарыстаньнем слоўнікаў. Дапрыкладу, уявім грамадзкага актывіста, які дзеля прастаты ўзяў за пароль нейкае слова. Нават калі слова рэдкае – гэта пракол, бо прабегчыся па слоўніку праграма-ўзломнік зможа досыць спрытна. Хутчэй за ўсё, дастаткова будзе перабраць колькідзясят тысячаў варыянтаў, а гэта зусім няшмат для сучаснай кампутарнай тэхнікі. Дадайце да гэтага, што ў праграму могуць быць уведзеныя вашыя пэрсанальныя зьвесткі (прафэсія, любімая музыка, імёны сямейнікаў і сяброў, хобі і

г. д.), і гэта дазволіць расставіць прыярытэты і звузіць дыяпазон пошуку. Такім чынам, калі вы выкарыстоўваеце мянушку вашага сабакі ці дзень нараджэньня жонкі ў якасьці паролю – ведайце, для яго ўзлому можа хапіць некалькіх сэкундаў.

Надзейны пароль – доўгі (даўжыня залежыць ад канкрэтнага выпадку, але ў кожным разе ня менш за 8 знакаў), ніякай лёгікай ня зьвязаны з вамі і складзены з розных сымбаляў: літараў, лічбаў і спэцыяльных пазнакаў (накшталт ~ @ # &). Выкарыстоўвайце вялікія і малыя літары. Прыклад добрага паролю: Qni/u@917_GoX62. Ён нічога ня значыць, яго немагчыма вылічыць альбо падабраць з слоўніка, хіба толькі зрабіць перабор знакаў, але ж у такім разе колькасьць варыянтаў будзе занадта вялікай.

Відавочна, што надзейны пароль нялёгка запомніць, і ў выпадку, калі вам даводзіцца апэраваць мноствам складаных пароляў – хутчэй за ўсё так і будзе, – сытуацыя можа выйсьці з-пад кантролю. Многія людзі пачынаюць занатоўваць свае паролі на паперы – і гэта вельмі-вельмі кепска, бо паперкі маюць уласьцівасьць губляцца, вы можаце забыцца альбо пакінуць без нагляду свой нататнік, а ў выпадку непасрэдных рэпрэсіяў вас абшукаюць і ўсе падазроныя запісы будуць вывучаныя. Хочацца папярэдзіць, што бальшыня нібыта хітрых прыёмаў – напрыклад укласьці паперку з паролямі пад акумулятар мабільніка альбо занатаваць эсэмэскай у памяці тэлефона – насамрэч былі правальнымі яшчэ да таго, як вы іх «вынайшлі».

З гэтага тупіка існуюць тры выйсьці.

1. Захоўваць паролі ў спэцыяльнай праграме (можна парэкамэндаваць *Password Safe*), у гэтым выпадку вы цьвёрда завучваеце адзін пароль, што адкрывае доступ да праграмы, якая ў сваю чаргу падказвае вам усе астатнія.

2. Занатоўваць паролі, выкарыстоўваючы пэўны код. Які? Прыдумайце самі, і не забудзьцеся схаваць пяць сапраўдных пароляў у сотні фальшывых, запісы рабіце ў беспарадку, уздоўж і ўпоперак. Зацемім толькі, што пісаць пароль наадварот (задам наперад) – гэта ня будзе кодам, відавочна патрэбнае штосьці больш крэатыўнае.

3. Нічога не запісваць, а запамінаць з выкарыстаньнем адмысловых мнэматэхнікаў. Гэты шлях вымагае пэўнага самаўдасканаленьня.

Апошняя парада – час ад часу мяняць паролі. У гэтым выпадку, у прынцыпе, можна карыстацца праграмамі – стваральнікамі пароляў.

## Рэкамэндаваныя праграмныя сродкі для шыфраваньня

Ня трэба спадзявацца на магчымасьць проста «запароліць» файлы (альбо ўключэньне кампутара) стандартнымі сродкамі – варта выкарыстоўваць спэцыяльныя крыптаграфічныя (шыфравальныя) праграмы. Няхай вас не бянтэжыць магчымае хуткае ўвядзеньне ў Беларусі адміністрацыйнай адказнасьці за парушэньне правілаў абароны інфармацыі – яна, хутчэй за ўсё, ня будзе датычыцца абароны асабістай прыватнай інфармацыі і рэальна ня будзе дзейнічаць.

Такім чынам, мы пачынаем ствараць на нашым кампутары зашыфраваны дыск.

## Сродкі карыстаньня ВШД

Калі вы працуеце ў Windows XP/2000, найлепшым варыянтам – на час падрыхтоўкі нашага тэксту – зьяўляецца **TrueCrypt** – бясплатная праграма з добрай рэпутацыяй. Для старэйшых вэрсіяў Windows можна парэкамэндаваць **PGPdisk** – вэрсія 6.2 бясплатная для некамэрцыйнага карыстаньня. Гэта не апошняя вэрсія – пазьнейшыя небясплатныя, – але яна працуе і робіць усё, што неабходна. **PGP**-праграмы вельмі папулярныя, яны лічацца дастаткова надзейнымі і, што важна, «непрыкметнымі» – зашыфраванымі з дапамогаю **PGP** могуць быць ня толькі пляны палітычнай дзейнасьці, але і проста прыватная інфармацыя, якую карыстальнік палічыў патрэбным прыхаваць ад староньняга вока. У Беларусі гэтымі праграмамі шыфраваньня карыстаюцца сотні людзей – ня толькі ўдзельнікі супраціву і палітычныя дзеячы, але і бізнэсоўцы, і праграмайстры, і проста людзі, якія ня хочуць, каб дзяржава совала свой мандат у непатрэбныя рэчы. Так што ў гэтым натоўпе даволі проста схавацца.

Калі вы карыстаецеся Unix-падобнымі сыстэмамі, стварэньне ВШД ня будзе праблемай, дапрыкладу, можаце выкарыстоўваць EncFS у Linux, а ў FreeBSD існуе зручны і надзейны **gbde**. Калі вы аднолькава часта карыстаецеся Windows і якім кольвек юніксам на адной машыне, для вас ёсьць сэнс зірнуць у бок **BestCrypt for Linux**, ды сачыце таксама за праектам **TrueCrypt** – ён будзе партаваны ў Linux бліжэйшым часам - зможаце карыстацца адным і тым жа сродкам у розных сыстэмах.

Для шыфроўкі асобных файлаў падыдуць **PGP** і **GPG**, даступныя для самых розных апэрацыйных сыстэмаў. Абедзьве праграмы маюць добрую рэпутацыю і пры гэтым сумяшчальныя міжсобку.

## Дзе ўзяць

Выладоўвайце TrueCrypt з сайту **truecrypt.sourceforge.net**, **PGP**, у тым ліку **PGPdisk** – з **pgpi.com**, а на **gpg.org** адпаведна атрымаеце **GPG**. Што датычыцца **BestCrypt**, то гэтая праграма даступная на сайце вытворцы: **jetico.fi**, зьвярніце, аднак, увагу, што вэрсія для Windows спыніць сваю працу праз 30 дзён (праграма ўмоўна бясплатная).

У любым выпадку, засьцерагайцеся набываць крыптаграфічныя сродкі на кампутаровых рынках – там вам могуць уперці дзіравую вэрсію, якая ня будзе надзейным сродкам шыфраваньня (кепска, што самі вы гэтага адразу не заўважыце).

## Рэзэрвовая копія

Калі ваш кампутар (ваш дыск, іншы носьбіт інфармацыі) будзе скрадзены альбо канфіскаваны, ліхадзеі альбо «праваахоўнікі» будуць мець вашыя файлы, калі вы ігнаравалі патрабаваньні бясьпекі, і ня будуць нічога мець, калі інфармацыя надзейна зашыфраваная. Аднак глянем на сытуацыю зь іншага боку – вы таксама ня будзеце мець вашых файлаў! Нечакана (а такія рэчы заўсёды адбываюцца нечакана) апынуцца без дакумэнтаў, архіваў, базаў зьвестак, перапіскі, сьпісу кантактаў, уласных плянаў і напрацовак – гэта амаль заўсёды азначае паралюш арганізацыі і страты, часьцяком незваротныя.

Каб спаць спакойна, трэба ня толькі пазбавіць ня вартых даверу людзей доступу да інфармацыі, але й забясьпечыць надзейны доступ для сябе ў экстраардынарных сытуацыях. Для гэтага абавязкова трэба рабіць **пэрыядычныя рэзэрвовыя копіі** ўсіх важных зьвестак (зразумела, таксама ў зашыфраваным варыянце) – напрыклад, раз на паўгоду рабіць рэзэрвовую копію ўсяго таго, што было напрацавана арганізацыяй.

**Важна! Сакрэтная інфармацыя запісваецца на рэзэрвовы носьбіт-копію толькі ў зашыфраваным выглядзе!** Калі вы карыстаецеся віртуальнымі шыфраванымі дыскамі – найпрасьцей капіяваць увесь файл, які ўтрымлівае дыск. Адсюль вынікае яшчэ адна парада – ствараючы ВШД, вызначайце яго памер ня большым за ёмістасьць носьбіта, на які вы звычайна робіце копію. Заўсёды правярайце, ці запісалася копія без памылак. Праграмы, што запісваюць CD і DVD, звычайна маюць опцыю «праверыць запіс» (анг. verify), – абавязкова ўключыце яе.

## Спосабы рабіць рэзэрвовыя копіі

Найпрасьцейшы варыянт зрабіць рэзэрвовую копію – запісаць файлы на **CD**. Для гэтага ваш кампутар мусіць быць аснаджаны CD-recorder'ам (гэтая прылада выглядае як звычайны CD-rom, але дазваляе ня толькі чытаць, але й запісваць дыскі). Запіс вядзецца на пустыя дыскі-»матрыцы» (званыя таксама «балванкамі»). Матрыцы бываюць двух тыпаў: CD-R, які запісваецца аднойчы і назаўсёды, і CD-RW, які можна перазапісваць некалькі разоў. Стандартная ёмістасьць – 700 Mb. Запіс звычайна не падобны да простага капіяваньня файлаў, бо неабходна адмысловая праграма для запісу. Карыстальнікі Windows XP ды Unix-падобных сыстэмаў маюць такія магчымасьці, іншым можна ўсталяваць Nero Burning Rom.

Калі інфармацыі надта многа, спатрэбіцца многа «балванак» і шмат часу, каб іх запісваць. У такім разе найлепшым варыянтам можа стаць запіс на матрыцы **DVD**, ёмістасьць якіх значна большая. Вам спатрэбіцца DVD-recorder. Улічыце, што далёка не на кожным кампутары можна чытаць DVD – CD-ROM'ы ўсё-ткі сустракаюцца часьцей.

Запіс на модулі **флэш-памяці** («флэшкі») цяпер робіцца папулярным сродкам захоўваньня і транспартаваньня каштоўнай інфармацыі. Плюсам гэтага мэтаду зьяўляецца тое, што «флэшка» часьцяком не выглядае як носьбіт інфармацыі – звычайна гэтыя модулі выглядаюць як бралок, запальніца, падвесак, кулон ці кароткі флямастэр. Модулі флэш-памяці ўстаўляюцца ў порт (разьём) USB (чытаецца Ю-Эс-Бі). Для Windows 98/95 спатрэбяцца праграмы-драйвэры, зазвычай яны даступныя ў Інтэрнэце, бальшыня астатніх сыстэмаў адчыняе іх аўтаматычна. Запіс адбываецца простым капіяваньнем файлаў. Многія любяць «флэшкі» за малы памер і зручнасьць выкарыстаньня. Аднак, на наш погляд, «флэшкі» хутчэй падыходзяць для транспартаваньня канфідэнцыйнай інфармацыі – але гэта кепскі варыянт, калі вядзецца пра рэзэрвовае капіяваньне, паколькі яны недастаткова надзейныя і зьмяшчаюць адносна няшмат інфармацыі (найбольш пашыраныя варыянты 128, 256 і 512Mb). Флэш-модулі часам прадугледжваюць доступ з паролем, але, як і ў выпадку паролю да кампутара альбо незашыфраванага файлу, не спадзявайцеся на яго: мэтафарычна кажучы, гэта ня сэйф, а драўляная шуфлядка. З «флэшкамі» гэтаксама трэба быць пільнымі і асьцярожна выкарыстоўваць іх у якасьці адзінага (асноўнага) носьбіту інфармацыі – менавіта дзеля сваёй кампактнасьці і непрыкметнасьці яны могуць лёгка згубіцца ці іх могуць скрасьці.

Яшчэ адзін падобны сродак захоўваньня рэзэрвовых копіяў – **мр3-плэеры, смартфоны і іншыя побытавыя прылады зь вялікім аб’ёмам памяці.** Яны выкарыстоўваюцца як флэшкі, але ў пэўных сытуацыях выклікаюць менш падазрэньняў.

Параўнальная табліца ўласьцівасьцяў рэзэрвовых носьбітаў інфармацыі

| **Носьбіт** | **Надзейнасьць** | **Тэрмін прыдатнасьці** | **Зручнасьць** | **Ёмістасьць** |
|---|---|---|---|---|
| CD | Адносна высокая | Залежыць ад маркі матрыцы і частаты выкарыстаньня. Аднойчы запісаны дыск можа праляжаць “бяз руху” ня менш за 3 гады. Інтэнсіўнае чытаньне істотна зьмяншае гэты тэрмін | Вымагае пэўнай падрыхтоўчай працы і выкарыстаньня адмысловага праграмнага забесьпячэньня | 700 Mb |
| DVD | Гл. папярэдні п. | Гл. папярэдні п. | Гл. папярэдні п. | Залежыць ад фармату, часьцей 4,7 Gb |
| Флэш-модуль | Нізкая | Моцна залежыць ад маркі, але ў кожным разе вельмі няпэўны. Часам псуецца праз тыдзень, часам працуе колькі год. | Зручна. Бачны ў сыстэме як дыск альбо каталёг. Адпаведна можна рабіць усе стандартныя апэрацыі – чытаць, пісаць, зьмяняць – звычнымі сродкамі. Непрыкметны для неабазнанага вока. | Найчасьцей сустракаюцца мадэлі 128 Mb, 256 Mb, 512 Mb |
| Вонкавы дыск | Адносна высокая. Але такія прылады часьцяком адчувальныя да ўдараў і вымагаюць асьцярожнасьці | Пры акуратным карыстаньні можна разьлічваць прынамсі гадоў на 5. | Зручна. Таксама як і ў папярэднім п. | Разнастайныя, але ж ня менш за колькі гігабайт |

Запіс на **вонкавыя дыскі** таксама зьяўляецца добрым варыянтам для вырабу рэзэрвовых копіяў. Працаваць зь імі зручна, а аб’ём запісанай інфармацыі – вялікі. Вонкавы дыск – па-сутнасьці звычайны «цьвёрды» дыск, накшталт таго, што знаходзіцца ўнутры вашага кампутара, але вынесены ў асобны корпус. Ён падключаецца да кампутара кабэлем праз порт USB альбо COM-порт.

У якасьці рэзэрвовай копіі (нагадаем – для зашыфраванай інфармацыі) можна выкарыстоўваць **бясплатны хостынг і паштовыя скрыні** ў Інтэрнэце. Падобную паслугу робіць *gmail.com* (памер – 2 гігабайта) і шмат іншых рэсурсаў (некаторыя зь іх дазваляюць карыстацца аўтаматычным шыфраваньнем пры перадачы дадзеных з вашага кампутара – паводле аналёгіі з кіраваньнем банкаўскім рахункам праз Інтэрнэт). Гэты від захоўваньня цяпер набывае папулярнасьць ува ўсім сьвеце, паколькі зь любога месца можна дабрацца да сваёй інфармацыі і нават можна выкарыстоўваць яе як хард-дыск для вашага ноўтбука ці іншага гасьцявога кампутара. Аднак пакуль у Беларусі гэты сродак не распаўсюджаны з прычыны невялікай хуткасьці сувязі.

## Захаваньне рэзэрвовых копіяў

Няма нічога дурнейшага, як зрабіць рэзэрвовую копію і пакінуць яе каля кампутара – у гэтым папросту няма ніякага сэнсу, менты альбо рабаўнікі ў выпадку форс-мажору атрымаюць і асноўную, і рэзэрвовую копію. Выснова: копіі трэба перахоўваць у іншым памяшканьні. Ці можна папросту забраць іх дахаты? У прынцыпе, мы ня ведаем – пакуль – выпадкаў, калі б вобшукі ці крадзяжы праводзіліся адначасова ў офісах і прыватным жытле актывістаў. Аднак такое можа адбыцца заўтра – гэта ўваходзіць у лемантар «праваахоўнай» дзейнасьці спэслужбаў. Ня варта захоўваць рэзэрвовую копію ў офісе іншай няўрадавай арганізацыі ў вашым горадзе – выпадкі правядзеньня некалькіх аднačасовых вобшукаў у офісах некалькіх арганізацыяў ужо былі зафіксаваныя. З тых жа прычынаў ня варта захоўваць рэзэрвовыя копіі ў офісах арганізацыяў, якія ўваходзяць у адну сетку. Найлепшы варыянт – аддаць іх надзейнаму чалавеку, які не працуе ў вашым офісе стала, альбо захаваць іх у надзейнага сябра. Можаце рабіць некалькі копіяў аднačасова і захоўваць іх у розных месцах – гэта павялічвае абсяг працы, але імавернасьць поўнага зьнікненьня інфармацыі ў такім разе блізкая да нулю.

Каб вырашыць, ці трэба вам гэта, уявіце сябе ў сытуацыі, калі вашая інфармацыя зьнікла, – наколькі гэта страшна менавіта для вас?

## Як карыстацца электроннай поштай?

Інфармацыю зручна перасылаць праз электронную пошту, аднак вашыя лісты лёгка могуць быць перахопленыя. Для таго каб захоўваць бясьпеку, вам трэба карыстацца **PGP** альбо **GPG** – абедзьве праграмы ўзаемазамяняльныя, аднак для карыстальнікаў Windows лепш падыдзе першая. Абменьвайцеся з вашымі карэспандэнтамі ключамі, шыфруйце файлы, якія перасылаеце, і пачувайце сябе бясьпечна – ніхто вашую перапіску напэўна не прачытае. Але пры гэтым захоўваецца небясьпека, што «ворагі» будуць ведаць, паміж якімі з «падазроных» паштовых скрыняў ідзе актыўная перапіска з выкарыстаньнем **PGP** альбо **GPG**, – часам гэта зьяўляецца непажаданым (напрыклад калі вы перапісваецеся зь нейкім вядомым замежным карэспандэнтам). У мэтах прадухіленьня гэткай небясьпекі варта завесьці для асабліва канфідэнцыйнай перапіскі адмысловыя паштовыя скрыні. Калі вам трэба пераслаць асабліва канфідэнцыйную інфармацыю – вядома, зашыфраваную, – варта стварыць выключна дзеля гэтага выпадку спэцыяльную паштовую скрыню, якой вы скарыстаецеся толькі адзін раз з калектыўнага» выхаду ў Інтэрнэт (напрыклад, з інтэрнэт-кавярні).

Таксама пры карыстаньні электроннай поштай варта карыстацца самымі простымі правіламі асьцярожнасьці – націскаць «выхад» («sign out» альбо «log out») перад тым, як зачыніць старонку з поштай, выкарыстоўваць найбольш бясьпечныя зь існых на вашым сэрвэры варыянтаў падлучэньня (напрыклад, для карыстальнікаў паштовага сэрвісу Yahoo! прапануецца два віды падлучэньня – стандартны і бясьпечны (secure) – мэтазгодна карыстацца апошнім), пэрыядычна мяняць паролі, не карыстацца простымі паролямі, не паведамляць пароль праз тэлефон і не казаць іншым людзям. Натуральна, вельмі небясьпечна карыстацца паштовымі сэрвісамі, што даступныя для беларускіх спэцслужбаў, напрыклад tut.by, а таксама ня варта перасылаць на тутбаеўскія скрыні канфідэнцыйную інфармацыю. Існуюць таксама паштовыя сэрвэры, якія маюць убудаваную сыстэму шыфраваньня, адзін з найбольш вядомых – hushmail.com. Не было б нічога дзіўнага, калі б высьветлілася, што за гэтымі сэрвэрамі стаяць спэцслужбы ЗША ці Брытаніі, аднак для нас гэта вялікай ролі ня грае: абы не гэб'ё.

У працы з электроннай поштай існуе некалькі простых і надзвычай важных правілаў: ніколі не карыстайцеся праграмамі Outlook альбо Outlook Express ад фірмы Microsoft; ніколі не адчыняйце дадаткаў (attachments) няяснага альбо (нібыта) забаўляльнага прызначэньня, у тым ліку мульцікаў, праграмаў ды архіваў, пароль да якіх прапануецца ў целе ліста.

## Пытаньні выкарыстаньня PGP

*Чаму неабходна карыстацца **PGP**?* З тых самых прычын, зь якіх вы заклейваеце ліст у капэрту альбо не дазваляеце чытаць цераз вашае плячо. Стандартныя сродкі электроннай пошты не забясьпечваюць аніякай канфідэнцыйнасьці вашаму ліставаньню. Перад тым як дайсьці да адрасата, вашае паведамленьне пройдзе праз некалькі кампутараў менавіта ў тым выглядзе, у якім вы яго стварылі, – г. зн. адкрыты тэкст і даступныя дадаткі (attachments). На кожным этапе паведамленьне можа быць прачытанае. Ясна, што ў варунках дыктатуры гэта набывае асаблівае значэньне, бо ўладныя структуры ад КДБ і да чыноўнікаў сярэдняга гатунку могуць лёгка і часта карыстацца гэтай магчымасьцю. Дадайце да гэтага, што адміністратарамі тых кампутараў і сетак, праз якія вы адсылаеце, пошту могуць быць людзі занадта цікаўныя і недастаткова сумленныя і, магчыма, яны чуйныя да «настойлівых просьбаў» з боку гэбэшнікаў .

*Ці існуюць іншыя падобныя праграмы?* Так, існуюць. Але **PGP** – найбольш аўтарытэтны і найшырэй распаўсюджаны прадукт на гэтым рынку. Ён разьлічаны на карыстальніка сярэдняй кваліфікацыі, вымагае некаторага навучаньня, але працаваць зь ім прасьцей, чым зь якім-кольвек Word'ам. Дазваляе шыфраваць кавалкі тэксту і файлы любых фарматаў. Мае бясплатную вэрсію. На цяперашні час **PGP** – сусьветны стандарт для офіснай бясьпекі.

*Наколькі надзейны **PGP**? «У сьвеце ёсьць два гатункі крыптаграфіі: адзін ня дасьць тваёй малодшай сястры чытаць твае файлы, другі ня дасьць моцным урадам чытаць твае файлы»* (Bruce Schneier, Applied Cryptography). Апошні варыянт называецца моцнай крыптаграфіяй. PGP належыць да клясы моцных крыптаграфічных праграм. Калі вы карыстаецеся PGP у адпаведнасьці з рэкамэндацыямі распрацоўніка, вашае паведамленьне наўрад ці будзе расшыфраванае. Беручы ў якасьці прыкладу здольнасьці сучасных кампутараў, для расшыфроўкі правільна зашыфраванага паведамленьня аднаму мільяр-

ду кампутараў спатрэбіцца больш часу, чым праіснуе Сонечная сыстэма. Уражвае?

Зразумела, кампутарная тэхніка ўвесь час прагрэсуе і празь нейкі час можа адбыцца тэхналягічны прарыў, які зробіць расшыфроўку больш магчымай. Але, арыентуючыся нават на самыя сьмелыя прагнозы, у вас у запасе дзесяцігодзьдзі. Хто стане працаваць так доўга дзеля вашай перапіскі? Часьцяком можна пачуць: «Я прачытаў у Інтэрнэце, што КДБ умее расшыфроўваць PGP» ці штосьці гэткага ж фармату. Фокус у тым, што спэцслужбы зацікаўленыя ў дыскрэдытацыі PGP ды іншых крыптасыстэм менавіта таму, што яны ня могуць яе адужаць! Адсюль падобныя выкіды дэзінфармацыі. Спэцслужбы таталітарных рэжымаў схільныя да парушэньня законаў, але законы матэматыкі – хрэн парушыш!

Ці ня можа так быць, што распрацавальнікі праграмы зрабілі схаваную «дзірку» ў кодзе праграмы і робяць падвойны бізнэс, прадаючы людзям крыптасыстэму, а ўрадам – магчымасьць яе ўзламаць? Зь іншай праграмай гэта магчыма, але распрацавальнікі PGP прытрымліваюцца палітыкі «адкрытага коду». Гэта значыць, што кожны, хто пажадае, можа атрымаць праграму ў «сырым» выглядзе і прааналізаваць яе. Тысячы незалежных праграмістаў ужо зрабілі гэта, і тысячы робяць гэта цяпер. Гэта ня толькі гарантуе адсутнасьць злых сюрпрызаў, але і дазваляе вылоўліваць магчымыя памылкі.

**Важная заўвага:** для таго каб пададзенае тут было праўдай, вашая **PGP** павінна быць *вартай даверу*, скачанай з www.pgpi.com.

## Як працаваць з PGP?

### Стварэньне пары ключоў

Стварэньне новай пары ключоў адбываецца ў двух выпадках: калі вы ўпершыню ўсталёўваеце PGP – тады праграма сама прапануе пачаць працэс стварэньня – альбо вам проста спатрэбілася згенэраваць новую пару. У апошнім варыянце вам трэба ў мэню *Keys* выбраць *New key*.

1. Увядзіце сваё імя ў поле *Full name* і паштовы адрас (электроннай пошты, зразумела) – у поле *Email address*. Гэтыя зьвесткі будзе бачыць той чалавек, якому вы дасьцё свой адкрыты ключ. Вы можаце, калі вам захочацца, пазначыць тут мянушку альбо псэўданім ды й адрас фальшывы... Толькі калі гэта заблытае вашых карэспандэнтаў – ня скардзіцеся.

2. У акенца *Passphrase* уводзьце фразу-пароль. Так, так, ня слова, а

фразу! Паводле таго, як вы ўводзіце пароль, сыстэма ацэньвае яго якасьць у полі *Passphrase quality.* Па змаўчаньні ЗПЗ не паказвае тое, што вы набіраеце, – раптам хтосьці падглядае? Але калі ніхто не падглядае, можаце зьняць гачок з опцыі *Hide typing* – набіраць стане прасьцей.

У акенца *Confirm* трэба зноўку ўвесьці пароль. Гэта можа падацца дзіўным, але ўвод паролю – надзвычай адказны момант і падвойная праверка дазволіць зьменшыць імавернасьць абдрукоўкі.

3. Праграма генэруе пару ключоў: сакрэтны і адкрыты. Проста чакайце, працэс можа заняць некалькі хвілінаў.

## Захоўваньне і чытаньне ключоў

Запусьціце PGPKeys. Выберыце ваш ключ, ідзіце ў мэню *Keys,* націсьніце каманду *Export.* Вам прапануецца выбраць месца ды назву файлу, у якім будзе захаваны ключ. Працэдура такая ж, як пры захаваньні дакумэнту Word. Ёсьць важная акалічнасьць – опцыя *Include private key(s).* Па змаўчаньні яна выключаная – і гэта значыць, што будзе захаваны толькі адкрыты ключ. Вы можаце разаслаць яго сваім рэцыпіентам. Калі вы паставіце гачок для гэтай опцыі, будзе захаваная пара ключоў (і сакрэтны, і адкрыты). Дасылаць пару ключоў, вядома, нікому нельга. Пару захоўваюць толькі каб зрабіць копію (напрыклад, каб перанесьці на новы кампутар альбо проста захаваць копію ў надзейным месцы).

Для чытаньня ключоў выканайце каманду *Import* у мэню *Keys* ды знайдзіце файл, што ўтрымлівае ключ(ы). Праграма пакажа, якія ключы захоўваюцца ў гэтым файле, – іх можа быць некалькі. Выберыце патрэбныя і націсьніце *Import.*

## Спраўджваем адбіткі

У акне PGPKeys выберыце патрэбны ключ, клясьніце правую кнопку мышкі, выберыце пункт *Key properties* – убачыце сьпіс словаў у рамцы з загалоўкам *Fingerprint* – гэта і ёсьць адбітак. Перапішыце яго, каб спраўдзіць у тэлефоннай размове альбо падчас асабістай сустрэчы.

## Шыфруем файл

1. У любой праграме Windows, якая прадугледжвае працу з файламі, вылучаем адзін ці некалькі файлаў і кляцаем правай кнопкай мышкі. Зьявіцца мэню з шэрагам пунктаў, сярод іх выбераце PGP – адкрыецца

падмэню. Каманда *Encrypt* шыфруе файлы, *Encrypt & Sign* – шыфруе і падпісвае. Выберыце неабходны вам варыянт.

2. Адчыніцца акно: уверсе – сьпіс адкрытых ключоў, якія ўсталяваныя ў вашым кампутары, ніжэй – пустое поле. У яго вам трэба перацягнуць мышкай ключы тых людзей, для якіх вы шыфруеце вашыя файлы (вашых рэцыпіентаў). Вы можаце шыфраваць і для сябе, для гэтага перацягніце свой ключ.

Кожны з тых, чые ключы будуць перанесеныя ў поле *Recipients,* зможа расшыфраваць файлы сваім сакрэтным ключом незалежна ад іншых рэцыпіентаў.

З паказаных унізе опцыяў мы прапануем вашай увазе толькі адну – *Wipe original.* Калі яна выключаная, у выніку шыфраваньня будуць створаныя шыфраваныя вэрсіі выбраных файлаў, але арыгіналы застануцца некранутымі. Уключыўшы ж яе, вы загадаеце праграме зьнішчыць арыгіналы (застануцца толькі зашыфраваныя вэрсіі). Зьнішчэньне адбудзецца такім чынам, што ўзнавіць файлы ня ўдасца.

3. Калі вы выбралі каманду *Encrypt & Sign,* вам будзе прапанавана выбраць ключ, якім вы хочаце падпісаць файлы, ды ўвесьці пароль.

## Шыфруем кавалак тэксту

Тыповая задача: вы напісалі ліст і вырашылі адправіць яго ў зашыфраваным выглядзе. Вылучаем тэкст, капіюем яго ў «кішэнь» сыстэмы.

Кляцаем правай кнопкай мышкі на памянёным ужо замочку каля гадзіньніка. Выбіраем каманду *Clipboard,* потым – *Encrypt* альбо *Encrypt & Sign,* калі вы хочаце яшчэ і падпісаць тэкст.

Далей праца такая ж, як падчас шыфраваньня файлаў. Па завяршэньні ў сыстэмнай «кішэні» будзе знаходзіцца зашыфраваны кавалак. Устаўце яго ў патрэбную праграму (напрыклад у паштавік).

## Расшыфроўка файлаў

У бальшыні выпадкаў дастаткова двойчы кляцнуць мышкай па зашыфраваным файле. Праграма запытае пароль і расшыфруе.

## Расшыфроўка тэксту

Скапіюйце зашыфраваны тэкст ад радка з пазнакай «BEGIN PGP MESSAGE» да радка «END PGP MESSAGE» улучна. Праз замочак выклічце мэню *Clipboard,* потым – *Decrypt & Verify.*

Расшыфраваная інфармацыя ў «кішэні».

## Даведнік тэрміналёгіі PGP

**Ключ** *(key)* – гэта зьвесткі, неабходныя для зашыфроўкі ці расшыфроўкі інфармацыі. Захоўваюцца ў файлах.

**Памер ключа** *(key size)* – памер таго пакету зьвестак, які зьяўляецца ключом. Чым большая даўжыня ключа, тым больш часу і высілкаў неабходна зламысьніку, каб яго падабраць. Вымяраецца ў бітах.

**Адкрыты** (ці публічны) **ключ** *(public key)* – ключ, якім можна толькі зашыфроўваць інфармацыю. Вы павінны распаўсюдзіць гэты ключ сярод тых, хто будзе пісаць вам шыфраваныя лісты.

**Сакрэтны** (ці прыватны ключ) **ключ** *(private key)* – ім можна расшыфроўваць інфармацыю, зашыфраваную адкрытым ключом. Сакрэтны ключ – толькі для вас, ахоўвацe яго ад пабочных асобаў. На выпадак, калі яго ўсё-ткі скрадуць, сыстэма PGP прадугледжвае пароль, ня ведаючы якога, сакрэтным ключом не скарыстаешся.

**Адбітак ключа** *(key fingerprint)* – даволі доўгі набор ангельскіх словаў, унікальны для кожнага ключа. Рэч у тым, што адкрыты ключ, які вам даслаў ваш сябра, неабавязкова дайшоў. Яго можна падмяніць, каб потым чытаць вашую карэспандэнцыю. Таму ключы трэба зьвяраць праз тэлефон ці на асабістай сустрэчы, параўноўваючы іх адбіткі. Калі ўсе словы супадаюць –значыцца, ключ той; калі не супадаюць – ключ падмянілі.

**Пара ключоў** *(key pair)* – у PGP ключы ствараюцца толькі парамі: сакрэтны + адкрыты. Вы лёгка зразумееце чаму – калі ўважліва прачыталі, чым адрозьніваюцца сакрэтны й адкрыты ключы.

**Рэцыпіент** *(recipient)* – кажучы папросту, тая асоба, для якой вы шыфруеце інфармацыю, атрымальнік, адрасат. Каб зашыфраваць штосьці для пэўнага рэцыпіента, вы мусіце мець ягоны адкрыты ключ. Перачытайце пункт «Адкрыты ключ», калі не разумееце чаму.

**Ліставаньне** – у кантэксьце PGP – абмен шыфраванымі паведамленьнямі ці файламі. Каб ліставаньне паміж вамі і іншым чалавекам было магчымае, вы мусіце абмяняцца сваімі адкрытымі ключамі (гл. папярэдні пункт).

**Подпіс** *(digital signature)* – грае тую ж ролю, што і звычайны рукапісны подпіс: засьведчвае тэкст і любы іншы тып зьвестак, што дазваляе ў далейшым спраўдзіць ці высьветліць паходжаньне інфармацыі.

Подпіс у PGP робіцца сакрэтным ключом, наколькі дзіўна гэта б ні гучала для непадрыхтаванага вуха. Электронны подпіс можа спадарожнічаць шыфроўцы (інфармацыя, зашыфраваная адкрытым клю-

чом рэцыпіента і падпісаная вашым сакрэтным ключом) альбо проста засьведчваць незашыфраваныя зьвесткі. Можа захоўвацца ў асобным файле альбо ў адным з падпісанай інфармацыяй.

PGPTools, PGPKeys – часткі праграмы PGP. Любую зь іх можна запусьціць праз мэню *Пуск (Start)* альбо кляцнуўшы правай кнопкай мышкі на замочак, які PGP, па ўсталяваньні, разьмяшчае каля гадзіньніка, у правым ніжнім куце экрану.

## Лякальная кампутаровая сетка і праца ў Інтэрнэце, вірусы і траяны

Падключэньне да Інтэрнэту вашага кампутара дае ворагам неблагія шанцы для выкраданьня інфармацыі. Па-першае, у вас можа быць незаўважна ўсталяваная праграма-шпег, закінутая вам у выглядзе вірусу ці траяну і, ледзь толькі вы ўвойдзеце ў Сусьветнае павуціньне, яна пачне перасылаць інфармацыю з вашага дыска зламысьнікам. Па-другое, сама апэрацыйная сыстэма можа мець «дзіркі» і памылкі, якія даюць магчымасьць нягоднікам кіраваць вашым кампутарам праз Інтэрнэт (асабліва гэтым «славіцца» Windows, якая найбольш распаўсюджаная ў нашай краіне).

Такім чынам, карыстаньне Інтэрнэтам дапушчальнае толькі ў тым выпадку, калі вы ўсталюеце сабе праграму-фаервол (анг. firewall) ды антывірус. Фаервол – гэта праграмны сродак, які блякуе недазволеныя сеткавыя апэрацыі, перашкаджаючы шкодным праграмам высылаць штосьці ў Інтэрнэт і зачыняючы доступ да вашага кампутара звонку (з Інтэрнэту). Для карыстальнікаў Windows можна парэкамэндаваць Norton Internet Security, які да таго ж можна ўсталяваць у пары з Norton Antivirus. Людзі ж, якія працуюць з Unix-падобнымі апэрацыйнымі сыстэмамі, збольшага ўратаваныя ад праблемаў зь вірусамі, а фаервол маюць адпачатку (магчыма, яго трэба ўключыць). У Windows XP таксама ёсьць убудаваны фаервол (брандмаўэр), аднак многія людзі не давяраюць ягонай надзейнасьці.

Трэба зазначыць, што абарончае праграмнае забесьпячэньне вымагае настройкі, і вам неабходна будзе паглыбіцца ў вывучэньне суправаджальнай дакумэнтацыі альбо скарыстаць з паслугаў чалавека, якому вы *давяраеце*.

У выпадку зь лякальнай сеткай лічыцца больш надзейным на той кампутар, які непасрэдна падлучаны да Інтэрнэту, ускласьці абавязкі **выключна** фаерволу і шлюза (разьмеркавальніка Інтэрнэту для

іншых кампутараў сеткі) і не працаваць на ім з канфідэнцыйнай інфармацыяй.

Калі ў вашай лякальнай сетцы працуюць людзі, якія не ўваходзяць у *кола даверу*, пажадана не адкрываць сеткавы доступ да тых дыскаў і каталёгаў, што зьмяшчаюць сакрэтную інфармацыю, альбо прынамсі абараняць іх паролем.

Павінна існаваць пісьмова афармленая палітыка бясьпекі ў дачыненьні да кампутараў і сеткі. Усталяваньнем і настройкай праграмаў павінен займацца толькі адзін адказны чалавек – адміністратар сеткі. Ён абавязаны прытрымліваецца праактыўнага падыходу да патэнцыйных праблемаў: павышаць сваю кваліфікацыю, чытаць электронныя бюлетэні, прысьвечаныя праблемам бясьпекі, рэгулярна абнаўляць апэрацыйную сыстэму, антывірус ды іншыя абарончыя праграмы. Трэба рэгулярна ставіць «заплаткі» на праблемныя месцы ў апэрацыйнай сыстэме і праграмах, што працуюць з Інтэрнэтам.

Прагляднік Internet Explorer, усталяваны па змаўчаньні на кожным кампутары з Windows, мае вельмі дрэнную рэпутацыю: цягам доўгага часу ў ім знаходзілі ўсё новыя і новыя дзіркі, якія даюць ліхадзеям магчымасьці для пранікненьня ў ваш кампутар. Пазьбягайце гэтай праграмы! Усталюйце лепш Mozilla Suite ці Mozilla Firefox, што даступныя бясплатна.

## Якія існуюць небясьпекі ў захоўваньні кампутаровай інфармацыі?

Небясьпекі ў захоўваньні і перадачы інфармацыі абумоўленыя працоўнымі сытуацыямі. Бясьпека вашай інфармацыі залежыць ад вашага абсталяваньня, вашага праграмнага забесьпячэньня, апэрацыйнай сыстэмы, вашых паводзінаў і парадку ў вашым офісе.

Энэргазахаваньне – таксама праблема бясьпекі. Бальшыня сучасных кампутараў аснаджаныя сыстэмай энэргазахаваньня, якая выключае часткі абсталяваньня, калі пэўны час ніхто не працуе з кампутарам. Пры гэтым зьмесьціва памяці можа быць скінутае на дыск – а ў памяці могуць знаходзіцца дакумэнты, зь якімі вы працуеце. Зламысьнік можа прасканаваць ваш дыск у пошуку «адбітку памяці», і ёсьць імавернасьць, што яму пашанцуе. Адключыце энэргазахаваньне ў настройках вашай сыстэмы! Зьвярніце ўвагу на тое, што для ноўтбукаў адключэньне можа быць немагчымым альбо можа прывесьці да хуткай разрадкі акумулятараў.

Апэрацыйная сыстэма пэрыядычна скідае кавалкі памяці на дыск у г. зв. «файл падкачкі», каб вызваліць месца для пэўных патрэбаў. Адпаведна ўзьнікае тая ж небясьпека, што і ў папярэднім пункце, аднак, на шчасьце, у меншым маштабе. Адключыць гэтую функцыю, не рызыкуючы стабільнасьцю сыстэмы, немагчыма. У некаторых выпадках можна аўтаматычна шыфраваць файл падкачкі. Карыстальнікі Unix-падобных сыстэмаў маюць такую магчымасьць у самой сыстэме, для Windows XP можна выкарыстаць BestCrypt v.7, аднак гэтая праграма каштуе грошай. Для Windows 98/95 праблема невырашальная.

Ноўтбук – фактар рызыкі. Апроч апісанай вышэй праблемы з энэргазахаваньнем, пераносныя кампутары лягчэй скрасьці, у стомленым стане вы можаце і проста пакінуць яго недзе. Дадамо, што ноўтбук можа быць сканфіскаваны падчас дагляду аўтамабіля ці асабістых рэчаў альбо падчас праезду праз мяжу. Не захоўвайце ў сваім «мабільным офісе» вялікіх масіваў канфідэнцыйнай інфармацыі, захоўвайце толькі тыя рэчы, зь якімі вы зьбіраецеся працаваць бліжэйшым часам. Зразумела, усё павінна быць зашыфраванае.

*Небясьпекі выдаленых файлаў.* Проста выдаліць файл – менш за паўсправы. Сыстэма проста пазначае «месца, занятае гэтым файлам, лічыць свабодным», але нічога не вынішчае. Адмысловымі сродкамі можна аднавіць файл альбо яго часткі і прачытаць. Замест таго каб выдаляць (анг. delete), файлы трэба вынішчаць (анг. wipe)! Для гэтага выкарыстоўваюцца праграмныя сродкі, прадугледжаныя, напрыклад, у **PGP** (націскаеце правай кнопкай мышкі на файл, выбіраеце **PGP**, выбіраеце wipe – і ваш файл выдаляецца надзейна).

*Парадак доступу да кампутараў.* Чужы чалавек за кампутарам – катастрафічна небясьпечна! Ён можа занесьці вірус альбо выпадкова прачытаць важную інфармацыю, ён можа аказацца аматарам парнаграфіі (і файлы, якія ён пакіне па сябе, скампрамэтуюць вас). І гэта толькі ў тым выпадку, калі ён не зламысьнік. Калі ж ён мае на мэце шпіёўства – ён можа ўнятрыць у ваш кампутар праграмы, якія перахопяць вашыя паролі і зьвядуць на нуль усю вашую бясьпеку. Дасьведчаны чалавек можа гэта зрабіць нават калі за ім назіраюць.

Неабходна распрацаваць (пажадана ў пісьмовым выглядзе) парадак доступу да кампутараў. Калі для вас неабходна пускаць іншых людзей папрацаваць на вашыя кампутары, вылучыце адну-дзьве машыны, на якіх будзе адбывацца праца з закрытымі дакумэнтамі, і абмяжуйце да іх доступ.

Асаблівую асьцярожнасьць трэба мець з выкарыстаньнем дыскетаў, звычайна на іх «забываецца» інфармацыя, якая ў працэсе працы была прынесеная ў офіс звонку. Пажадана, каб у офісе не валяліся ўжываныя дыскеты «пра запас».

Узломнікі сыстэмаў карыстаюцца ня толькі тэхнічнымі сродкамі, але і актыўным сацыяльным інжынэрынгам. Вельмі проста – патэлефанаваць і ад чужога імя спытаць нібыта забыты пароль. Часта спрацоўвае. Чытайце біяграфію Кевіна Мітніка, самага «раскручанага» ўзломніка сыстэмаў.

Гіпэртрафія ветлівасьці – крыніца правалаў. Сярэдні беларус, як той японец, ня ўмее казаць цьвёрдага «не». Прыходзіць, дапрыкладу, у арганізацыю невядомы з чыстым позіркам і, гледзячы проста ў вочы, задае нясьціплыя пытаньні, альбо просіць «на хвілінку» пусьціць да кампутара, альбо імпэтна прапануе свае паслугі ў якасьці добраахвотніка. Выглядае прыстойна, імкнецца гаварыць па-беларуску, на свае паводзіны мае тлумачэньні. Ай, як жа адмовіць, няветліва ж! Проста дзіва бярэ, як часта гэты – просты ў прынцыпе – фокус спрацоўвае і людзі сваімі рукамі здаюць канфідэнцыйную інфармацыю.

Іншы варыянт – нахабства. Вы чытаеце важную паперыну ці зьбіраецеся ўвесьці пароль на сваім кампутары, а гэтым часам цераз вашае плячо, не хаваючыся, пачынае пазіраць іншы чалавек. У такой сытуацыі многія людзі няздольныя даць адпор нахабніку і ў выніку «паляць» інфармацыю.

Пераадолець злачынную ветлівасьць дапаможа невялікая доза бюракратыі. Распрацоўвайце правілы, што можна, а чаго нельга. Каму можна сядаць за гэты кампутар, а каму – за гэны. Доступ да дакумэнтаў трэба даваць толькі тым людзям, якія зь імі працуюць. Вызначце, які стаж павінен напрацаваць у вашай арганізацыі чалавек, якія тэсты прайсьці, каб атрымаць свой статус у вашым офісе. Усе правілы павінны быць разьмешчаныя на бачным месцы, каб у іх можна было тыркнуць пальцам. Нават калі некаторыя рэчы падаюцца відавочнымі – усё адно надрукуйце іх ды павесьце на сьцяну. Проста гэта вельмі важны **псыхалягічны момант:** сказаць камусьці «нельга!» прасьцей, спаслаўшыся на правілы ці загад кіраўніцтва, чым адмовіць «ад сябе». Многія людзі ўвогуле ня ўмеюць адмаўляць, але кожны можа сказаць: «пачытайце правілы, вунь там, на сьцяне» – адмовіўшы такім ускосным чынам.

## Як захоўваць папяровыя дакумэнты

Папера – праблема бясьпекі. Звычайна ў офісах няўрадавых арганізацыяў, дзе ёсьць шмат супрацоўнікаў, зьбіраецца шмат дзелавых папераў, якія калісь былі вельмі важныя, а пасьля страцілі сваю актуальнасьць і сталі нікому не патрэбныя – пра іх папросту забыліся. Але для спэцслужбаў і «сэксотаў» яны могуць уяўляць вялікую цікавасьць. Раздрукаваныя паперы з сакрэтнай інфармацыяй (альбо нават і зь несакрэтнай, простай працоўнай інфармацыяй) уяўляюць сабой небясьпеку, якой ня так проста пазбыцца, – героі клясычнай літаратуры палілі дакумэнты ў агні, аднак у наш час такі варыянт малаверагодны, дый паперы стала замнога. Не выкідайце важныя дакумэнты ў сьметніцу, «органы» могуць наняць пару бамжоў, якія будуць перабіраць сьметны бак, адбіраючы, апроч пустых пляшак, вашыя паперы. Вынішчайце дакумэнты, у тым ліку і чарнавікі. Просты варыянт – парваць на дробныя кавалкі і высыпаць іх часткамі ў розныя сьметніцы па дарозе дахаты (але і ў гэтым варыянце ня трэба недаацэньваць руплівасьць і апантанасьць некаторых шпегаў-фанатыкаў). Больш зручны і надзейны варыянт – «шрэдэр», здрабняльнік паперы. Гэты апарат наразае паперу на танюткія палосачкі і блытае іх. Аднавіць дакумэнт пасьля гэтага немагчыма.

Адным з небясьпечных момантаў у працы з дакумэнтамі зьяўляецца транспартаваньне дакумэнтаў. Зыходзячы з практыкі, менавіта падчас перамяшчэньня дакумэнтаў і важных папераў гэтыя матэрыялы могуць патрапіць у рукі спэцслужбаў.

Таму перасоўваньне дакумэнтаў у прасторы варта зьвесьці да мінімуму. Замест таго каб паўсюль насіць з сабою важныя дакумэнты, перасоўваючы іх з аднаго "бясьпечнага" месца ў іншае, "яшчэ больш бясьпечнае", і назад, варта вызначыць сталае месца захоўваньня альбо працы з гэтым дакумэнтам. Тут таксама можна кіравацца прынцыпам дэцэнтралізацыі - можна вызначыць некалькі надзейных месцаў захоўваньня для розных дакумэнтаў. Паверце, што ахранцы будзе цяжэй вызначыць, якая з трыццаці кватэр, якія вы наведалі за тыдзень, будзе вашым "архівам", чым лавіць вас пастаянна на выхадзе з "палёнай" штаб-кватэры вашай арганізацыі (само памяшканьне штаб-кватэры лепей увогуле пазбавіць будзь-якіх сакрэтных дакумэнтаў).

Ня варта насіць з сабой тыя паперы, якія непатрэбныя вам для дзейнасьці ў дадзены пэрыяд часу. Таксама ня варта захапляцца запаўнень-

нем нататнікаў важнай інфармацыяй - нататнік у выпадку затрыманьня можа згуляць супраць вас і нават стаць важным рэчавым доказам у крымінальнай справе (падчас аднаго з гучных судовых працэсаў у Беларусі ў якасьці асноўнага доказу супрацьпраўнай дзейнасьці абвінавачанага фігуравала ажно 13 нататнікаў з падрабязнымі зьвесткамі). Сканфіскаваны нататнік можа выкрыць вашыя кантакты. Таму паводле магчымасьці інфармацыю ў нататніках варта зьмяшчаць у кадаваным альбо незразумелым для чужога вока выглядзе (самаменш, можна рабіць запісы беларускай лацінкай). Пры запаўненьні нататніка (а таксама пры складаньні іншых дакумэнтаў) было б някепска ўявіць, што гэтыя дакумэнты патрапілі ў рукі спэцслужбаў і тыя іх аналізуюць, - зыходзячы з гэтага можна выправіць тыя моманты, якія зьяўляюцца найбольш небясьпечнымі. Нататнікі варта мяняць як мага часьцей, пазбаўляючыся ад састарэлых кантактаў і іншай інфармацыі, скарыстаныя нататнікі лепей зьнішчаць, а калі гэта немагчыма - здаваць на часовае захоўваньне ў канспіратыўны "архіў". У прынцыпе, надзейней усю інфармацыю, якая захоўваецца стала, пераводзіць у лічбавую кадаваную форму.

На дакумэнтах, якія могуць стаць падставай для абвінавачаньня ў зьдзяйсьненьні крымінальнага злачынства (напр. паклёп альбо зьнявага прэзыдэнта, заклікі з мэтай зьвяржэньня канстытуцыйнага ладу ды інш.) варта рабіць прыпіскі, якія б дэзавуявалі сэнс дакумэнту. Напрыклад, на плянах і праграмах можна ставіць надпісы: «Матэрыялы для дэтэктыўнага апавяданьня», «Праграма аб'яднаньня "Млада Фронта", Славаччына, 1929 г.» і г. д. Пад крытычнымі матэрыяламі на адрас прэзыдэнта і дзяржаўнай улады можна ставіць прыпіску: «…але ўсё гэта зьяўляецца няпраўдай і ня мае нічога агульнага з рэчаіснасьцю».

Прынамсі, варта распрацаваць простыя правілы працы з дакумэнтамі для вашай арганізацыі:

- раздрукоўваюцца толькі тыя канфідэнцыйныя дакумэнты, якія раздрукаваць неабходна;
- кожны дакумэнт мусіць мець гаспадара – асобу, якая адказная за яго выраб, працу зь ім і яго зьнішчэньне;
- непатрэбныя дакумэнты зьнішчаюцца ўва ўстаноўленым бясьпечным парадку (гэта датычыцца як канфідэнцыйных дакумэнтаў, так і бягучых дакумэнтаў і чарнавікоў);
- прызначаецца адказны за бясьпеку працы з паперамі.

## Як вырабляць, захоўваць і распаўсюджваць друкаваныя матэрыялы

Пры працы з друкаванымі матэрыяламі трэба часава і тэрытарыяльна разьдзяляць фазы выврабу, захоўваньня і распаўсюду. Гэта значыць, што надрукаваны ў друкарні матэрыял не павінен адразу дастаўляцца на штаб-кватэру альбо на кватэру распаўсюднікаў. Пажадана мець кватэру-склад (лецішча, гараж, падсобка), дзе гэтыя матэрыялы будуць захоўвацца ў гуртоўным стане да перадачы на распаўсюд у раздроб. Адначасова на штаб-кватэры павінна быць такая колькасьць друкаваных адзінак, якую не шкада згубіць у выпадку нападу.

Асобы, не заангажаваныя ў выраб друкаванай прадукцыі, не павінны ведаць, дзе знаходзіцца падпольная друкарня. Асобы, якія не займаюцца захоўваньнем друкаванай прадукцыі, не павінны ведаць, дзе знаходзіцца склад улётак. Кожны мусіць ведаць свой участак працы і безь неабходнасьці не цікавіцца, што адбываецца за яго межамі.

Важным і асабліва небясьпечным пытаньнем зьяўляецца транспартаваньне друкаванай прадукцыі – гэтай працай павінны займацца альбо адмысловыя людзі, якія нічым больш не займаюцца, альбо надзейныя, але «незасьвечаныя асобы». На скрайні выпадак транспартаваньнем займаюцца самі актывісты. Пазьбягайце выкарыстаньня таксовак. Калі няма іншага выйсьця – ускладніце маршрут, мяняйце машыны, кожная новая таксоўка мусіць быць зь іншай фірмы ці таксапарку, але й нават пры такіх засьцярогах – гэта толькі разавы рэцэпт. Многія кіроўцы таксуюць у адных і тых жа месцах і хутка запомняць незвычайнага пасажыра. Міліцыя і спэцслужбоўцы часта «прачэсваюць» гэтую прафэсійную праслойку, пры гэтым яны могуць выставіць вас у ролі, напрыклад, забойцы ці ліхадзея, так што кожны таксоўца палічыць за абавязак вас «здаць».

Абсалютна недапушчальна транспартаваць незапакаваную ў непразрыстую абгортку прадукцыю – наклад мусіць быць надзейна запакаваны, каб не выклікаць залішніх зачэпак у чужога незацікаўленага вока. У друкарнях часта ставяць на пакункі пазнакі, нярэдка пішуць назвы кніжак. Папрасіце, каб яны не пісалі нічога апроч лічбаў ці ўмоўных знакаў альбо «кодавую назву» (кшталту «Как перестать беспокоиться и начать жить»).

Адкрытыя тэлефонныя размовы пра друкаваную прадукцыю павінны быць выключаныя, а кадаваныя размовы павінны быць зьведзеныя да мінімуму. У выпадку выкарыстаньня кодаў код трэба рэгулярна мя-

няць. Безь неабходнасьці ня трэба камунікаваць з падпольнай друкарняй: уладам ня так важна перахапіць канкрэтны наклад улётак, яны хутчэй хочуць увогуле спыніць непадцэнзурны друк на гэтай тэрыторыі. У ідэальным становішчы, рэдакцыя і падпольная друкарня ўвогуле не павінны камунікаваць паміж сабой – мусіць быць адмысловы сувязны, які перадае інфармацыю паміж імі. Таксама ня варта занадта часта камунікаваць праз тэлефон паміж рэзэрвовымі сховішчамі і іншымі элемэнтамі сыстэмы распаўсюду.

Самае горшае, што можна зрабіць, – наладзіць масавую выдачу ўсяго накладу матэрыялаў распаўсюднікам наўпрост на штаб-кватэры: для мянтоў самае зручнае – зрабіць засаду перад дзьвярамі офісу і перахопліваць распаўсюднікаў. З гэтай жа прычыны распаўсюд трэба пачынаць з тых раёнаў, што знаходзяцца ў далечыні ад штаб-кватэры.

Распаўсюднікі друкаваных матэрыялаў павінны мець пры сабе пасьведчаньні асобы, найлепей пашпарт, ня варта мець пры сабе зброю. Распаўсюднікі павінны працаваць «у полі» групай (2–5 чалавек) і мець «базу» – г. зн. чалавека, які носіць з сабой вялікую партыю накладу, трымаецца ўбаку ад распаўсюднікаў. Распаўсюднікі павінны мець пры сабе толькі мінімальную партыю (у выпадку з пэрыядычнымі выданьнямі – 200–300 асобнікаў), дастатковую для паўгадзіны-гадзіны працы. Калі ў распаўсюднікаў заканчваюцца матэрыялы, яны падыходзяць да «базы» і атрымліваюць новы пачак. Практыка паказвае, што пры дысцыплінаванай працы такі фармат дазваляе зьвесьці да мінімуму колькасьць матэрыялаў, якія трапляюць у лапы мянтам: патрулі, пабачыўшы распаўсюдніка, звычайна адразу імкнуцца схапіць яго. Гэтае правіла датычыцца распаўсюду друкаваных матэрыялаў на вуліцах, у транспарце і шляхам раскідкі па паштовых скрынях.

Калі распаўсюдніка затрымалі і даставілі ў пастарунак, ён не павінен панікаваць і павінен прытрымлівацца загадзя ўзгодненай інструкцыі аб паводзінах падчас затрыманьня. Перад пачаткам працы яму трэба давесьці, што за распаўсюд друкаваных выданьняў прадугледжаны адносна невялікі штраф. Зразумела, ня варта казаць, адкуль узяліся гэтыя друкаваныя матэрыялы (Хто даў? Колькі было атрымана і колькі пасьпеў распаўсюдзіць? Ці сам вырабляў або нехта даручыў? Якая арганізацыя займаецца вырабам і распаўсюдам?). Трэба памятаць, што распаўсюднік увогуле можа **адмовіцца ад будзь-якіх тлумачэньняў**, хоць гэта і патрабуе пэўнай псыхалягічнай загартоўкі. Таму распаўсюднікі павінны ведаць шэраг шаблонных «адмазак»: «Знайшоў на лаў-

цы ў сквэры, вырашыў параздаваць сябрам і мінакам», «Знайшоў на сьметніцы каля выканкаму» і г. д.

Важнае правіла: пасьля затрыманьня нельга адразу ісьці на «базу» альбо штаб-кватэру: існуе небясьпека прывесьці за сабой хваста.

Асобна адзначым вялікую папулярнасьць і досыць высокую эфэктыўнасьць гэтак званага **дэцэнтралізаванага** вырабу і распаўсюду друкаваных матэрыялаў. Гэта значыць, напрыклад, што актывістам па ўсёй краіне рассылаюцца праз электронную пошту (альбо зьмяшчаюцца на пэўным сайце ў Інтэрнэце) узоры матэрыялаў, актывісты іх памнажаюць саматужным спосабам (падпольныя друкарні і рызографы тут неабавязковыя, дастаткова хатняй друкаркі альбо партатыўнага ксэракса ў невялічкай арганізацыі) у колькасьці, якая ім неабходная для распаўсюджаньня ўласнымі сіламі. Дзякуючы гэткай тэхналёгіі можна распаўсюдзіць хутка і па ўсёй краіне досыць вялікі наклад. Пры гэтым ня маецца адзінага «цэнтру» вырабу, захоўваньня і распаўсюду, а таксама адсутнічае рызыка, што «тавар» перахопяць пры транспартаваньні.

Пры вырабе і транспартаваньні забароненых кніжак раім выкарыстоўваць дзедаўскую мэтодыку: вокладка кніжкі не павінна выклікаць аніякіх пытаньняў у «праваахоўнікаў» (кшталту «Самосовершенствование – дорога к успеху»), а пад ёй хаваецца недазволены зьмест (як вы бачыце ў *гэтым* выданьні). Пазьней «цнатлівую вокладку» можна зьняць.

Пры макетаваньні друкаванай прадукцыі трэба ўлічваць, што беларускае заканадаўства патрабуе разьмяшчэньня на друкаваных вырабах выхадных зьвестак і штрыхавога коду па форме ISBN (штрыхавы код у абавязковым парадку разьмяшчаецца на кнігах і брашурах на чацьвертым баку вокладкі). Для пэрыядычных выданьняў выхаднымі зьвесткамі лічацца назва выданьня, заснавальнік (заснавальнікі), імя і прозьвішча рэдактара (галоўнага рэдактара альбо ягонага намесьніка), парадкавы нумар выпуску і дата яго выхаду, кошт альбо паметка «Бескаштоўна» ці «Вольны кошт», наклад, поўныя адрасы рэдакцыі і друкарні, рэгістрацыйны нумар. Па магчымасьці гэтыя зьвесткі павінны разьмяшчацца на пэрыядычным выданьні (нават на тым, якое выдаецца з пазначаным накладам да 300 асобнікаў і не падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі). Натуральна, пазначаны наклад усіх незарэгістраваных пэрыядычных выданьняў не павінен перавышаць 300 асобнікаў (гэта значыць, максімум – 299 асобнікаў). Для нелегальных пэры-

ядычных выданьняў, гэтаксама як і для падпольных кніг і улётак, мае сэнс пазначаць прыдуманыя каардынаты рэдакцыі і друкарні. Цяпер у Беларусі пашыраная практыка, калі выдавец прыдумвае нейкую друкарню з галавы ў нейкім экзатычным расейскім альбо ўкраінскім горадзе ці проста піша «Надрукавана ў Эўропе». Напэўна, тут можна проста цалкам перапісаць каардынаты друкарні зь нейкай расейскай кніжкі.

## Як весьці размовы праз тэлефон

Падазрэньне, што спэцслужбы праслухоўваюць усіх, – адно з пашыраных грамадзкіх перакананьняў. Шмат хто лічыць гэта забабонам, спасылаючыся на вялізныя рэсурсы, якіх вымагае гэткая дзейнасьць. На самай справе ў гэтай тэзе шмат што адпавядае рэчаіснасьці, і маштабы праслухоўваньня сапраўды вялікія. Выкрытыя пасьля «памаранчавай рэвалюцыі» ўва Ўкраіне памеры праслухоўваньня тэлефонаў палітычных і грамадзкіх актывістаў паказваюць, што спэцслужбы не шкадуюць рэсурсаў на гэтую дзейнасьць – слухаюць усіх, чыя дзейнасьць іх цікавіць.

Калі вы карыстаецеся мабільным тэлефонам, то акрамя тэхнічных характэрыстыкаў мадэлі вам нельга забывацца пра чатыры іншыя якасьці гэтага прыстасаваньня: магчымасьць перадачы спэцслужбам інфармацыі пра месца знаходжаньня абанэнта; магчымасьць фіксацыі выходных і ўваходных тэлефанаваньняў; магчымасьць праслухоўваньня і запісу размоваў, а таксама SMS'ак; дыстанцыйнае ўключэньне мікрафона для праслухоўваньня нават пры выключаным апараце (апошняе не праверана, але і не абвергнута). У прынцыпе, гэтыя небясьпекі пашыраюцца на ўсе мадэлі тэлефонаў.

Адзінае галоўнае правіла, якім трэба кіравацца, – **тэлефон не прызначаны для размоваў**. Гэта парадокс павінны быць прынцыпам нелегальнай дзейнасьці.

Калі вам трэба высьветліць нейкае пытаньне, то выкарыстоўвайце **тэлефон не для размовы, а для таго, каб дамовіцца пра час і месца размовы**, таксама ў кадаваным выглядзе. Асабліва гэта правіла датычыцца мабільных тэлефонаў вядомых грамадзкіх актывістаў (некаторыя зь іх кіруюцца правілам «Ну і няхай слухаюць» – і такім чынам даюць спэцслужбам карысную інфармацыю, якая можа быць скарыстаная пазьней ня толькі супраць іх саміх, але і супраць іх карэспандэнтаў). Лепей дамаўляцца кадаванымі словамі альбо словамі, зразуме-

лымі толькі вам, кшталту «Варыянт С», «Там жа, дзе і пазаўчора», «На прыпынку», «Ля школы», «Пад гадзіньнікам». Замест таго каб казаць: «У кавярні “Вавёрачка” – лепей выкарыстаць код альбо сказаць: «У кавярні на Партызанскім» ці «Ну, памятаеш, на Мотавела…» Асабліва пільнымі ў гэтым сэнсе трэба быць падчас маштабных акцыяў, важных сустрэчаў і перамоваў, выбарчых і іншых палітычных кампаніяў. SMS-паведамленьні такія ж небясьпечныя, імі таксама трэба абменьвацца асьцярожна, з выкарыстаньнем коду. Сачыце, каб у памяці вашага мабільніка не было лішніх SMS’ак (на выпадак адабраньня мабільніка). Памятайце, што спэцслужбы часта зважаюць на колькасьць званкоў з аднаго тэлефона на іншы: напрыклад, калі «пад каўпаком» знаходзіцца апазыцыйны дзяяч, то аўтаматычна зьвяртаецца ўвага на тыя нумары, на якія ён часьцей за ўсё тэлефануе (з хатняга і мабільнага тэлефона). Напрыклад, калі дзяяч, які знаходзіцца ў прыярытэтным сьпісе праслухоўваньня, патэлефанаваў чалавеку першы раз у жыцьці (нават памыліўся нумарам), то гэты абанэнт аўтаматычна на трапляе ў калектыўную памяць органаў і ўжо ня будзе забыты.

Падчас канфідэнцыйных і важных размоваў мабільны тэлефон трэба адключаць і вымаць батарэю (найлепей зрабіць гэта загадзя, ня ў тым месцы, дзе адбываюцца перамовы). Заўжды добра, калі вы ня возьмеце з сабою тэлефона, калі пойдзеце на сустрэчу: памятайце, што праз мабільны тэлефон нескладана вылічыць вашае месца знаходжаньня (дакладнасьць можа быць высокай: ажно да нумару дому). Пакіньце мабільнік у офісе ці дома (адключаным альбо ўключаным) – і ідзіце на сустрэчу. Калі вам асабліва каштоўная канфідэнцыйнасьць – па-магчымасьці рэгіструйце мабільныя тэлефоны на іншых, незасьвечаных асобаў (а таксама можна карыстацца карткамі замежных апэратараў з роўмінгам). Але ўлічвайце, што ў мабільных сетках рэгіструецца ня толькі SIM-картка, але й тэлефонны апарат,– таму для новых і замежных SIM-картак лепей выкарыстоўваць новыя апараты. Практычная заўвага: калі батарэі вашага тэлефона звычайна хапала на пяць дзён размоваў, а раптам яна стала разраджацца за дзень – верагодна, што ў вашым тэлефоне працуе «жучок», хаця, магчыма, проста прыйшоў час замяніць акумулятар.

Лепей не праводзіць сакрэтныя размовы ў пакоі, дзе ёсьць стацыянарны тэлефон (ён можа выкарыстоўвацца як сталае прыстасаваньне праслухоўваньня).

Адзначым, што існуе некалькі сродкаў абароны ад праслухоўваньня

тэлефонных размоваў. У прынцыпе, усе яны вымагаюць прыцягненьня спэцыяліста, аднак некаторыя даступныя ў продажы і могуць быць скарыстаныя і «чайнікамі».

Самым простым варыянтам зьяўляецца набыцьцё **скрэмблера** – прылады для кадаваньня размовы, якая кадуе сыгналы перад іх перадачай. Плюсам зьяўляецца тое, што скрэмблер дазваляе мець дастаткова высокую ступень шыфраваньня размовы – ён можа абараніць ад любога зь відаў праслухоўваньня і стацыянарнага тэлефона, і мабільніка (пры гэтым, натуральна, трэба папярэдне рабіць праверку ўсяго памяшканьня: вас могуць слухаць і пры дапамозе «жучка»). Мінус – абодва абанэнты павінны мець сумяшчальныя скрэмблеры, – так што гэтую схему рацыянальна выкарыстоўваць для тых абанэнтаў, якія пастаянна вядуць паміж сабой канфідэнцыйныя размовы. Гэтая тэхналёгія шырока прадстаўленая на рынку, а ваганьне коштаў – ад 500 да некалькіх тысячаў даляраў – залежыць ад надзейнасьці выкарыстаных для шыфраваньня альгарытмаў.

Апошнім часам вялікую папулярнасьць набылі гэтак званыя **крыптафоны** Па-сутнасьці, гэта мадэлі тэлефонаў з убудаваным скрэмблерам вялікай магутнасьці. Заўважым, што адным з сцэнароў выкарыстаньня крыптафона яго вынаходнікі называюць «выкарыстаньне праваабарончымі няўрадавымі арганізацыямі». Аднак, на бягучы час гэта хутчэй тэарэтычны варыянт для нас, бо такая апаратура задорага каштуе (вядзецца пра тысячы эўра). Зрэшты, калі для вас гэта не праблема вось спасылка: www.cryptophone.de.

Больш цікавым падаецца выкарыстаньне IP-тэлефаніі з шыфраваньнем. Памянёная ай-пі-тэлефанія – гэта, кажучы проста, размовы (менавіта голасам) праз Інтэрнэт. Гаворыш у мікрафон далучаны да свайго кампутара, суразмоўца чуе сказанае з дынамікаў свайго кампутара. Розьніцы паміж гукам, карцінкай ці дакумэнтам для электроннай тэхнікі няма – усё гэта можа быць пераведзенае ў лічбавую форму і дасланае праз сусьветнае Сеціва. І, канечне ж, можа быць зашыфраванае. Добравядомы ў гэтай галіне сродак – **PGPFon**.

Існуюць прылады, прызначаныя для зьнішчэньня альбо выяўленьня «жучкоў» у памяшканьнях, аўтамабілях, на тэлефонных ды электрадратах. Яны, на жаль, каштуюць немалых грошай і вымагаюць досьведу, якога ў вас хутчэй за ўсё няма. Апроч таго, у гэтай сфэры ўсё імкліва разьвіваецца, так што, калі ў вас няма свайго (вартага даверу) адмыслоўцы, то лепш проста не абгаворвайце сакрэтных справаў у «па-

паленых» памяшканьнях. Ня трэба ствараць сталых месцаў для перамоваў, улічвайце, што кавярні і рэстарацыі – зручныя для праслухоўваньня месцы, у якіх (хаця б і выпадкова) могуць аказацца варожыя вушы.

## Пераезд празь мяжу

Лепей устрымацца ад перавозу празь мяжу канфідэнцыйных, сакрэтных і проста важных дакумэнтаў, а таксама буйных сумаў наяўных грошаў. Калі гэтага нельга пазьбегнуць, то дакумэнты варта правозіць у выглядзе зашыфраванай электроннай вэрсіі (гл. заўвагі пра рэзэрвовыя копіі). Майце на ўвазе, што мытнікі маюць тэхнічныя магчымасьці для прагляду электронных носьбітаў. Тэарэтычна, яны могуць не прапусьціць яўна зашыфраваную інфармацыю. Абавязкова трэба карыстацца крыптаграфіяй (шыфраваньнем), а найлепей, каб не выклікаць залішніх падазрэньняў, – стэганаграфіяй (гл. вышэй).

Можна адзначыць, што ў мабільнікі, аснаджаныя такімі функцыямі, як інфрачырвоны порт альбо bluetooth, у прынцыпе, можна запісаць ня толькі мэлёдыю альбо застаўку, але й любы файл (прынамсі, для многіх мадэляў). Памер файлу абмежаваны свабоднай памяцьцю тэлефона, але можа аказацца дастатковым для некаторых дакумэнтаў (зразумела ж, у зашыфраваным выглядзе). Загадзя прадумайце, як вы будзеце «даставаць» файл з свайго сотавага сябра, для гэтага: 1) у тэлефоне мусіць быць функцыя «выслаць праз інфрачырвоны порт (альбо bluetooth)»; 2) спатрэбіцца кампутар, здольны прымаць файлы праз той жа порт (сучасныя ноўтбукі звычайна гэта могуць). Надзейнасьць такога спосабу яшчэ вымагае ацэнкі. У прынцыпе, амаль у любы мабільны тэлефон можна закачаць пэўную колькасьць інфармацыі з дапамогай камунікацыйнага кабелю. А яшчэ зручней для перавозу інфармацыі празь мяжу карыстацца mp3-плэерамі і лічбавымі фотаапаратамі, якія абсалютна легальна могуць утрымліваць некалькі соцень мегабайтаў альбо нават гігабайтаў інфармацыі і не выклікаюць залішніх падазрэньняў. Для староньняга вока гэта проста плэер (яго і слухаць трэба, а ня толькі інфармацыю празь мяжу вазіць) альбо звычайны фотаапарта (колькі іх перасякае мяжу за дзень!).

Беларускае заканадаўства дазваляе ўвозіць у краіну без дэклараваньня суму, эквівалентную 3000 даляраў ЗША, але калі сума большая, то яна падлягае абавязковаму дэклараваньню. Паходжаньне грошай

пазначаць ня трэба. Трэба, аднак, ведаць, што зьвесткі пра дэкляраваньне потым трапляюць у падатковую інспэкцыю і розныя праваярыючыя органы, таму пазьней тыя могуць пачаць расьсьледаваньне – што гэта за грошы, ці сплачаныя зь іх падаткі? Але пры перасячэньні мяжы ніякіх дакумэнтаў ня трэба. Што тычыцца расейска-беларускай мяжы, дык праз яе дазволена правозіць любую колькасьць валюты без аніякага дэкляраваньня. Аднак на іншых межах недэкляраваныя грошы, па-першае, канфіскуюць, па-другое, могуць нават распачаць крымінальную справу аб кантрабандзе.

Пры дэкляраваньні грошай ні ў якім разе нельга пазначаць, што яны вязуцца для мэтаў няўрадавай арганізацыі (бяз розьніцы, зарэгістраванай альбо незарэгістраванай) альбо дзеля мэтаў гуманітарнае дапамогі.

Не забывайцеся, што ў Беларусі існуе некалькі ступеняў кантролю за перасоўваньнем грамадзянаў праз мяжу. Існуе сьпіс асобаў, перасоўваньне якіх праз мяжу адсочваецца, а ў дачыненьні да некаторых асобаў стала выкарыстоўваецца асабісты дагляд (асобы, якія перасякаюць мяжу разам з гэтымі людзьмі, таксама трапляюць у кантрольны сьпіс). Таму без асаблівай неабходнасьці ня варта афішаваць на мяжы сваю датычнасьць да вядомых дзеячоў, да якіх скіраваная пільная ўвага памежнікаў і мытнікаў.

На мяжы мытнікі маюць права правесьці ня толькі дагляд рэчаў, але і асабісты дагляд, і дагляд транспартнага сродку. У выпадку калі ў транспартным сродку будзе знойдзеная будзь-якая кантрабанда, нават калі гэта цыгарэты ці піва, транспартны сродак можа быць сканфіскаваны. Асабісты дагляд можа выкарыстоўвацца толькі на асабісты загад начальніка мытнага паста. Асабісты дагляд патрабуе складаньня пратаколу дагляду і павінны адбывацца ў спэцыяльна прыстасаваным памяшканьні ў прысутнасьці панятых таго ж полу, што і вы. Калі вы ня маеце пры сабе анічога крамольнага і вам прапануюць прайсьці асабісты дагляд – не лянуйцеся, патрабуйце выкананьня ўсіх фармальнасьцяў працэдуры, гэтым вы можаце дапамагчы іншым людзям.

# 2. ВЫКЛІКІ І СЬЛЕДЗТВА

## Афіцыйныя і неафіцыйныя выклікі

Адзіны афіцыйны спосаб выклікаць грамадзяніна кудысьці – гэта ўручыць чалавеку **асабіста пад подпіс** позву, у якой павінна быць пазначана, хто і ў якой якасьці выклікаецца, да каго, у які час і па якім адрасе трэба зьявіцца, а таксама растлумачаныя наступствы няяўкі без паважных прычынаў. Выклік на допыт у якасьці сьведкі асобы, што не дасягнула 16 гадоў, праводзіцца праз яго бацькоў ці іншых законных прадстаўнікоў. Калі дадзеная асоба выклікаецца ў якасьці абвінавачанага і падазронага, выклік праводзіцца ў агульным парадку. Позвай чалавека можна выклікаць у міліцыю, пракуратуру, суд, Камітэт дзяржаўнай бясьпекі, падатковую інспэкцыю і іншыя органы.

Але трэба памятаць, што позвы вельмі рэдка ўручаюцца сапраўды асабіста і пад подпіс. У тым выпадку калі позву вам кінулі ў паштовую скрыню – яна цалкам верагодна можа зьнікнуць, і на гэта можна спасылацца, калі вы не гатовыя йсьці па выкліку альбо проста ня хочаце йсьці. Таксама і тую позву, якая была перададзеная праз сваякоў, можна праігнараваць, спаслаўшыся на тое, што сваяк «забыўся» перадаць вам гэтую важную паперу. Пры выкліках праз тэлефон відавочна адсутнічае ўпэўненасьць, што з вамі размаўляе менавіта тая службовая асоба – а можа быць, гэта звычайныя тэлефонныя хуліганы? Такім зацягваньнем справы можна выйграць час, каб падрыхтавацца да «сустрэчы», атрымаць кансультацыю праваабронцаў, узгадніць свае сьведчаньні з таварышамі.

Зразумела, калі позва перададзеная праз адміністрацыю па месцы працы альбо вучобы, праігнараваць яе цяжэй, – вырашайце самі…

Як бы там ні было, наступствам няяўкі па позьве можа быць толькі гэтак званы **«прывод»**. «Прывод» азначае, што за вамі прыйдзе міліцыянт і адвядзе (адвязе) да службовай асобы, якой спатрэбілася з вамі паразмаўляць. Гэтага баяцца ня трэба – аніякіх нэгатыўных наступстваў «прывод» ня цягне. Выкладзенае справядліва нават для позваў у суд, акрамя тых выпадкаў, калі яны ўручаюцца асабіста пад подпіс – у апошнім выпадку судзьдзя можа расцаніць няяўку як праяву непавагі да суду (адказнасьць – штраф альбо арышт на тэрмін да 15 начаў).

Аднак выкладзенае не датычыцца падазронага і абвінавачанага па крымінальнай справе – ён адназначна абавязаны зьяўляцца па выклі-

ках органу, што вядзе крымінальную справу, дзеля дачы сьведчаньняў (але пры гэтым мае права адмовіцца ад сьведчаньняў). У адваротным выпадку ў дачыненьні да падазронага альбо абвінавачанага можа быць ужытая мера стрыманьня ў выглядзе ўзяцьця пад варту, хатняга арышту, падпіскі пра нявыезд.

Усе выклікі на «размовы», зробленыя без уручэньня позвы, можна ігнараваць як «неафіцыйныя». Таксама мэтазгодна паведамляць пра іх як мага шырэйшаму колу знаёмых ды журналістам.

## Што рабіць, калі прыносяць позву дахаты?

1. Не панікаваць – нічога страшнага не адбываецца.
2. А хіба вы дома? Дзьверы можа адчыніць ваш брат, сястра, іншы сваяк, і паабяцаць абавязкова перадаць позву адрасату. Таксама яны маюць права адмовіцца атрымліваць для вас позву і адмовіцца расьпісвацца за яе, спаслаўшыся на немагчымасьць перадаць яе вам.
3. Магчыма, варта ўзяць позву і расьпісацца ў атрыманьні… чужым подпісам? Пасьля можна адмаўляць, што вы сапраўды атрымалі гэтую позву.
4. Зразумела, можна папросту ўзяць позву, расьпісацца, а ўжо потым вырашаць, ці трэба зьяўляцца па гэтым выкліку.

## Што рабіць, калі прыйшла позва?

Трэба стварыць сабе запас часу.

1. Вырашыць, ці можна праігнараваць гэтую позву.
2. Патэлефанаваць службовай асобе, што вас выклікае, і дамовіцца на візыт у іншы дзень, спасылаючыся на любыя паважныя абставіны – ад’езд у іншы горад, напрыклад, альбо камандыроўку. Калі не атрымліваецца перанесьці сустрэчу – трэба праз тэлефон высьветліць усе абставіны справы, ваш статус.
3. Паспрабаваць узяць пацьверджаньне хваробы.

Стварыўшы такім чынам запас часу, трэба неадкладна зьвязацца з таварышамі альбо выйсьці на праваабарончыя арганізацыі – можа, хто чаго ведае, падскажа. Магчыма, да гэтага сьледчага ўжо выклікалі людзей з вашага кола – можна прыблізна вылічыць, з чым зьвязаная гэткая асаблівая ўвага да вашай пэрсоны. У любым выпадку варта пракансультавацца ў знаёмага юрыста, адваката альбо ў праваабаронцаў. Натуральна, позва можа зьяўляцца сьведчаньнем таго, што міліцыя альбо спэцслужбы вырашылі шчыльна заняцца вашай справай – таму,

калі вы займаецеся нелегальнай дзейнасьцю, вам трэба прыхаваць усе яе сьляды (сьпісы сяброў арганізацыі, дакумэнты, пляны) і на нейкі час прыпыніць гэткую дзейнасьць. Такім чынам, атрыманьне позвы можа быць карыснай перасьцярогай.

Памятайце, у сувязі з атрыманай позвай у вас заўжды застаецца варыянт проста яе праігнараваць. За няяўку найвялікшым наступствам можа быць толькі «прывод» (калі вы не абвінавачаны ці падазроны).

Непаўналетняму трэба ісьці на сустрэчу зь сьледчым толькі з бацькамі. Калі вы сапраўды ня маеце магчымасьці прыйсьці на допыт з паважанай прычыны – абавязкова паведамце пра гэта таму, хто вас выклікаў.

## Што рабіць, калі выклікаюць на «размову»?

У першую чаргу трэба высьветліць, хто і ў якую ўстанову вас выклікае. На «размову» (не на допыт – на «размову»!) сьледчы выклікаць ня мае права (пракурор такое права мае). Такі выклік з боку сьледчага можна і трэба ігнараваць. Да пракурора ісьці трэба, але нават калі вы да яго ня пойдзеце, вам анічога не пагражае, акрамя «прыводу». Але тое, што вы зьявіліся да пракурора, не абавязвае вас даваць тлумачэньні супраць сябе. Вы можаце зьявіцца па выкліку пракурора (альбо нават калі вас прывядуць да яго), але размаўляць зь ім неабавязкова, вы заўжды можаце спаслацца на прэзумпцыю невінаватасьці, адмовіцца адказваць на ягоныя пытаньні і не даваць тлумачэньняў. Спасылка на прэзумпцыю невінаватасьці выглядае наступным чынам: «У адпаведнасьці з артыкулам 27 Канстытуцыі, я адмаўляюся адказваць на гэтае пытаньне».

Больш за тое, удзельнік «размовы» – ня сьведка, і таму ён не нясе адказнасьці нават за дачу наўмысна ілжывых сьведчаньняў. Зразумела, у такім фармаце можна і бессаромна хлусіць, але лепей за ўсё – не казаць зусім анічога, папросту маўчаць, спаслаўшыся на прэзумпцыю невінаватасьці.

Бывае, што падчас размовы чыноўнік (сьледчы, пракурор) вядзе запіс вашых словаў і пасьля прапануе падпісаць сьведчаньні. Ад гэтага можна адмовіцца, паколькі працэдурна гэтае дзеяньне не зьяўляецца допытам.

І таксама лепей за ўсё адмовіцца ад дачы г. зв. «пісьмовых тлумачэньняў» у міліцыі, у начальства на вытворчасьці альбо па месцы вучобы. Гэтыя дакумэнты толькі дапамогуць пасьля абвінаваціць вас. Любыя

законныя сьледчыя дзеяньні павінны афармляцца пратаколамі, і толькі ў іх трэба рабіць свае заўвагі альбо рабіць адзнаку на прыкладаньне пісьмовых тлумачэньняў.

Выклік на «размову» зьяўляецца сыгналам, што ў «праваахоўнікаў» паўстала цікавасьць да вашай сьціплай асобы. Варта вызваліць вашае жытло ад усіх забароненых, кампраматных рэчаў і ад нелегальнай літаратуры.

Пракуратура мае права выносіць афіцыйныя папярэджаньні пра недапушчальнасьць проціпраўных дзеяньняў – гэтае паўнамоцтва часта выкарыстоўваецца ў дачыненьні да палітычных актывістаў. Рэальна гэтае папярэджаньне ня ёсьць нейкай істотнай санкцыяй – гэта сапраўды папярэджаньне, папярэджаньне пра тое, што вам варта быць больш асьцярожнымі ў вашай дзейнасьці.

Таксама ў выпадку «размовы» трэба ўжо псыхалягічна падрыхтавацца да таго, што ў канцы «размовы» (таксама як і ў канцы допыту) вам можа быць прад'яўленае абвінавачаньне і вас могуць узяць пад варту. Абавязкова папярэдзьце таварышаў, куды вы ідзяце.

## Што рабіць, калі выклікаюць праз тэлефон?

З выклікаміі праз тэлефон можна паводзіць сябе як з звычайнымі тэлефоннымі хуліганамі – можна проста кінуць слухаўку і адключыць тэлефон, адмовіцца размаўляць з «тэлефонным» хуліганам. Заўжды можна сказаць: «Канчай жартаваць, ніякая ты не пракуратура, я цябе пазнаў...»

Але пасьля гэтага варта чакаць позвы альбо нават візыту міліцыянтаў. Таму на выклік праз тэлефон лепей за ўсё рэагаваць не візытам да сьледчага альбо пракурора, а прыхаваньнем сваёй нелегальнай дзейнасьці і падрыхтоўкай да больш шчыльных кантактаў з «праваахоўнымі» органамі.

## Што рабіць, калі прапануюць супрацоўнічаць з КДБ?

1. Ветліва, але цьвёрда **адмовіцца** ад гэткай прапановы. Калі той, хто робіць гэткую прапанову, не называецца альбо называецца ня цалкам (часта яны кажуць толькі імя і імя па-бацьку, бяз прозьвішча і пасады) – трэба патрабаваць паказу пасьведчаньня.

2. Абавязкова **агучыць** гэты факт – кадэбэшнікі галоснасьці ня любяць і нават баяцца яе. Калі вас «нефармальна» запрашаюць на сустрэчы з КДБ і просяць не казаць пра гэта нікому – трэба казаць, што

вы ўжо распаўсюдзілі зьвесткі пра гэта ўсім знаёмым і нават пасьпелі патэлефанаваць журналістам (назавіце любыя некалькі незалежных альбо замежных выданьняў, радыё «Маяк», «BBC» альбо «Свабода»).

3. Будзьце гатовыя, што вас паспрабуюць купіць (матэрыяльныя выгоды, прасоўваньне па службе і нават… удалая кар'ера ў вашай арганізацыі). Не прымайце: адмыцца ж ад такога супрацоўніцтва немагчыма. Дарэчы, гэтыя «бонусы» – на 99.9% хлусьня.

4. Калі на вас пачынаюць ціснуць (шантаж па месцы працы, вучобы, пагрозы сваякам) – трэба адказваць склікаьнем адмысловай прэс-канфэрэнцыі з нагоды ціску з боку КДБ, а таксама падачай скаргаў у пракуратуру і той жа КДБ. Ціску па месцы працы альбо па месцы вучобы супраціўляцца псыхалягічна цяжка, але неабходна.

5. Не падпісваць аніякіх папераў пра згоду на супрацоўніцтва альбо інфармаваньне.

6. Пасьля гэтага варта падрыхтавацца да іншых захадаў з боку спэцслужбаў у адносінах да вашай асобы.

7. Ні ў якім разе не спрабаваць самастойна выканаць ролю Штырліца, агента вашай арганізацыі ў шэрагах КДБ. Выкарыстаньне гэткай тэхналёгіі зьліву несапраўднай інфармацыі ў спэцслужбы вельмі небясьпечнае нават пры добрым узроўні падрыхтоўкі яе ўдзельнікаў.

## Як сябе паводзіць падчас допыту?

Весьці сябе з адчуваньнем уласнай годнасьці, быць ветлівым, але цьвёрдым і абавязкова – **нешматслоўным** (а яшчэ лепей – маўклівым). **Ня трэба сьпяшацца з адказамі.**

Допыт – гэта сьледчае дзеяньне, якое строга рэглямэнтаванае крымінальна-працэсуальным кодэксам. Як і кожнае іншае сьледчае дзеяньне (вобшук, вочная стаўка і інш.), допыт можа мець месца толькі пасьля ўзбуджэньня крымінальнай справы. Няма крымінальнай справы – няма і допыту.

Таму на пачатку размовы з прадстаўніком праваахоўных органаў трэба ветліва пацікавіцца: а ў чым, уласна кажучы, справа; у якасьці каго вы выкліканыя; ці ўзбуджаная крымінальная справа; як называецца гэтая «сустрэча» і тая «паперка», на якой ён пачынае нешта пісаць. Магчыма, ён дарма губляе час…

Перад пачаткам допыту той, хто вядзе допыт, **абавязаны растлумачыць** вам вашыя правы. Калі ён проста зачытаў правы альбо пералічыў іх – не саромцеся патрабаваць больш падрабязнага **тлумачэньня**

Вы не юрыст, юрыдычных фармулёвак ня ведаеце і простага пераліку вам недастаткова.

Адзначым, што допыту могуць быць падвергнутыя як сьведкі, гэтак і сам абвінавачаны, падазроны, пацярпелы. Абвінавачаны і падазроны маюць права адмовіцца ад дачы сьведчаньняў. Пацярпелы і сьведка гэткага права ня маюць. Аднак і пацярпелы, і сьведка маюць права адмовіцца ад адказу на канкрэтнае пытаньне (але не ад сьведчаньняў увогуле!), калі лічаць, што дача падобных сьведчаньняў можа быць скіраваная супраць іх асабіста, супраць чальцоў іх сям'і і блізкіх сваякоў (чальцы сям'і – усе сваякі, непрацаздольныя ўтрыманцы і іншыя асобы, якія пражываюць сумесна з удзельнікам крымінальнага працэсу і вядуць зь ім супольную гаспадарку; блізкія сваякі – бацькі, дзеці, усынаўляльнікі і усынаўлёныя, родныя браты і сёстры, унукі).

Патрабуйце, каб вам распавялі пра сутнасьць крымінальнай справы, па якой вы выкліканыя, каб ня толькі назвалі артыкул крымінальнага кодэксу, але і растлумачылі ў дэталях, што значаць усе гэтыя фармулёўкі. На пачатку допыту вам прапануюць распавесьці ўсё вядомае па справе, што расьсьледуецца, таму вы мусіце ведаць сутнасьць справы. Па ходзе вашага расповеду і пасьля яго сьледчы можа задаваць дадатковыя пытаньні.

Навадныя пытаньні забароненыя, і вы не абавязаныя на іх адказваць. Напрыклад, сьледчы не павінен адразу запытвацца: «Дзе вы пазнаёміліся з Лукашэвічам?» альбо «Калі вам Лукашэвіч перадаў брашуру "Асновы бясьпекі жыцьцядзейнасьці"?» – гэтым пытаньням павінны папярэднічаць пытаньні кшталту «Ці знаёмыя вы асабіста з Аляксеем Лукашэвічам?» і, адпаведна, «Ці бачылі вы брашуру "Асновы бясьпекі жыцьцядзейнасьці"?». Адзначым, што ў выпадку пытаньняў пра знаёмства зь нейкім Лукашэвічам альбо Рабіновічам вы можаце адзначыць, што не разумееце, пра якую менавіта асобу з гэтым прозьвішчам вядзецца размова, альбо, ня выключана, ведаеце яго толькі візуальна. У гэтым выпадку сьледчы абавязаны паказаць вам для апазнаньня асобу (фатаздымак асобы), пра якую вядзецца размова, але не адну, а ў шэрагу іншых асобаў (фатаздымкаў іншых асобаў) – каб вы самі пазналі (альбо не пазналі) патрэбнага. Гэтая працэдура патрабуе запрашэньня панятых і афармляецца асобным пратаколам.

Запісаны ў пратакол расповед і адказы на пытаньні складаюць **сьведчаньні** асобы, якую дапытваюць.

Пасьля свабоднага расповеду вы маеце права запісаць свае сьведчаньні ўласнаручна.

Перад заканчэньнем допыту пратакол павінен быць прапанаваны вам для прачытаньня і падпісаньня. Пры гэтым вы маеце права ўносіць у яго любыя выпраўленьні і ўдакладненьні – таму ўважліва чытайце тэкст, можа, вы сказалі нешта лішняе. У любым выпадку пакуль вы не падпісалі пратакол, допыт ня скончаны. Таксама вы маеце права запісаць свае сьведчаньні ўласнаручна. Пры гэтым трэба рыхтавацца да таго, што сьледчы будзе імкнуцца ня даць вам пратаколу альбо даць яго толькі для падпісаньня – настойвайце на выкананьні сваіх правоў, чытайце пратакол уважліва, выпраўляйце памылкі сьледчага і ўласныя недакладнасьці. Пры гэтым вы можаце заўважыць, што нейкія вашыя словы шкодзяць вашым інтарэсам – не саромцеся іх выкрасліць, да падпісаньня пратаколу яны не зьяўляюцца вашымі сьведчаньнямі, скажыце сьледчаму: «Я гэтага не казаў» альбо «Вы мяне няправільна зразумелі». Натуральна, гэта будзе недаспадобы сьледчаму, але гэта – вашае права. Падпісвайце кожную старонку пратаколу асобна.

Часам сьледчыя запугваюць сьведак (а па палітычных справах амаль усе абвінавачаныя спачатку выступаюць як сьведкі) адказнасьцю за адмову ад дачы сьведчаньняў (арт. 402 Крымінальнага кодэксу) альбо за наўмысна ілжывыя сьведчаньні (арт. 401 Крымінальнага кодэксу). Гэтых пагрозаў баяцца ня трэба. Па-першае, цяжка даказаць, што вы наўмысна хлусілі, а не памыляліся з прычыны кепскай памяці. Па-другое, адмова ад адказу на канкрэтнае пытаньне ў сувязі з прэзумпцыяй невінаватасьці не зьяўляецца адмовай ад дачы сьведчаньняў. І, нарэшце, трэба памятаць, што гэтыя артыкулы не прадугледжваюць пазбаўленьня волі і рэальна іх выкарыстаньне не пашыранае. Сьведка папярэджваецца пра інфармаванасьць пра гэтыя артыкулы пісьмовай падпіскай – і гэта хутчэй прыклад дазволенага законам псыхалягічнага ціску. На ўсялякі выпадак: акрамя згаданых артыкулаў, у Крымінальным кодэксе ёсьць яшчэ артыкул 394 «Прымус да дачы сьведчаньняў», а таксама артыкул 395 «Фальсыфікацыя доказаў».

Допыт ня можа працягвацца больш за 4 гадзіны запар. На працягу дня чалавека можна дапытваць чатыры гадзіны, пасьля робіцца перапынак ня менш чым на адну гадзіну, пасьля допыт можа працягвацца далей, але агульная яго працягласьць ня можа быць болей за 8 гадзін.

Такім чынам, у допыт граюць удваёх:

**Сьледчы –** гэта, звычайна, дасьведчаны і навучаны прафэсіянал, які ведае ня толькі правілы працы, але і валодае адмысловымі хітрыкамі (кшталту «Вы вырабілі на хатняй друкарцы 2500 антыдзяржаўных улётак…» – «Вы што, толькі 200, і тыя рабіў ня дома, а на працы…»).

Насупраць сьледчага **– вы,** звычайны чалавек, які патрапіў у непрыемнае і нязвыклае становішча, не валодае досьведам паводзінаў падчас допытаў…

Сьледчы ведае сваю справу, таму дадзім парады Вам.

Не спрабуйце перайграць сьледчага. Вашая задача – не прайграць самому сабе і не нанесьці шкодаў таварышам і калегам.

Вельмі важна захоўваць пачуцьцё ўласнай годнасьці, не панікаваць, «прыгасіць» эмоцыі. Ня трэба займацца агітацыяй і выступаць, быццам вы на мітынгу.

Трэба памятаць, што ў вас на руках ёсьць як мінімум пяць козыраў:

**1. Упэўненасьць у праваце ўласнай справы.** Вы не вінаватыя. Вы займаецеся дзейнасьцю, карыснай для краіны і грамадзтва, для іншых людзей. Вам няма чаго саромецца і няма чаго баяцца. На самай справе вінаватыя тыя, хто з вашай дзейнасьці хоча зрабіць злачынства…

**2. Элементарнае веданьне сваіх правоў.** Трэба памятаць, што нашае заканадаўства ня ўтрымлівае ясных нормаў па барацьбе зь іншадумствам і апазыцыяй, а таму прынамсі на паперы грамадзянам гарантаваны пэўны аб'ём правоў і свабодаў. Гэта дазваляе нам ветліва настойваць на іх выкананьні, дазваляе карыстацца імі (напрыклад, прэзумпцыяй невінаватасьці). Гэта дысцыплінуе вашага суразмоўцу і вымушае яго пазьбягаць «выпадковага» парушэньня вашых правоў. І менавіта з гэтай прычыны трэба адмаўляцца ад прапановаў сьледчага перавесьці гутарку ў нефармальнае рэчышча. Не саромцеся патрабаваць выкананьня сваіх правоў.

**3. Здаровы сэнс.** Заставайцеся самім сабой, не губляйце ўпэўненасьці, будзьце спакойныя, нешматслоўныя, ветлівыя і разважлівыя. Не сьпяшайцеся з адказамі. Думайце над тым, што кажаце, старайцеся не хлусіць, але ня бойцеся перапытваць і цягнуць час. Памятайце пра свае правы. Калі вы адчуваеце сябе зусім няёмка, паспрабуйце перанесьці допыт, спашліцеся на кепскае самаадчуваньне. Папрасіцеся ў прыбіральню.

**4. Падрыхтуйцеся да несправядлівых і неправавых дзеяньняў у адносінах да вас.** Супрацоўнікі «праваахоўных» органаў, у прынцыпе,

павінны выконваць нормы закону, але часам яны пра гэта забываюцца – няхай гэта ня будзе для вас нечаканасьцю.

На лаянку, пагрозы не рэагуйце як на небясьпеку – звычайна гэта проста стыль працы і тактычныя крокі. Пакуль што катаваньні па палітычных матывах застаюцца ў нашых «праваахоўных» органаў выключэньнем. Калі вам пагражаюць альбо хамяць, трэба:

а) адзначыць, што сьледчы парушае заканадаўства, і патрабаваць занесьці гэта ў пратакол (альбо адзначыць, што занесяце гэта ў пратакол уласнаручна), калі сьледчы не супакоіцца – трэба адмовіцца адказваць на пытаньні;

б) зрабіць адзнаку ў пратаколе;

в) пасьля допыту падаць скаргу пракурору.

Пры спробах фізычнага ўзьдзеяньня (гэта рэдка здараецца ў сьледчага, у КДБ альбо ў пракуратуры, а вось у міліцыянтаў зьяўляецца вельмі пашыранай практыкай) – трэба шумець, крычаць, інсцэнаваць сардэчны прыступ, патрабаваць пэўны від таблетак. Фізычнага супраціву аказваць ня варта. Адразу пасьля катаваньняў трэба пісаць скаргу пракурору, найлепей з пазначэньнем прозьвішчаў злачынцаў.

**5. Памятайце асноўны прынцып правасудзьдзя – прэзумпцыю невінаватасьці.** У вас ёсьць права адмовіцца ад дачы сьведчаньняў супраць самога сябе, сваіх блізкіх, сваякоў і чальцоў сваёй сям'і (арт. 27 Канстытуцыі). Пры гэтым тлумачыць, чаму вы лічыце гэткія сьведчаньні скіраванымі супраць сябе, вы не абавязаныя. Лепей скарыстацца гэтым прынцыпам, чым хлусіць.

Трэба казаць як мага менш, лепей сказаць толькі частку праўды. Не кажыце таго, пра што вас не пытаюць. Адкрытыя і падрабязныя сьведчаньні па палітычных справах даюць сьледчым шмат інфармацыі, якая пасьля выкарыстоўваецца ў іншых справах альбо ў апэратыўнай дзейнасьці. Ня трэба сьпяшацца, ня трэба канфліктаваць зь сьледчым без патрэбы.

Памятайце: сьледчы грае ролю, ён выкарыстоўвае разнастайныя псыхалягічныя прыёмы – яго гэтаму вучылі. Вы таксама можаце паспрабаваць сыграць ролю «прастака», «выпадковага дурня» альбо «зацятага барацьбіта» – але вас гэтаму не вучылі і наўрад ці ў вас атрымаецца. Таму заставайцеся самі сабой і ня верце сьледчаму.

Асобнае пытаньне – наколькі асьвятляць у сьведчаньнях дзейнасьць вашай арганізацыі. Тут трэба кіравацца прынцыпам даваньня інфармацыі па-мінімуме. Калі арганізацыя зарэгістраваная («легальная»),

вам трэба казаць толькі пра легальную частку дзейнасьці, якая зафіксаваная ў паперах, даступных для вывучэньня дзяржаўным чыноўнікам. Калі арганізацыя незарэгістраваная – лепей за ўсё ўвогуле не прызнаваць яе існаваньня.

## Што рабіць, калі адбываецца вочная стаўка?

Вочная стаўка – фактычна адначасовы допыт двух чалавек. Звычайна адзін альбо абодва зь іх ужо далі сьведчаньні. Магчыма, вас хочуць злавіць на супярэчнасьцях альбо на хлусьні – будзьце псыхалягічна гатовыя да гэтага. Лепей на вочную стаўку ісьці з адвакатам.

На вочнай стаўцы можна:

а) пацьвярджаць тое, што кажа ваш візаві, – калі гэта вам і іншым на карысьць;

б) адмаўляцца, калі адчуваеце небясьпеку, – ваш таварыш, магчыма, ужо «зламаны» альбо «раскалоўся»;

в) можна пацьвердзіць свае ранейшыя сьведчаньні альбо «скарэктаваць» іх, калі вы адчуваеце, што гэта на вашую карысьць. У апошнім выпадку ня трэба казаць: «Я тады хлусіў», – а трэба казаць: «Я тады недакладна сказаў», «Я тады забыўся», «Цяпер я прыгадаў…»

У любым выпадку, вочная стаўка – складаная псыхалягічня працэдура. Менавіта для таго, каб яна не ператваралася ў псыхалягічную драму, карысна, каб прысутнічаў адвакат і вяртаў яе ў прававое рэчышча.

## Што рабіць, калі патрабуюць дагляду аўтамабіля?

Варыянты дзеяньняў:

- Даць даглядзець аўтамабіль без аніякіх перашкодаў. Гэта самы кепскі варыянт: нават калі вы ўпэўненыя, што вам нічога не пагражае, міліцыянты могуць падкінуць у аўтамабіоль наркотыкі альбо зброю. Таму лепей карыстацца іншым варыянтам.

- Патрабаваць складаньня пратаколу агляду з удзелам панятых. Вельмі часта людзі гэтага не патрабуюць, паколькі ня хочуць марнаваць час і ўпэўненыя ў сваёй невінаватасьці, – гэта памылковая стратэгія. Крымінальны перасьлед палітычнага зьняволенага Міхаіла Марыніча распачаўся менавіта з дагляду аўтамабіля.

- Зачыніцца ў аўтамабілі і не падпарадкоўвацца. Гэта адкрытае непадпарадкаваньне міліцыянтам, і яно караецца ў адміністрацыйным парадку. Таму гэткую тактыку трэба выкарыстоўваць толькі тады, калі ў гэтым ёсьць відавочны сэнс – выйграць час для сыходу іншага чала-

века, у якога знаходзяцца патрэбныя дакумэнты, альбо патэлефанаваць праз мабільны тэлефон і папярэдзіць калегаў пра напад. У любым выпадку гэта небясьпечны сродак непадпарадкаваньня.

Таму найбольш мэтазгоднай стратэгіяй зьяўляецца наступная:

Кажыце: «Згодны на правядзеньне дагляду. У мяне няма пярэчаньняў, адразу ж адчыню аўтамабіль, як толькі вы распачняце афармленьне пратаколу дагляду ўва ўстаноўленым парадку».

Калі будуць настойваць на правядзеньні дагляду без пратаколу – трэба адзначаць незаконнасьць іх дзеяньняў. Калі і гэта не дапаможа, трэба запатрабаваць паказу службовых пасьведчаньняў, перапісаць зь іх прозьвішчы і пасады міліцыянтаў – для далейшага абскарджаньня. Калі і гэта не дапамагае – трэба адчыніць машыну, але потым абавязкова падаць скаргу на незаконныя дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі, з пазначэньнем дакладнага часу інцыдэнту, нумару машыны і прозьвішчаў міліцыянтаў. Калі мы ня пішам скаргаў – яны, беспакараныя, становяцца нахабнымі. Фізычнага супраціву аказваць ня варта.

Важна таксама глядзець, хто патрабуе дагляду аўтамабіля. Гэта могуць быць даішнікі, міліцыянты, кадэбэшнікі, сьледчыя па нейкай крымінальнай справе, мытнікі падчас пераходу мяжы. Калі дагляду патрабуе нехта іншы – можна не падпарадкоўвацца.

Дагляд аўтамабіля пры перасячэньні мяжы – асобная справа. Ён можа дайсьці нават да разьбіраньня аўтамабіля на запчасткі. Таму яшчэ раз адзначым, што празь мяжу па магчымасьці трэба йсьці «чыстым» – ня мець пры сабе каштоўных дакумэнтаў, важных носьбітаў інфармацыі альбо буйных сумаў грошай.

Часам міліцыянты робяць засады каля офісаў і патрабуюць дагляду аўтамабіля таго чалавека, які выйшаў з офісу. У гэтым выпадку таксама варта патрабаваць складаньня пратаколу дагляду аўтамабіля нават тады, калі ў ім няма нічога. Такім чынам вашыя калегі ў офісе могуць пасьпець зьнішчыць дакумэнты альбо адкарэктаваць сваю дзейнасьць.

## Правы і абавязкі падчас сьледзтва

Трэба адрозьніваць крымінальнае сьледзтва ад адміністрацыйнага перасьледу. Дзейнасьць ад імя незарэгістраваных арганізацыяў – адміністрацыйнае правапарушэньне, якое ня можа быць прычынай такіх сьледчых дзеяньняў, як вобшук, допыт і інш.

Сьледчыя дзеяньні могуць мець месца толькі ў выпадку ўжо ўзбуджа-

най крымінальнай справы. Аб'ём правоў і абавязкаў падчас сьледзтва залежыць ад таго, у якім статусе знаходзіцца асоба: яна можа быць пацярпелым, сьведкам, падазроным альбо абвінавачаным.

Падазроным зьяўляецца асоба, якая была затрыманая па падазрэньні ў зьдзяйсьненьні злачынства альбо ў адносінах да якой узбуджаная крымінальная справа, ужытыя меры стрыманьня (напрыклад, падпіска пра нявыезд) ці вынесеная пастанова аб прыцягненьні да адказнасьці ў якасьці падазронага. Абвінавачаным зьяўляецца асоба, у дачыненьні да якой вынесеная пастанова аб прыцягненьні ў якасьці абвінавачанага.

Галоўнае права абвінавачанага і падазронага падчас сьледзтва – права на юрыдычную дапамогу для абароны. Згодна з артыкулам 62 Канстытуцыі, вы маеце права карыстацца ў любы момант дапамогай адвакатаў і іншых сваіх прадстаўнікоў у судзе, іншых дзяржаўных органах, органах мясцовага самакіраваньня, на прадпрыемствах, ува ўстановах, арганізацыях, грамадзкіх аб'яднаньнях і ў стасунках з службовымі асобамі і грамадзянамі. Аднак парадак прадстаўніцтва падчас крымінальнага сьледзтва рэгулюецца крымінальна-працэсуальным кодэксам, які абмяжоўвае кола прадстаўнікоў: «прадстаўнікі – блізкія сваякі, чальцы сям'і пацярпелага, грамадзянскага істца, грамадзянскага адказчыка, законныя прадстаўнікі; адвакаты, прадстаўнікі прафсаюзных і іншых грамадзкіх аб'яднаньняў, а таксама іншыя асобы, дапушчаныя да ўдзелу ў крымінальнай справе з дазволу органу, які вядзе крымінальны працэс». Законныя прадстаўнікі прызначаюцца непаўналетнім. Рэальна абвінавачаны альбо падазроны можа карыстацца юрыдычнай дапамогай і прадстаўніцтвам адваката альбо свайго блізкага сваяка. Памятайце, што заявіць свайго блізкага сваяка ў якасьці абаронцы вы можаце толькі да таго, як вы вырашылі карыстацца дапамогай адваката. Гэта значыць, што хадайніцтва пра дапушчэньне ў працэс блізкага сваяка трэба заявіць да прызначэньня адваката. Прызначэньне ў якасьці абаронцы блізкага сваяка ў далейшым не перашкаджае прызначэньню аднаго альбо некалькіх адвакатаў.

На ўсе сьледчыя дзеяньні трэба зьяўляцца з сваім адвакатам альбо прадстаўнікам зь ліку блізкіх сваякоў. Калі сьледчы альбо пракурор адмаўляецца дапусьціць прадстаўніка да ўдзелу ў сьледчым дзеяньні, трэба адмаўляцца ад будзь-якога супрацоўніцтва з спасылкай на парушэньне вашага канстытуцыйнага права (у тым ліку можна адмовіцца

ад дачы паказаньняў у якасьці сьведкі). Гэткія дзеяньні трэба абскарджваць начальніку, пракурору, вышэйстаячаму пракурору альбо ў суд.

Асноўныя правы абвінавачанага і/альбо падазронага падчас сьледзтва:

- Ня сьведчыць супраць самога сябе, чальцоў сваёй сям'і і блізкіх сваякоў (гэта датычыцца ўсіх удзельнікаў працэсу, а падазроны і абвінавачаны могуць увогуле адмовіцца ад дачы сьведчаньняў) альбо даваць сьведчаньні і тлумачэньні.

- Ведаць, у чым палягае сутнасьць абвінавачаньня (падазрэньня), і атрымаць копію пастановы аб узбуджэньні крымінальнай справы.

- Ведаць аб'ём сваіх правоў, у тым ліку – атрымаць пісьмовую інфармацыю пра свае правы.

- Паведаміць чальцам сям'і і блізкім сваякам пра месца свайго знаходжаньня (празь сьледчага).

- Уласнаручна запісваць свае сьведчаньні ў пратаколах.

- Заяўляць хадайніцтвы і адводы, прыводзіць доказы.

- Абскарджваць дзеяньні службовай асобы, што вядзе крымінальны працэс, у тым ліку ў судовым парадку.

- Карыстацца юрыдычнай дапамогай абаронцы (адваката, а ў выпадку непаўналетніх – законнага прадстаўніка), у тым ліку атрымаць першую бясплатную кансультацыю адваката да першага допыту.

Падпарадкоўвацца законным распараджэньням сьледчага альбо пракурора – ваш абавязак. Вось тут і патрэбная юрыдычная дапамога адваката альбо прадстаўніка – вызначыць, ці былі распараджэньні законнымі.

Заўважым, што вельмі часта сьледчыя прыцягваюць людзей спачатку ў якасьці сьведкаў, а пазьней робяць іх абвінавачанымі. Таму сьведку важна памятаць пра права ня сьведчыць супраць сябе.

Сьведка абавязаны зьяўляцца па выкліках органу, які вядзе крымінальны працэс, праўдзіва адказваць на пытаньні сьледзтва, не выдаваць матэрыялаў сьледзтва (калі ён пра гэта быў папярэджаны сьледчым). Сьведка мае права адмовіцца ад дачы сьведчаньняў супраць сябе, чальцоў сваёй сям'і і блізкіх сваякоў; запісваць свае сьведчаньні ўласнаручна; атрымліваць кампэнсацыю выдаткаў, панесеных у выніку ўдзелу ў крымінальнай справе; заяўляць адвод перакладчыку; заяўляць хадайніцтвы і падаваць скаргі на дзеяньні органу, які вядзе крымінальны працэс. Сьведка ня можа быць прымусова падвергнуты экспэртызе.

## Як карыстацца правам на абарону?

Зьвярнуцца па парады і тлумачэньні да знаёмага юрыста, да адваката, у праваабарончую арганізацыю.

Імкнуцца не размаўляць зь сьледчым і ня ўдзельнічаць у сьледчых дзеяньнях без адваката альбо прадстаўніка.

Калі вам аб'яўлена аб прыцягненьні ў якасьці падазронага альбо вас затрымалі ці ўзялі пад варту – у першую чаргу (да першага допыту!) трэба патрабаваць адваката (няхай сабе і бясплатнага) для першай юрыдычнай кансультацыі. У гэты момант вы маеце права патрабаваць (і вам абавязаныя даць) пісьмовы пералік вашых правоў. Трэба ўважліва вывучыць гэтую паперу, і калі нешта незразумела – патрабуйце тлумачэньняў.

Патрабуйце занясеньня ў пратаколы кожнага з вашых пярэчаньняў адносна незаконных, на ваш погляд, дзеяньняў сьледчага. Нават калі вы ня ўпэўненыя, што дзеяньні сьледчага незаконныя, – пярэчце! Перад падпісаньнем пратаколаў пішыце ў іх свае заўвагі і заявы наконт правільнасьці і паўнаты запісаў у пратаколе, наконт абставінаў, якія, на ваш погляд, павінны быць адлюстраваныя ў пратаколе.

Абскарджвайце пракурору і ў суд дзеяньні і рашэньні органу, які вядзе крымінальны працэс.

У вас ёсьць права мець аднаго альбо некалькіх адвакатаў (былі б грошы), карыстацца паслугамі бясплатнага адваката, аднак раім напачатку, не адмаўляючыся ад адваката, дамагчыся допуску ў працэс у якасьці абаронцы блізкага сваяка.

Ад паслугаў адваката, калі вас не задавольвае якасьць ягонай працы, можна адмовіцца, замяніць гэтага адваката на іншага.

# 3. БЯСЬПЕКА ПАМЯШКАНЬНЯ

## Як карыстацца памяшканьнем

Дзейнасьць арганізацыі вымагае наяўнасьці сталага памяшканьня – офісу, штаб-кватэры, сядзібы. Натуральна, калі арганізацыя зьяўляецца зарэгістраванай і легальна працуе па месцы знаходжаньня юрыдычнага адрасу – яе дзейнасьць заўжды можа быць праверана разнастайнымі службамі кантролю – міліцыяй, падатковай інспэкцыяй, пракуратурай, органамі юстыцыі. Аднак пераважная большасьць беларускіх няўрадавых арганізацыяў месьціцца нелегальна на падпольных кватэрах.

Зручным зьяўляецца варыянт, калі арганізацыя месьціцца ў кватэры альбо доме, які належыць аднаму з актывістаў. У гэтым выпадку на гэтае памяшканьне пашыраюцца ўсе правілы недатыкальнасьці прыватных уладаньняў. У гэтае памяшканьне бяз згоды ўласьніка можна ўвайсьці толькі з пастановай сьледчага аб правядзеньні вобшуку з санкцыяй пракурора. Рэальна такі дакумэнт амаль заўжды адсутнічае ў нязваных гасьцей, таму іх можна не дапускаць на штаб-кватэру на законных падставах.

Часам дзейнасьць арганізацыі вымагае зьняцьця спэцыяльнай кватэры альбо дому. У гэтым выпадку можна заключыць дагавор арэнды альбо дагавор бязвыплатнага карыстаньня памяшканьнем, дагавор бязвыплатнага пражываньня на адну з асобаў, што зьвязаныя з арганізацыяй. Гэта дазваляе легальна карыстацца дадзеным памяшканьнем, аднак адначасова пазбаўляе магчымасьці адмовіцца ад сваёй датычнасьці да гэтага памяшканьня. Таму калі вы здымаеце кватэру для захоўваньня вялікай партыі падпольнай літаратуры альбо іншых небясьпечных рэчаў, то дамаўляцца пра арэнду памяшканьня лепей за ўсё нефармальна (гэта значыць без заключэньня пісьмовага дагавору і безь яго рэгістрацыі).

Важна, каб памяшканьне было **надзейна абароненае ад рабаўнікоў**. У Беларусі напады зладзеяў на офісы нелегальных арганізацыяў зьяўляюцца вельмі пашыранай практыкай. Рабаўнікі ведаюць, што гаспадары гэтых кватэраў абмежаваныя ў магчымасьці зьвяртацца па дапамогу ў міліцыю, і карыстаюцца гэтым. Да таго ж, па некаторых прыкметах, часам наводку рабаўнікам на гэтыя кватэры робяць самі «праваахоўнікі», дасягаючы гэткім чынам сваіх мэтаў (паралізаваць

дзейнасьць арганізацыі, даведацца каштоўную інфармацыю, паставіць апаратуру для праслухоўваньня). Таму трэба выкарыстоўваць наступныя сродкі бясьпекі:

- **Надзейна абаронены ўваход**: двайныя дзьверы з добрымі замкамі, сыстэма відэаназіраньня за ўваходам, дамафон.

- **Прадуманая дзьвярная палітыка**. Ня варта адчыняць дзьверы, не даведаўшыся, хто за імі стаіць. Інструкцыя па працы на офісе павінна вызначаць, каго і якім чынам можна дапускаць у памяшканьне. Калі ў офіс заўжды заходзяць незнаёмыя людзі – вы, безумоўна, рызыкуеце. Лепей за ўсё папярэдне дамаўляцца пра сустрэчы ды інфармаваць пра іх сяброў арганізацыі. Трэба выкарыстоўваць магчымасьці дамафона.

- Калі кватэра месьціцца на першым альбо другім паверсе – паставіць **краты** на вокнах.

- Пажадана, каб уначы на кватэры заставаўся **вартаўнік** альбо нехта зь сяброў арганізацыі. Гэта прэвэнтыўны сродак абароны – ведаючы, што ў офісе заўжды нехта ёсьць, зламысьнікі адмовяцца ад таемнага пранікненьня ў кватэру. Вартаўнік мусіць быць надзейным чалавекам і павінен ведаць, што рабіць у надзвычайных сытуацыях. Для яго варта распрацаваць службовую інструкцыю.

- Калі няма магчымасьці пакідаць вартаўніка, можна прадумаць сыстэму **сыгналізацыі**. З натуральных прычынаў, карыстацца звычайнай сыгналізацыяй міліцэйскага ўзору не выпадае. Аднак можна зрабіць сыгналізацыю праз мабільны тэлефон. Ён падае SMS на вызначаны нумар, калі нехта ўваходзіць у кватэру.

- Мець дазволеныя законам **сродкі самаабароны**. Найлепшым з варыянтаў зьяўляецца электрашокер. Права абараняць сябе, сваю маёмасьць, свае правы, маёмасьць іншых грамадзянаў – натуральнае і гарантаванае Канстытуцыяй права.

- Мець добрыя, **сяброўскія стасункі з суседзямі**. Вашыя суседзі могуць паведаміць вам, што каля вашага офісу пачынаецца нейкая падазроная валтузьня. Да вашых суседзяў могуць зьвярнуцца «праваахоўнікі», калі будуць зьбіраць інфармацыю пра вашую арганізацыю. Зрэшты, суседзі могуць у пэўным выпадку зрабіцца панятымі.

Добрым сродкам абароны ад непрыемнасьцяў можа быць офісны мабільны тэлефон. У выпадку міліцэйскага нападу ён дазваляе ня толькі зьвязацца з айчыннымі і замежнымі журналістамі (эфэктным будзе прамы эфір на радыё), але і выклікаць кіраўніцтва арганізацыі, адвакатаў і праваабаронцаў. Вядома, можна скарыстацца і стацыянар-

ным тэлефонам, але часта пры міліцэйскіх нападах стацыянарны тэлефон адключаюць. Падчас вобшуку сьледчы мае права забараніць прысутным пакідаць памяшканьне і рабіць тэлефанаваньні.

Таксама, калі дазваляюць магчымасьці, варта рэгулярна правяраць памяшканьне на наяўнасьць «жучкоў» – прыладаў для праслухоўваньня (гл. разьдзел пра бясьпеку камунікацыяў).

Калі ёсьць магчымасьць, варта мець на кватэры невялічкі тайнік, альбо дамоўленае месца захоўваньня. Гэта не дапаможа пры вобшуку, аднак дазволіць хаваць рэчы ад непажаданых вачэй. Прынцып – лепей схаваць кепска, чым увогуле не хаваць.

У любым выпадку, наколькі надзейна ні была б у вас адладжаная сыстэма офіснай бясьпекі, ня варта захоўваць у офісе сур'ёзныя і сакрэтныя дакумэнты ў раздрукаваным альбо незашыфраваным выглядзе. Лепей хаваць паперы ў розных месцах у надзейных асобаў (але ня ў лідэраў і вядомых актывістаў супраціву). Дакумэнты, якія больш непатрэбныя, трэба неадкладна зьнішчаць. Не забывайцеся таксама зьнішчаць і чарнавікі дакумэнтаў. Ня варта захоўваць у штаб-кватэры вялікія наклады друкаваных матэрыялаў.

## Як аформіць аргтэхніку

На ўсю аргтэхніку, што знаходзіцца ў офісе арганізацыі (кампутары, капіявальныя прыстасаваньні, сканэры і інш.), павінны быць складзеныя **дагаворы** бязвыплатнага карыстаньня альбо дагаворы захоўваньня. Такім чынам пацьвярджаецца легальнасьць паходжаньня гэтай тэхнікі, выключаецца магчымасьць абвінавачаньня вас у тым, што вы скралі гэтую аргтэхніку.

Дагавор заключаецца паміж супрацоўнікам арганізацыі альбо ўладаром памяшканьня, дзе працуе арганізацыя, – з аднаго боку – і асобай, якая набыла гэтую тэхніку, – з другога боку. Гэты другі бок павінен быць грамадзянінам Беларусі, каб пазьбегнуць абвінавачаньня ў парушэньні парадку выкарыстаньня замежнай бязвыплатнай дапамогі. Пажадана, каб гэтая другая асоба мела легальныя крыніцы існаваньня (паходжаньне грошай, за якія была набытая аргтэхніка) і не была вельмі шчыльна зьвязаная з штодзённай дзейнасьцю арганізацыі.

Дагаворы павінны быць заключаныя ў некалькіх асобніках:

- першы знаходзіцца дома ў асобы, што набывала тэхніку;
- другі і трэці знаходзяцца дома ў дваіх супрацоўнікаў арганізацыі;

- чацьверты захоўваецца побач з тым прадметам, які перадаецца ў бязвыплатнае карыстаньне.

У выпадку канфіскацыі альбо адабраньня вашай аргтэхнікі гэтыя дакумэнты могуць дапамагчы вярнуць тэхніку альбо даказаць, што вы яе ня скралі. Пра паходжаньне адабранай аргтэхнікі варта зрабіць заўвагу ў пратаколе вобшуку альбо адабраньня.

## Што рабіць, калі да вас хочуць зайсьці міліцыянты?

Ніхто ня мае права без **законнай падставы** ўвайсьці ў жыльлё альбо ў іншае законнае ўладаньне грамадзяніна супраць ягонай волі. Недатыкальнасьць жыльля і іншых законных уладаньняў гарантуецца артыкулам 29 Канстытуцыі Беларусі. Пад іншымі законнымі ўладаньнямі трэба разумець нежылыя памяшканьні (лецішча, гараж, сарай) і месцы, дзе чалавек стала альбо часова знаходзіцца (нумар у гатэлі, купэ ў цягніку).

Такім чынам, прыйшлі, пазванілі альбо пагрукалі ў дзьверы, – вы адчынілі. Пытаюцца: «Ці можна зайсьці?» – «Заходзьце» («Так», «Калі ласка» і г. д.). Усё – вашая воля выяўленая недвухсэнсоўна – вы **дазволілі**. Пасьля гэтага аспрэчыць «незаконнасьць» іх дзеяньняў ніколі не атрымаецца. Адсюль формула: дзьверы адразу не адчыняць, госьці спытаюць: «Ці можна зайсьці?» – «Не». І на гэтым пажадана паставіць кропку. Калі пачнёце высьвятляць: «А для чаго», «А навошта?» – забалбочуць і прарвуцца ў памяшканьне. І не спасылайцеся пасьля, што ўвайшлі супраць вашай волі – бо ж вы ня выказалі яе абсалютна вызначана: «Не, нельга», «Не дазваляю». Таму ня варта адчыняць дзьверы міліцыянтам, калі вы ўсё роўна ня хочаце пускаць іх у памяшканьне.

Што ж рабіць?

Не дазваляючы няпрошаным гасьцям пераступіць ганак (а лепей – не адчыняючы дзьвярэй), патрабаваць растлумачыць падставы – што ім ад вас трэба і якія ў іх ёсьць дакумэнты. Не адчыняць дзьверы кватэры прадстаўнікам «праваахоўных» органаў, не пераканаўшыся, што тыя маюць на руках **пастанову** аб правядзеньні вобшуку (дагляду, адабраньня) у дадзеным памяшканьні. Гэткая пастанова абавязкова павінна мець **санкцыю пракурора** – подпіс пракурора ў верхнім куце пастановы з круглай гербавай пячаткай пракуратуры. Усе іншыя падставы зьяўляюцца незаконнымі, і ім можна не падпарадкоўвацца. Таму ня варта весьціся на словы-пасткі «Адкройце дзьверы…

- …гэта праверка пашпартнага рэжыму, шукаем нелегалаў»;

- …гэта крымінальная міліцыя, у вас у пад'езьдзе забілі чалавека, мы абшукваем усе кватэры ў пад'езьдзе»;
- …да вас забег рабаўнік»;
- …для правядзеньня дагляду памяшканьня»;
- …вы тут не прапісаныя»;
- …гэта КДБ!»;
- …я ваш новы ўчастковы, хачу з вамі пазнаёміцца».

На самай справе, паводле заканадаўства, міліцыя мае права пранікаць у памяшканьне і без санкцыі пракурора для прадухіленьня злачынства, якое ў гэтым памяшканьні адбываецца. Паводле заканадаўства пра КДБ, кадэбэшнікі таксама маюць права пранікаць у памяшканьне, нават з пашкоджаньнем запорных прыстасаваньняў, у адсутнасьць гаспадара альбо бяз згоды гаспадара. Але гэтыя нормы не абавязваюць вас самім адчыняць дзьверы. Практыка паказвае, што у 90% выпадкаў міліцыянты ня будуць ламаць дзьверы.

Калі вы здымаеце кватэру і ёсьць відавочная небясьпека вобшуку, трэба абавязкова ўлічваць яшчэ і тую акалічнасьць, што міліцыянты могуць выкарыстаць дапамогу гаспадара для пранікненьня ў кватэру. Лепей за ўсё гэта загадзя абгаварыць з гаспадаром – вядома, ён можа спужацца вашых перасьцярогаў, аднак у далейшым гэта можа вам дапамагчы. Зь іншага боку, закон прадугледжвае, што пры вобшуку павінен прысутнічаць гаспадар памяшканьня, – вы можаце патрабаваць неадкладна выклікаць яго і тым самым можаце пацягнуць час.

Калі ёсьць санкцыя пракурора на правядзеньне вобшуку, а ў вас у кватэры знаходзяцца дакумэнты, якім ня варта патрапляць у спэцслужбы, вы павінны зьнішчыць гэтыя дакумэнты перад уваходам міліцыянтаў. Практыка паказвае, што пры правядзеньні вобшуку па палітычных матывах міліцыянты не чакаюць супраціву альбо непадпарадкаваньня – гэта значыць, што, пакуль яны прымуць рашэньне пра пранікненьне ў памяшканьне гвалтам, пакуль будуць раіцца з начальствам, пакуль будуць узламываць дзьверы, вы можаце пасьпець зьнішчыць дакумэнты, а магчыма, і запрасіць праз тэлефон журналістаў. Увогуле, пакуль у Беларусі выпадкі гвалтоўнага пранікненьня з выломліваньнем дзьвярэй зьяўляюцца выключэньнем. У выпадку нападу не выкідайце непажаданыя рэчы ці дакумэнты праз вокны, бо за імі, хутчэй за ўсё, сочаць.

Калі вы не дапускаеце міліцыянтаў у сваю штаб-кватэру, **спасылайцеся на артыкул 29 Канстытуцыі Беларусі.**

## Што рабіць, калі ў вас адбываецца вобшук, дагляд альбо адабраньне?

Пры правядзеньні вобшуку трэба ўважліва азнаёміцца з тэкстам пастановы. Памятайце, што перад пачаткам працэдуры вобшуку ці адабраньня ўсім удзельнікам сьледчага дзеяньня павінны зачытаць іх правы. Адабраньне адрозьніваецца ад вобшуку тым, што міліцыянтам вядома, што яны шукаюць (адбіраюцца нейкія вызначаныя рэчы альбо дакумэнты).

Пры даглядзе трэба высьветліць, зь якой мэтай ажыцьцяўляецца дагляд, у межах якой крымінальнай справы і чаго хочуць знайсьці. Калі шукаюць чалавека – трэба забараніць, напрыклад, рыцца ў паперах альбо заглядаць у скрыні пісьмовага стала.

Калі вобшук пачаўся нечакана – можна паспрабаваць схаваць штонебудзь пры сабе. Асабісты дагляд пры вобшуку, а тым больш пры даглядзе памяшканьня па палітычных справах робяць не заўжды, хоць інструкцыі раяць гэтым пачынаць і гэтым сканчаць дадзенае сьледчае дзеяньне.

Пры вобшуку:

1. Варта зрабіць для занясеньня ў пратакол заяву пра тое, што вы гатовыя добраахвотна выдаць тое, што разьлічваюць знайсьці.
2. Калі гэтага ў вас няма – таксама трэба зрабіць адпаведную заяву для занясеньня ў пратакол.
3. Калі ў вас гэтая рэч ёсьць – трэба вырашыць, ці гатовыя вы аддаць запатрабаванае добраахвотна (усё роўна знойдуць, а вам ад гэтага толькі горш). Адзначым, што калі мянты хочуць вам падкінуць, напрыклад, наркотыкі альбо зброю – яны ніколі не папярэдзяць вас пра добраахвотную здачу, хоць гэткі радок і запісваецца ў выніковы пратакол.
4. Заявіць і патрабаваць занясеньня ў пратакол патрабаваньня аб правядзеньні вобшуку не адначасова ўва ўсіх пакоях кватэры, а пасьлядоўна, каб вы маглі рэальна прысутнічаць пры ўсіх дзеяньнях. Калі ў кватэру ўварвалася дваццаць чалавек, ня варта чакаць, што гэткае хадайніцтва будзе задаволенае, аднак яго адлюстрваанне ў пратаколе можа дапамагчы ў выпадку ілжывых абвінавачаньняў. Прынамсі, трэба актыўна патрабаваць, каб панятыя знаходзіліся ў кожным з пакояў, дзе адбываецца вобшук (колькасьць панятых павінна адпавядаць колькасьці пакояў).

5. Трэба пастаянна знаходзіцца ў тым памяшканьні, дзе адбываецца вобшук, трэба пільна сачыць за тымі, хто праводзіць яго.

6. Калі вы не знаёмыя з панятымі і не давяраеце ім (часта панятымі запрашаюцца запалоханыя студэнты, міліцыянты і падобныя асобы, якія часам нават дапамагаюць у зьдзяйсьненьні падлогу падчас сьледчых дзеяньняў), трэба заявіць з занясеньнем у пратакол хадайніцтва аб запрашэньні ў якасьці панятых вашых суседзяў.

7. Трэба патрабаваць занясеньня ў пратакол вобшуку індывідуальных прыкметаў (нумары, колер, ступень зносу, адмысловыя прыкметы) кожнай рэчы, што адбіраецца, каб іх пасьля не маглі падмяніць. Таксама варта пазначаць прыкладную цану рэчаў.

8. Трэба вельмі пільна прачытаць пратакол вобшуку, выкрасьліць усе пустыя радкі (каб у выніку туды не былі ўпісаныя нейкія іншыя рэчы). Заносьце ўсе свае заўвагі ў пратакол (а ня ў копію пратаколу, што застаецца ў вас!). Раім не адмаўляцца ад падпісаньня пратаколу, нават калі вы лічыце, што вобшук быў цалкам незаконным. Пратакол і без вашага подпісу ўсё роўна застаецца сапраўдным, а потым «праваахоўнікі» будуць лёгка ўносіць у яго праўкі. Лепей падпішыце кожную старонку пратаколу з сваімі заўвагамі.

9. Атрымаць копію пратаколу вобшуку, а калі адбывалася адабраньне – то і асобную копію пратаколу адабраньня.

10. Зьвяруцца па дапамогу да знаёмага юрыста альбо ў праваабарончую арганізацыю.

**Начныя вобшукі (у пэрыяд з 22-00 да 6-00 ) забароненыя.**

Пры правядзеньні вобшуку па палітычных справах трэба быць гатовым да таго, што **знойдуць тое, чаго вы самі ня клалі:** наркотыкі, зброю, грошы, фальшывыя грошы (могуць падкінуць загадзя альбо нават падчас вобшуку). Мэханізм рэагаваньня і прэвэнтыўнай абароны ад гэткіх правакацыяў і ілжывых абвінавачаньняў з боку міліцыі адлюстраваны ў гэтым дапаможніку.

Таксама памятайце, што «праваахоўнікі» вельмі любяць паўторныя вобшукі – праз месяц альбо праз тыдзень зайсьці туды, дзе яны ўжо правялі вобшук. Таксама выкарыстоўваецца «куставы» мэтад (адначасовыя вобшукі ў офісах партнэрскіх арганізацыяў альбо ў розных штаб-кватэрах адной арганізацыі) і «ланцуговы» мэтад (напады і вобшукі ў партнэрскіх офісах адзін за адным).

Паводле нашага заканадаўства, пракуратура можа санкцыянаваць

вобшук у любым памяшканьні (па справе аб крадзяжы лядоўні ў Рэчыцы фармальна можна правесьці вобшук на прыватным лецішчы кіраўніка менскай палітычнай партыі). Таму найлепей заўжды быць гатовым да вобшуку (не трымаць непатрэбных папераў, не захоўваць каштоўную інфармацыю на паперы, карыстацца сродкамі шыфраваньня).

Калі да вас пачалі хадзіць міліцыянты без законных падставаў для вобшуку – гэткія візыты могуць быць карысным папераджальным сыгналам: варта рыхтавацца да паўнавартаснага вобшуку.

# 4. АБМЕЖАВАНЬНЕ ВОЛІ І ЗАТРЫМАНЬНЕ

## Адміністрацыйнае і крымінальнае затрыманьне

Адміністрацыйнае затрыманьне належыць адрозьніваць ад затрыманьня крымінальнага – больш жорсткага віду прававога ўзьдзеяньня. Парадак затрыманьня вызначаецца тым, у чым падазраецца чалавек: у зьдзяйсьненьні адміністрацыйнага правапарушэньня ці ў зьдзяйсьненьні злачынства. У залежнасьці ад гэтага адрозьніваецца тэрмін, сутнасьць і працэсуальны парадак затрыманьня, а таксама аб'ём працэсуальных правоў затрыманага. Калі вашае затрыманьне зьвязанае з крымінальнай справай – не давайце паказаньняў і тлумачэньняў, адмаўляйцеся ад допыту і з моманту затрыманьня патрабуйце даць вам адваката.

Таксама трэба адрозьніваць паняцьці адміністрацыйнага і крымінальнага арышту. Адміністрацыйны арышт – від адміністрацыйнага спагнаньня за зьдзяйсьненьне адміністрацыйнага правапарушэньня. Ён можа цягнуцца да 15 начаў і прызначаецца судзьдзёй у адміністрацыйным працэсе. Крымінальны арышт накладаецца судзьдзёй за зьдзяйсьненьне злачынства і можа цягнуцца да 6 месяцаў.

## Крымінальнае затрыманьне — што трэба ведаць

*Хто можа быць затрыманы?* Артыкул 107 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу гаворыць: «*Задержание состоит в фактическом задержании лица, доставлении его в орган уголовного преследования и в кратковременном содержании под стражей в местах и условиях, определенных законом. Задержание может быть применено только:*

*- к лицу, подозреваемому в совершении преступления, за которое может быть назначено наказание в виде лишения свободы, направления в дисциплинарную воинскую часть или ареста;*

*- к обвиняемому для предъявления обвинения либо в случае нарушения условий примененной к нему меры пресечения;*

*- к осужденному, в отношении которого имеется представление уполномоченного на то органа об отмене приговора, определения, постановления суда об условном неприменении наказания, отсрочки исполнения наказания или условно-досрочном освобождении от отбывания наказания*».

Гэта азначае, што затрымліваць можна толькі тых людзей, адносна

якіх існуе абгрунтаванае меркаваньне, што яны ўчынілі злачынства.

Артыкул 108 КПК гаворыць: *«Лицо, подозреваемое в совершении преступления, может быть задержано действующим в пределах своей компетенции органом уголовного преследования при наличии любого из следующих оснований: 1) если лицо застигнуто при совершении предусмотренного уголовным законом общественно опасного деяния или непосредственно после его совершения; 2) если очевидцы происшествия, в том числе и лицо, пострадавшее от преступления, прямо укажут на данное лицо как на совершившее предусмотренное уголовным законом общественно опасное деяние или захватят его в порядке, предусмотренном статьей 109 настоящего Кодекса; 3) если на этом лице, при нем, на его одежде или других используемых им вещах, в его жилище, иных используемых им помещениях, на рабочем месте или транспортном средстве обнаружены явные следы, указывающие на его причастность к совершению предусмотренного уголовным законом общественно опасного деяния; 4) если имеются другие достаточные основания подозревать в совершении преступления лицо при условии, что оно пыталось скрыться с места преступления или от органа уголовного преследования, или не имеет постоянного места жительства, или проживает в другой местности, или не установлена его личность»*. Ніякія іншыя абставіны, акрамя пералічаных у артыкуле 108, ня могуць служыць падставай для затрыманьня.

Але гэта толькі тэорыя. Сучасная практыка паказвае, што сьледчыя органы занадта часта разумеюць зьмест гэтага артыкулу ў выгадным для сябе сьвятле. У выніку кожны грамадзянін краіны можа ў любы момант быць затрыманы на 72 гадзіны без указаньня прычыны. Вядома, што той, хто пасядзіць пад арыштам, становіцца больш падатлівым і яго лягчэй будзе зламіць. Арыштаванаму супрацоўнікі службы бясьпекі даюць зразумець, што ён знаходзіцца за крок ад месца пазбаўленьня волі на больш працяглы тэрмін і што ад яго пазыцыі залежыць, ці атрымае ён санкцыю пракуратуры. Як правіла, кожнае праяўленьне нашай слабасьці, нашай падатлівасьці сустракаецца з рэакцыяй сьледчых. Калі пачнём гаварыць, можам быць вызваленыя з-пад арышту раней за сканчэньне 72 гадзін. Пытаньне пра вызваленьне можа вырашаць сьледчы, які карыстаецца тым, што ўсё знаходзіцца ў яго руках. Аднак гэта цягнецца толькі трое сутак.

Згодна з заканадаўствам, затрыманаму павінны быць растлумачаныя прычыны затрыманьня. Часам у якасьці прычыны называюць

зьнешняе падабенства зь небясьпечным злачынцам, часам – «мне загадана» (звычайны міліцыянэр у мундзіры), часам – «ня будзь такім цікаўным, а то дам па мордзе» і г. д. Пасьля выхаду патрэбна як мага хутчэй напісаць скаргу ў пракуратуру, якая, як на большасьць нашых лістоў, нічога не адкажа альбо адкажа, што «выкладзеныя вамі факты не знайшлі свайго пацьвярджэньня». Але важна, каб застаўся сьлед неправавых дзеяньняў.

У адпаведнасьці з артыкулам 110 КПК, тэрмінова пасьля дастаўкі затрыманага ў орган крымінальнага перасьледу службовай асобай, якая зьдзейсьніла фактычнае затрыманьне, складаецца пратакол, у якім пазначаюцца падставы, месца і час фактычнага затрыманьня (з указаньнем гадзін і хвілін), вынікі асабістага вобшуку, а таксама час складаньня пратаколу. Пратакол аб'яўляецца затрыманаму, пры гэтым тлумачацца яго правы. Орган дазнаньня, сьледчы, пракурор на працягу 3 гадзін з моманту дастаўкі затрыманага ў орган крымінальнага перасьледу прымаюць рашэньне аб затрыманьні (аб утрыманьні пад вартай або аб вызваленьні). Рашэньне афармляецца пастановаю і аб'яўляецца затрыманаму. Пра затрыманьне орган дазнаньня ці сьледчы абавязаны пісьмова паведаміць пракурору на працягу 24 гадзін з моманту вынясеньня пастановы аб затрыманьні.

Аб затрыманьні асобы і яе месцазнаходжаньня орган, які ажыцьцявіў затрыманьне, абавязаны цягам12 гадзін з моманту фактычнага затрыманьня папярэдзіць каго-небудзь з паўналетніх чальцоў яго сям'і ці сваякоў або даць магчымасьць паведаміць самому затрыманаму. Пра затрыманьне грамадзяніна замежнай дзяржавы орган, які зьдзейсьніў затрыманьне, абавязаны паведаміць у МЗС для паведамленьня амбасадзе ці консульству гэтай дзяржавы.

Органам, які прыняў рашэньне аб вызваленьні затрыманага, выдаецца даведка, у якой указваецца, кім ён быў затрыманы, падставы, месца і час затрыманьня; матывы і час вызваленьня. Вызваленая асоба ня можа быць ізноў затрыманай па тым самым падазрэньні.

*Тэрміны затрыманьня.* У адпаведнасьці з артыкулам 108 КПК, калі асоба затрыманая па падазрэньні ўва ўчыненьні злачынства, пытаньне пра ўзбуджэньне крымінальнай справы павінна быць вырашанае за 12 гадзін з моманту фізычнага затрыманьня. У выпадку адмовы ад узбуджэньня крымінальнай справы ці адсутнасьці рашэньня аб узбуджэньні крымінальнай справы, затрыманы павінен быць вызвалены.

Калі крымінальная справа ўзбуджана ў пазначаны тэрмін, то затрыманьне па падазрэньні ўва ўчыненьні злачынства ня можа цягнуцца звыш за 72 гадзіны з моманту фактычнага затрыманьня (уключаючы тэрмін у 12 гадзін на ўзбуджэньне крымінальнай справы), пасьля якіх затрыманы павінен быць вызвалены з-пад варты або адносна яго павінна ўжывацца мера стрыманьня.

*Некаторыя правы падазронага пры затрыманьні* (арт. 41 КПК):
- неадкладна пасьля затрыманьня атрымаць ад органу крымінальнага перасьледу пісьмовае паведамленьне пра яго правы;
- неадкладна атрымаць ад органу крымінальнага перасьледу копію пастановы ці пратаколу аб затрыманьні;
- мець абаронцу ці некалькі абаронцаў з моманту прад'яўленьня пастановы ці пратаколу аб затрыманьні;
- да пачатку першага допыту ў якасьці падазронага атрымаць бясплатную юрыдычную кансультацыю адваката ў прысутнасьці асобы, якая праводзіць папярэдняе расьсьледаваньне. Такім чынам, з моманту затрыманьня грамадзянін мае права адмовіцца даваць любыя паказаньні да забесьпячэньня яму магчымасьці сустрэцца з адвакатам. Калі ў затрыманага ёсьць канкрэтны знаёмы адвакат, якому ён давярае, затрыманы павінен указаць дадзеныя пра гэтага адваката і дабівацца менавіта гэтага адваката.

*Абскарджаньне незаконнага затрыманьня.* У адпаведнасьці з артыкулам 143 КПК, скарга на затрыманьне падаецца ў орган, які вядзе крымінальны працэс. Гэты орган абавязаны на працягу 24 гадзін з моманту атрыманьня скаргі накіраваць яе ў суд. Судовая праверка законнасьці затрыманьня праводзіцца судзьдзёй у тэрмін не больш за 24 гадзіны з часу паступленьня скаргі.

Такім чынам, падсумаваўшы выкладзенае, можна зрабіць некаторыя **падставовыя рэкамэндацыі** асобе, якая апынулася ў становішчы затрыманага і была дастаўленая ў міліцэйскі пастарунак:

1. Выберыце сабе пазыцыю па справе і дакладна яе прытрымлівайцеся. Вызначцеся, што вы прызнаяце і што адмаўляеце. Вызначцеся, ці будзеце вы даваць будзь-якія сьведчаньні да кансультацыі адваката.
2. У любым выпадку папрасіце міліцыянтаў, якія вас затрымалі, адрэкамэндавацца, назваць свае прозьвішчы і пасады. Папрасіце пісьмовыя прылады і запішыце атрыманыя зьвесткі.

3. Неадкладна ўдакладніце ваш статус (адміністрацыйна затрыманы альбо крымінальна затрыманы, сьведка, пацярпелы, падазроны, абвінавачаны) і падставы, на якіх вас затрымалі. Папрасіце паказаць вам тэкст адпаведнага артыкулу. Патрабуйце, каб пратакол затрыманьня быў складзены як мага раней. Калі пытаньне высьвятленьня вашага статусу зацягваецца – адмаўляйцеся ад будзь-якога супрацоўніцтва зь міліцыянтамі.

4. Патрабуйце, каб вас азнаёмілі з вашымі правамі ў пісьмовай форме. Калі нешта з вашых правоў вам не зразумела, патрабуйце дадатковых тлумачэньняў. Калі вам «забыліся» назваць права не даваць сьведчаньняў супраць сябе альбо права мець абаронцу – гэта вельмі кепская прыкмета. У гэтым выпадку тым больш варта ўстрымацца ад дачы сьведчаньняў і патрабаваць кансультацыі адваката.

5. Уважліва азнаёмцеся з тэкстам пратаколу, у прыватнасьці, уважліва паглядзіце на падставы затрыманьня (звычайна на тыпавым блянку падкрэсьліваецца нейкая падстава). Пераканайцеся, што ў пратаколе пастаўлены час фактычнага затрыманьня, а ня толькі час складаньня пратаколу. Усе свае заўвагі запісвайце ў пратакол. Калі вы ўжо напісалі нейкія заявы альбо скаргі – зрабіце пра гэта спасылку.

6. Незалежна ад таго, затрыманыя вы ў адміністрацыйным альбо ў крымінальным парадку, патрабуйце, каб вашым сваякам неадкладна паведамілі пра факт вашага затрыманьня і пра вашае месцазнаходжаньня. Міліцыянты абавязаныя гэта зрабіць.

7. Патрабуйце адваката. Калі вы ня маеце свайго адваката, патрабуйце кансультацыю ў дзяжурнага адваката. Лепей не даваць тлумачэньняў да сустрэчы з адвакатам, нават калі вы лічыце сябе абсалютна невінаватым. Калі ж вы сапраўды зьдзейсьнілі злачынства – асьцярожна размаўляйце зь дзяжурным адвакатам (ён можа быць падасланы). Важнае правіла: ніколі не пішыце добраахвотную адмову ад адваката.

8. Калі вы маеце прычыны супрацоўнічаць з праваахоўнымі органамі – будзьце чэсныя, але не ідзіце ў іх на повадзе. Уважліва чытайце ўсе пратаколы. Калі маюцца нейкія недакладнасьці – выпраўляйце іх, нават калі яны на першы погляд падаюцца неістотнымі. Паспрабуйце выгандляваць сабе нейкія льготы. У той жа час, не заключайце ўгодаў кшталту «Я ўсіх выдам, а вы адпусьціце мяне дахаты» – гэта кепска адаб'ецца ў будучым жыцьці.

10. Калі вы ня маеце намеру супрацоўнічаць зь сьледзтвам, зрабіце

наступную заяву: «Я невінаваты, ад дачы сьведчаньняў адмаўляюся да сустрэчы з адвакатам, тлумачэньні буду даваць толькі ў прысутнасьці адваката». Гэтая заява запісваецца ў пратакол. Чытайце ўсе пратаколы і дакумэнты, што ствараюцца міліцыянтамі, але ад падпісаньня можаце адмовіцца (часта падпісаныя з гарачкі быццам бы бяскрыўдныя пратаколы пасьля былі асноўным доказам абвінавачаньня). Калі вы ня можаце адэкватна ацаніць вартасьці пратаколу – адмоўцеся ад яго падпісаньня альбо зрабіце запіс: «З тэкстам пратаколу азнаёмлены, але цалкам нязгодны».

## Як абскарджваць незаконныя дзеяньні ў крымінальным працэсе

Скарга на рашэньні і дзеяньні сьледчага адрасуецца раённаму пракурору. Скарга на рашэньні і дзеяньні пракуратуры накіроўваецца вышэйстаячаму пракурору, а на рашэньні і дзеяньні суду – у вышэйстаячы суд. Калі вы ня ведаеце, каму падаваць скаргу, – аднясіце яе таму, на каго вы скардзіцеся. Гэтая службовая асоба абавязаная на працягу 24 гадзінаў перадаць скаргу па прызначэньні.

Што можна абскарджваць? Усё: затрыманьне і заключэньне пад варту, асабісты дагляд і парушэньні, дапушчаныя пры ўсіх іншых сьледчых дзеяньнях, адмову аформіць пратакол і адмову ў магчымасьці прыкласьці да пратаколу тлумачэньні. Можна абскарджваць фальсыфікацыю вашых сьведчаньняў, псыхалягічны ціск з боку сьледчага і міліцыянтаў, мат, крык, пагрозы і шантаж. Можна напісаць скаргу на тое, што сьледчы паліў у вашай прысутнасьці, не адпускаў у прыбіральню, казаў грубыя жарты.

- Скарга можа быць і вуснай, аднак лепей – у пісьмовай форме. Абавязкова патрабуйце паведаміць пра вынікі разгляду вашай скаргі таксама ў пісьмовым выглядзе.

- Можна скарыстацца і «Кнігай заўвагаў і прапановаў» пракуратуры альбо сьледчага ўпраўленьня – туды можна пісаць скаргі таксама.

## Адміністрацыйнае затрыманьне

Усё вышэй выкладзенае адносіцца да затрыманьня грамадзяніна ў рамках крымінальнага працэсу. Разам з тым існуе так званае адміністрацыйнае затрыманьне. У дадзены момант парадак прыцягненьня да адміністрацыйнае адказнасьці і азначэньні ўсіх відаў адміністрацыйных правапарушэньняў замацаваныя ў Кодэксе аб

адміністрацыйных правапарушэньнях (КаАП), што быў прыняты яшчэ за Саветамі, у 1984 годзе. Зразумела, што з таго часу вельмі зьмяніліся і грамадзкія адносіны, і прававая база, таму шмат па якіх пазыцыях гэты кодэкс зьяўляецца састарэлым.

У адпаведнасьці з артыкулам 239 КаАП у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, у мэтах стрыманьня адміністрацыйных правапарушэньняў, калі вычарпаны іншыя меры ўзьдзеяньня; устанаўленьня асобы; складаньня пратаколу аб адміністрацыйным правапарушэньні пры немагчымасьці складаньня яго на месцы, калі складаньне пратаколу зьяўляецца абавязковым; забесьпячэньня своечасовага і правільнага разгледжаньня справаў і выкананьня пастаноў па справах аб адміністрацыйных правапарушэньнях дапускаецца адміністрацыйнае затрыманьне асобаў, асабісты дагляд, дагляд рэчаў і адабраньне рэчаў і дакумэнтаў.

Як правіла, удзельнікі палітычных акцыяў – мітынгаў, шэсьцяў, пікетаў, дэманстрацыяў – затрымліваюцца менавіта з спасылкаю на адпаведныя артыкулы адміністрацыйнага кодэксу. Да таго ж неканкрэтнасьць вышэйзгаданага артыкулу 239, наяўнасьць у ім фармулёвак тыпу «калі вычарпаныя іншыя меры ўзьдзеяньня», «пры немагчымасьці складаньня пратаколу на месцы» дазваляюць органам ужываць яго вельмі шырока, тлумачачы «размытыя» азначэньні ў сваю карысьць.

Далей згодна з артыкулам 240 КаАП аб адміністрацыйным затрыманьні павінен складацца пратакол, у якім указваюцца: дата і месца складаньня; пасада, прозьвішча, імя і імя па бацьку асобы, якая складае пратакол; інфармацыя пра асобу затрыманага; час, месца і падставы затрыманьня. Пратакол падпісваецца службовай асобай, якая яго складала, і затрыманым. У выпадку адмовы затрыманага ад падпісаньня пратаколу, у ім робіцца запіс пра гэта. На просьбу асобы, затрыманай за ўчыненьне адміністрацыйнага правапарушэньня, аб месцы яго знаходжаньня павінны быць папярэджаны яго сваякі, адміністрацыя па месцы працы ці навучаньня. Аб затрыманьні непаўналетняга абавязкова павінны быць папярэджаны яго бацькі ці асобы, якія іх замяняюць.

*Хто мае права рабіць адміністрацыйнае затрыманьне?* Згодна з артыкулам 241 КаАП адміністрацыйнае затрыманьне асобы, якая ўчыніла адміністрацыйнае правапарушэньне, можа адбывацца толькі органамі (службовымі асобамі), упаўнаважанымі на тое заканадаў-

ствам. У прыватнасьці, затрымліваць асобаў пры ўчыненьні таго ж злоснага непадпарадкаваньня законнаму распараджэньню ці патрабаваньню работніка міліцыі, народнага дружыньніка, а таксама ваеннаслужачага, пры парушэньні парадку арганізацыі і правядзеньня сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў ці дэманстрацыяў маюць права толькі органы ўнутраных спраў (міліцыі), а не якія-небудзь невядомыя асобы ў цывільным або ахоўнікі прэзыдэнта.

Артыкул 242 КаАП кажа, што адміністрацыйнае затрыманьне асобы, якая ўчыніла адміністрацыйнае правапарушэньне, можа цягнуцца **ня больш за тры гадзіны.** У той самы час частка 3 згаданага артыкулу для палітычна актыўных грамадзян – асобаў, якія парушаюць парадак арганізацыі і правядзеньня сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў і дэманстрацыяў, разам зь некаторымі іншымі парушальнікамі – дробнымі хуліганамі, дробнымі спэкулянтамі – прадугледжвае магчымасьць затрыманьня да разгледжаньня справы судзьдзём. На практыцы атрымліваецца, што асоба, затрыманая, напрыклад, у суботу ці нядзелю, утрымліваецца ў якасьці адміністрацыйнага затрыманага да панядзелка, калі матэрыял можа быць разгледжаны ў працоўны дзень судзьдзём. Тэрмін адміністрацыйнага затрыманьня адлічаецца з моманту дастаўкі парушальніка для складаньня пратаколу. Гэты тэрмін надалей можа быць залічаны ў час адбываньня адміністрацыйнага арышту.

**Адміністрацыйнай адказнасьці падлягаюць асобы, якія дасягнулі 16 гадоў.** Гэта ня значыць, што міліцыя ня можа затрымліваць асобаў малодшага ўзросту пры зьдзяйсьненьні імі адміністрацыйных правапарушэньняў, але гэтая працэдура ня можа быць, уласна кажучы, вызначаная як адміністрацыйнае затрыманьне ў поўным сэнсе гэтага слова. Калі міліцыя даставіла ў пастарунак асобаў, малодшых за 16 гадоў, яны павінны быць перададзеныя бацькам.

Такім чынам, адміністрацыйнаму затрыманьню падлягаюць толькі тыя грамадзяне, якія падазраюцца ў зьдзяйсьненьні правапарушэньня ці ня маюць пасьведчаньня асобы. На практыцы нават пасьля паказу пашпарта і пры адсутнасьці прыкметаў правапарушэньня міліцыя можа палічыць, што пашпарт выглядае як падробны, і затрымаць вас дзеля высьвятленьня асобы. Такая практыка зьяўляецца незаконнай, паколькі супярэчыць закону «Аб міліцыі» і дазваляе службовым асобам беспадстаўна затрымліваць усіх, каго яны захочуць затрымаць. Таму па такіх выпадках абавязкова трэба пісаць скаргі ў пракуратуру, у суд.

Важны момант: затрыманы павінен разумець, што яго затрымлівае тая асоба, якая мае на гэта права. Таму абавязкова трэба патрабаваць ад міліцыянтаў, каб яны адрэкамэндаваліся па форме, гэта значыць назвалі сваё імя, прозьвішча і званьне – потым гэтыя дадзеныя могуць спатрэбіцца затрыманаму пры напісаньні скаргі. Да таго ж, міліцыянты зазвычай не адважваюцца на відавочна проціпраўныя дзеяньні ці збіцьцё затрыманага, калі затрыманы ведае іх прозьвішчы ды можа напісаць на іх скаргу. Асоба, якую затрымліваюць, таксама мае права патрабаваць паказу службовага пасьведчаньня, калі затрыманьне робіць супрацоўнік у цывільным. Міліцыя мае права затрымліваць за дробнае хуліганства, парушэньне парадку арганізацыі масавых акцыяў, за непадпарадкаваньне патрабаваньню супрацоўніка міліцыі і за іншыя правапарушэньні, пералічаныя ў пункце 1 артыкулу 241 КаАП. Таксама маюць права затрымліваць за асобныя правапарушэньні супрацоўнікі КДБ, памежных войскаў, мытні, ваенізаванай аховы. Але трэба асобна адзначыць, што большасьць органаў, якія маюць права складаць пратаколы і разглядаць адміністрацыйныя справы, па сутнасьці ня маюць права затрымліваць правапарушальнікаў (напрыклад, супрацоўнікі дзяржаўнага газавага нагляду, падатковых органаў, санітарнай інспэкцыі, прадпрыемстваў і арганізацыяў, судзьдзі). Аднак далей мы будзем казаць пра затрыманьне супрацоўнікамі міліцыі, паколькі міліцыянтам дадзеныя найбольш шырокія паўнамоцтвы ў сфэры адміністрацыйнага затрыманьня ў мэтах аховы грамадзкага парадку.

Міліцыянты абавязаны растлумачыць затрыманаму матывы затрыманьня. На жаль, гэтая норма трактуецца нашымі судамі такім чынам, што часам міліцыянт можа сказаць затрыманаму: «Вы затрыманыя за правапарушэньне», – і гэтага будзе дастаткова. У кожным выпадку, пры затрыманьні трэба патрабаваць ад міліцыянтаў, каб яны растлумачылі, за што вас затрымліваюць.

Пры затрыманьні, у адпаведнасьці з артыкулам 243 КаАП, супрацоўнікі міліцыі і некаторых іншых органаў маюць права правесьці асабісты дагляд затрыманага і дагляд ягоных рэчаў, багажу. **Асабісты дагляд робяць асобы таго ж полу ў прысутнасьці двух панятых адпаведнага полу** – запрашэньне панятых на дагляд адміністрацыйна затрыманага зьяўляецца ў Беларусі выключэньнем. Часьцей за ўсё апошняе патрабаваньне закону беспадстаўна ігнаруецца – такія выпадкі трэба адлюстроўваць у пратаколе дагляду, што робіць сам дагляд і яго

вынікі незаконнымі. Часта міліцыянты запрашаюць панятымі іншых міліцыянтаў альбо затрыманых грамадзянаў – але ў іх можа быць зацікаўленасьць у вашай справе, таму ім трэба заяўляць адвод. Папрасіце панятых адрэкамэндавацца і азнаёмцеся зь іх пашпартнымі дадзенымі. Калі ў якасьці панятых запрашаюцца затрыманыя, пашпартоў у іх хутчэй за ўсё ня будзе – на гэтай падставе можна заявіць адвод, таксама як заяўляецца адвод панятым – не грамадзянам Беларусі і панятым у нецьвярозым стане.

Можна зрабіць заяву пра тое, што вы згодныя на дагляд толькі ў прысутнасьці адваката – хутчэй за ўсё, дагляду вас усё ж такі падвергнуць, аднак гэткае хадайніцтва можа сьведчыць на вашу карысьць. Дагляд рэчаў павінен па магчымасьці адбывацца ў прысутнасьці іх уладальніка, акрамя выпадкаў, якія ня церпяць адкладаньня. Аб даглядзе складаецца асобны пратакол альбо робіцца адпаведны запіс у пратаколе затрыманьня ці ў пратаколе аб адміністрацыйным правапарушэньні. Міліцыянты вельмі часта не адлюстроўваюць факт асабістага дагляду затрыманага ў пратаколах, хоць сам дагляд робіцца ў 90 адсотках выпадкаў. Артыкул 244 КаАП дазваляе службовым асобам рабіць адабраньне рэчаў, якія зьяўляюцца сродкам зьдзяйсьненьня правапарушэньня альбо непасрэдным аб’ектам правапарушэньня. Аб гэтым складаецца пратакол альбо робіцца адпаведны запіс у іншых пратаколах.

Калі нейкія рэчы (сумка, паліто і інш.) вы хоць на хвіліну пакінулі па-за полем зроку, абавязкова зьвярніце на гэта ўвагу панятых і папрасіце адзначыць у пратаколе: «Да моманту правядзеньня агляду мой заплечнік знаходзіўся па-за полем майго зроку на працягу 1 хвіліны». Калі падчас агляду вы пабачылі незнаёмыя для вас прадметы (нават на першы погляд бяскрыўдныя) – **ні ў якім разе не дакранайцеся да гэтых рэчаў.**

Асобны артыкул КаАП рэгулюе затрыманьне і прымусовае адбуксаваньне транспартнага сродку зь месца зьдзяйсьненьня адміністрацыйнага правапарушэньня на стаянку, што ахоўваецца, – артыкул 244-1. Таксама міліцыі дадзена права на дагляд аўтатранспартнага сродку – пра гэта складаецца асобны пратакол. Калі чалавек падазраецца ў кіраваньні аўтамабілем у стане алькагольнага ап’яненьня, супрацоўнікі ДАІ маюць права правесьці мэдыцынскі агляд ці адабраць у правапарушальніка правы кіроўцы.

Галоўнае правіла паводзінаў пры затрыманьні – **трымаць сябе вет-**

**ліва і карэктна**. Калі затрыманы пачне аказваць супраціў – гэта стане падставай для выкарыстаньня спэцсродкаў (кайданкі, дубінкі, фізычнае ўзьдзеяньне) і прыцягненьня да крымінальнай ці адміністрацыйнай адказнасьці за супраціў ці непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі. Таму калі вы адчуваеце сябе невінаватым – лепей не супраціўляцца, а ветліва даведацца, хто вас затрымлівае (найлепей запісаць прозьвішча і пасаду), папрасіць растлумачыць вам падставы затрыманьня і вашыя правы як затрыманай асобы. Калі вы маеце пры сабе забароненыя рэчы – паспрабуйце незаўважна іх выкінуць.

Пры дастаўцы ў пастарунак уважліва сачыце, каб вам не падкінулі нічога ў кішэні альбо ў заплечнік.

Калі вы лічыце, што пры вашым затрыманьні былі парушаны нормы закону – можаце скарыстаць законныя тры гадзіны для напісаньня скаргі старшыні РУУС, пракурору, у суд (скарга на незаконныя дзеяньні супрацоўніка міліцыі).

## Што рабіць, калі патрабуюць паказаць дакумэнты

*«Лейтэнант Крываручка, вашы дакумэнцікі!»*

Перш за ўсё трэба пераканацца, што перад вамі супрацоўнікі міліцыі – папрасіце іх паказаць дакумэнты. Калі гэта не супрацоўнікі міліцыі, а нейкая пазаведамасная ахова ці нейкі звычайны чыноўнік – вы маеце права не падпарадкоўвацца і не паказваць свае дакумэнты. Не саромцеся перапісаць дадзеныя з пасьведчаньняў міліцыянтаў, што вас затрымліваюць. Цяпер міліцыянты звычайна маюць нешта накшталт бэджа на грудзях, таму гэта можна зрабіць прасьцей, чым раней. Надалей гэтыя зьвесткі могуць вам спатрэбіцца, у тым ліку – для абскарджаньня.

Часьцей за ўсё пасьля паказу пашпарта з прапіскай у тым жа горадзе цікаўнасьць міліцыянтаў да вас зьнікне. У скрайнім выпадку папросяць расхінуць палітон і адчыніць сумку – ня болей. Калі ж вы прапісаныя ў іншым горадзе, то міліцыянты пацікавяцца мэтай візыту ў гэты горад. Тут можна адмовіцца даваць інфармацыю, а можна прывесьці нейкую простую падставу (да сваякоў, турызм, бізнэс і г. д.). Ува ўсякім разе, гэта ня можа быць падставай для вашага затрыманьня: асоба вашая ўстаноўленая, аніякіх адміністрацыйных правапарушэньняў вы ня зьдзейсьнілі.

Аднак нават калі вы маеце пры сабе пашпарт і паказалі яго на патра-

баваньне міліцыянта, ня думайце, што гэта ўратуе вас ад затрыманьня для «высьвятленьня асобы», бо мянты могуць раптам знайсьці на вашым пашпарце сьляды падробкі. Гэтыя сьляды зьнікнуць толькі пасьля таго, як вас даставяць у мянтоўку і пратрымаюць там тры гадзіны – аднак пасьля гэтага ў іх могуць зьявіцца да вас некаторыя іншыя прэтэнзіі (абвінавацяць у знаходжаньні ў нецьвярозым стане, падкінуць вам наркотыкі ці інш.). Таму, калі міліцыянт, трымаючы ў руках ваш пашпарт (і не аддаючы яго вам!), кажа, што вы затрыманыя, вы павінны спытаць падставы для затрыманьня. Калі вас абвінавачваюць у правапарушэньні альбо ў злачынстве – вам трэба падпарадкавацца. Калі ж міліцыянт кажа: «Я затрымліваю вас для высьвятленьня асобы», – адзначце, што ў яго ў руках галоўны дакумэнт, які пацьвярджае вашую асобу як грамадзяніна Беларусі, і адзначце, што вы будзеце пісаць скаргу на неабгрунтаванае затрыманьне. Часьцяком на гэтым размовы пра пастарунак заканчваюцца. Аднак калі мент настойвае – трэба падпарадкавацца, не аказваць супраціву і не даваць падставаў для выкарыстаньня супраць вас спэцыяльных сродкаў і фізычнай сілы.

Калі вас абвінавачваюць у знаходжаньні ў грамадзкім месцы ў нецьвярозым стане – патрабуйце правядзеньня мэдычнага агляду.

Так што заўжды існуе імавернасьць, што пасьля праверкі вашага пашпарта вам скажуць: «Пройдёмте», – і вы апынецеся ў становішчы адміністрацыйна затрыманага. Калі пры гэтым вы не адзін, то найлепей перадаць калегу ўсе свае каштоўныя рэчы, грошы і г. д. Затым, даведаўшыся, куды вас павядуць, папрасіце знаёмага пайсьці з вамі альбо зьвязацца з вашымі сваякамі, а яшчэ лепей, калі вы адчуваеце небясьпеку, – адразу пашукаць адваката.

У мянтоўке варта пачынаць з складаньня скаргі на ўжо вядомага вам міліцыянта на неабгрунтаванае затрыманьне.

## Што рабіць у пастарунку пры адміністрацыйным затрыманьні

Пасьля дастаўкі затрыманага ў пастарунак міліцыянты абавязаныя неадкладна прыступіць да складаньня пратаколу аб адміністрацыйным правапарушэньні, пратаколу аб затрыманьні і іншых прадугледжаных заканадаўствам пратаколаў.

Супрацоўнікі міліцыі на патрабаваньне затрыманага абавязаныя паведаміць ягоным родным пра яго месцазнаходжаньня (ч. 2 арт. 240),

але звычайна яны гэтага ня робяць. Справа ў тым, што затрыманыя звычайна патрабуюць даць ім патэлефанаваць дадому, але такога права закон ім не дае. Да таго ж міліцыянты не абавязаныя з уласнай ініцыятывы тэлефанаваць родным затрыманага – неабходна патрабаваньне самога затрыманага. А затрыманы, ня ведаючы пра гэтую акалічнасьць, ня ведаючы сваіх правоў, ня можа сфармуляваць сваё патрабаваньне дакладным чынам. Гэты прыклад паказвае, наколькі важна для затрыманага ведаць свае правы. І закон патрабуе ад міліцыянтаў, каб яны яму гэтыя правы растлумачылі, у прыватнасьці паведамілі пра зьмест артыкулу **247 КаАП «Правы і абавязкі асобы, якая прыцягваецца да адміністрацыйнае адказнасьці».**

У выпадку затрыманьня непаўналетняга (асобы, малодшай за 18 гадоў) бацькі абавязкова паведамляюцца неадкладна. **Непаўналетніх вызваляюць праз 3 гадзіны**, перадаюць іх бацькам – празь іх магчыма накіраваць на волю паведамленьне, замовіць адваката. Асобы ад 16 да 18 гадоў таксама вызваляюцца, але гэта не пазбаўляе іх ад прыцягненьня да адміністрацыйнае адказнасьці – іх справы разглядаюцца камісіяй па справах непаўналетніх пры мясцовых органах выканаўчае ўлады.

Калі вы – правапарушальнік, памятайце, што ўсё, што вы скажаце, можа быць выкарыстана супраць вас. Вы маеце права зусім **адмовіцца ад дачы тлумачэньняў**. Калі вас прымушаюць пісаць нейкія «тлумачальныя» – вы маеце права ад гэтага адмовіцца і ўвогуле нічога не тлумачыць. Будзьце гатовыя да брудных дзеяньняў і шантажу з боку міліцыянтаў. Часьцяком яны выкарыстоўваюць падман – абяцаюць адпусьціць у абмен на дачу сьведчаньняў. Будзьце пільныя, улічвайце магчымасьць правакацыяў з боку міліцыянтаў: яны могуць падкінуць зброю, патроны, наркотыкі альбо фальшывыя грошы.

Калі вас абвінавачваюць у тым, што вы знаходзіцеся ў нецьвярозым стане, – патрабуйце мэдычнага агляду.

Калі ў вас адбіраюць мабільны тэлефон – абавязкова адключайце яго.

Падчас знаходжаньня ў пастарунку (а таксама і пазьней – у месцы ўтрыманьня падчас адміністрацыйнага арышту) вы можаце сутыкнуцца з «калегамі» – людзьмі, якія таксама апынуліся ў складанай сытуацыі, просяць падтрымкі, парады, спачуваньня, цікавяцца вашай справай… Ім можна спачуваць, але ня варта казаць ім таго, што вы палічылі непатрэбным казаць міліцыянтам.

Запамінайце альбо запісвайце прозьвішчы і пасады людзей, зь якімі вы размаўляеце ў пастарунку, нумары кабінэтаў. Калі вас пакідаюць аднаго ў пакоі на працяглы час – ня думайце, што да вас страчаная цікавасьць: «забыць» пра чалавека на час адміністрацыйнага затрыманьня – сродак псыхалягічнага ціску перад складаньнем пратаколу.

У пратаколе затрыманьня мусяць быць пазначаныя: дата і месца напісаньня, пасада і прозьвішча асобы, што складае пратакол, час, месца і падставы затрыманьня, зьвесткі аб правапарушальніку. Пратакол падпісваецца тым, хто яго складаў, і даецца на подпіс затрыманаму.

Пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні – галоўны дакумэнт у адміністрацыйным працэсе, бо менавіта ён будзе разглядацца органам, упаўнаважаным разглядаць адміністрацыйную справу і выносіць рашэньне аб вінаватасьці альбо невінаватасьці правапарушальніка. Таму яго таксама трэба чытаць вельмі ўважліва. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на графу «падстава затрыманьня», прозьвішчы сьведкаў і міліцыянтаў, назву і нумар артыкулу КаАП ці назву іншага нарматыўнага акту, на які робіцца спасылка. На жаль, беларускае заканадаўства не дае правапарушальніку адназначнага права атрымаць копію пратаколу, але ніхто ня можа вам забараніць чытаць яго марудна, запамінаць, рабіць выпіскі. **У пратаколе ёсьць асобная графа, у якой правапарушальнік можа выкласьці свае заўвагі.** Калі яе не хапае для вашых тлумачэньняў – пішыце на асобным аркушы, але абавязкова трэба адзначыць у пратаколе, што вашыя тлумачэньні маюць працяг у дадатку. Ні ў якім разе ня варта пагаджацца на прапановы міліцыянтаў выкласьці свае заўвагі ў асобнай заяве – яна можа «згубіцца». Калі вы ведаеце сьведкаў, якія могуць даць зьвесткі на вашую карысьць, – варта пазначыць і іх імёны. Яшчэ пажадана пасьля заканчэньня сваіх тлумачэньняў перакрэсьліць радкі, якія засталіся, каб не было магчымасьці туды нешта дапісаць. Усе надпісы трэба, натуральна, рабіць не алоўкам, а асадкай.

Пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні складаецца пасьля пратаколу затрыманьня і павінен адлюстроўваць, згодна з артыкулам 235 КаАП: час і месца напісаньня, пасаду і прозьвішча асобы, якая склала пратакол, зьвесткі пра асобу правапарушальніка, час, месца і сутнасьць правапарушэньня, нарматыўны акт, які прадугледжвае адказнасьць за гэтае правапарушэньне, прозьвішчы і адрасы сьведкаў і пацярпелых, калі яны ёсьць, тлумачэньні правапарушальніка. Могуць запісвацца і іншыя зьвесткі, у тым ліку іх можа запісваць і сам права-

парушальнік. Пастанова Пленуму Вярхоўнага Суду № 1 ад 25 сакавіка 1999 г. «Аб практыке выкарыстаньня судамі заканадаўства, якое рэгулюе вытворчасьць па справах аб адміністрацыйных правапарушэньнях» адзначае, што нядбайна складзеныя пратаколы (у якіх ня ўказаны зьвесткі аб часе і сутнасьці адміністрацыйнага правапарушэньня, нарматыўны акт, які прадугледжвае адказнасьць за яго, альбо калі пратакол складзены неўпаўнаважанай асобай ці калі грамадзяніну не растлумачаныя ягоныя правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 247 КаАП) ня могуць быць падставай для прыцягненьня да адміністрацыйнае адказнасьці – іх належыць скіраваць на дапрацоўку.

Таму часам бывае выгадным, заўважыўшы нейкія хібы ў пратаколе, не рабіць на гэта заўвагаў адразу пры складаньні пратаколу, а выказаць іх на судзе – і гэта будзе важкім аргумэнтам на вашую карысьць. Судзьдзя накіруе пратакол назад у пастарунак на дапрацоўку, але час дапрацоўкі пратаколу не прыпыняе тэрміну даўнасьці прыцягненьня да адміністрацыйнае адказнасьці. Гэта азначае, што, пакуль міліцыя выпраўляе пратакол, два месяцы, адведзеныя для вашага асуджэньня, ідуць, і міліцыя можа проста не пасьпець зрабіць усё як сьлед. Але калі вы хочаце скарыстацца такім прыёмам, абавязкова выкажыце сваю нязгоду з пратаколам у графе «тлумачэньні». Запішыце: «З пратаколам няз годны», але не ўдакладняйце, з чым менавіта вы ня згодныя.

Пасьля таго як правапарушальнік азнаёміцца з пратаколам, яму прапануюць яго падпісаць. Часам можна пачуць словы пра тое, што пратаколу, зь якім правапарушальнік ня згодны, падпісваць ня варта – маўляў, тым самым асоба прызнае сябе вінаватай. На наш погляд, падпісаньне пратаколу – гэта важная гарантыя выкананьня правоў асобы, якая прыцягваецца да адміністрацыйнай адказнасьці. Калі чалавек адмаўляецца падпісаць, напрыклад, пратакол аб затрыманьні – яго фактычна можна затрымліваць бясконца, проста перапісваючы пратакол і зьмяняючы там час затрыманьня. А вось калі пратакол падпісаны, зрабіць такое будзе цяжэй. Таму нават калі вы абсалютна ня згодныя зь зьместам пратаколу – выкажыце сваю нязгоду ў самім пратаколе, растлумачце матывы адмовы ад падпісаньня пратаколу, напішыце: «Вінаватым сябе не лічу, ад падпісаньня пратаколу адмаўляюся». Дарэчы, працэдура адмовы ад падпісаньня пратаколу патрабуе, каб міліцыянты выклікалі панятых і зафіксавалі гэты факт асобным запісам у пратаколе – гэта заўжды патрабуе некаторага часу і дадатко-

вых клопатаў. Таму міліцыянты пагражаюць затрыманым, кажуць, што яны абавязаныя падпісаць пратакол. Але **адмова ад падпісаньня пратаколу – права кожнага затрыманага.**

Калі вы хвалюецеся і ня можаце адэкватна ацаніць вартасьці пратаколу, ня ведаеце, ці правільна ён складзены, таксама можна зрабіць запіс: «З пратаколам цалкам ня згодны»,– і толькі пасьля падпісаць яго.

Сачыце за тым, каб пратакол адлюстроўваў дзеяньні міліцыі. Напрыклад, калі ў пратаколе ёсьць запіс «Правапарушальніку растлумачаны ягоныя правы і абавязкі ў адпаведнасьці з арыкулам 247 КаАП» – так і павінна быць зроблена на самай справе. Калі вас зьбівалі ці рабілі вам асабісты дагляд – запішыце пра гэта ў пратаколе.

Затрыманы мае права азнаёміцца з матэрыяламі справы, у тым ліку зь відэаматэрыяламі, і даць адносна іх пісьмовыя тлумачэньні, прыводзіць доказы, хадайнічаць аб выкліканьні сьведкаў – пра гэта лепей указаць у пратаколе. Але вы можаце ўсё гэта рабіць і непасрэдна падчас суду.

На практыцы падчас масавых палітычных акцыяў і, адпаведна, масавых затрыманьняў часьцей за ўсё затрыманьні ажыцьцяўляюцца шляхам «хапуна». У гэтым выпадку ў РУУС пачынае працаваць «канвэер»: адзін затрымлівае, другі піша рапарт, трэці піша пратакол затрыманьня, чацьвёрты – пратакол аб правапарушэньні. Тут значна ўзрастае імавернасьць памылак, і гэтым трэба карыстацца – сачыце за недакладнасьцямі ў дакумэнтах, якія складаюць міліцыянты. Гэта потым можа вам спатрэбіцца падчас суду.

Калі ў вас забралі рэчы, дакумэнты, грошы – патрабуйце складаньня пратаколу адабраньня альбо адлюстраваньня факту адабраньня ў пратаколе затрыманьня. Копія акту адабраньня павінна быць выдадзеная правапарушальніку. Як мы ўжо адзначалі вышэй, менавіта пры афармленьні гэтай працэдуры міліцыянты дапускаюць болей за ўсё парушэньняў закону. Сачыце за тым, каб забраныя рэчы апісваліся дакладна і падрабязна, напрыклад, каб у купюраў указваўся намінал і нумар – гэта важна, паколькі ніякі рэчавы доказ не зьнікае ў міліцыі так часта, як грошы. Аднак, на наш погляд, міліцыя ўвогуле ня мае права адбіраць у людзей іх прыватныя рэчы, паколькі КаАП дазваляе адабраньне толькі тых рэчаў, якія зьяўляюцца сродкам зьдзяйсьненьня правапарушэньня альбо непасрэдным аб'ектам правапарушэньня. Хіба ж можна аднесьці да гэткіх аб'ектаў асадкі, гадзіньнікі, нататнікі, грошы?

Артыкул 242 КаАП дазваляе ўтрымліваць людзей і болей за 3 гадзіны – за парушэньне парадку правядзеньня мітынгаў, дробнае хуліганства і іншыя правапарушэньні, за якія ў якасьці меры адміністрацыйнага спагнаньня прадугледжаны адміністрацыйны арышт, – да разгляду справы ў судзе, але ня больш за 3 дні. У гэтым выпадку вас могуць перавесьці з памяшканьня для затрыманых у спэцпрыёмнік-разьмеркавальнік (у Менску – на вул. Акрэсьціна). Такім чынам, калі вас затрымалі ў пятніцу – будуць трымаць да панядзелка, паколькі ў суботу і нядзелю суд не працуе. Фактычна пытаньне пра тое, адпускаць ці не канкрэтнага чалавека да разгляду справы судом, вырашаецца начальнікам аддзелу міліцыі, які накіроўвае «адміністрацыйны матэрыял» таму органу, які павінен яго разглядаць.

Усе факты парушэньняў падчас складаньня пратаколу, дагляду і адабраньня рэчаў можна абскарджваць старшыні РУУС, пракурору, у суд. Калі падчас затрыманьня ці падчас знаходжаньня ў пастарунку вас зьбівалі і вы атрымалі пашкоджаньні – зафіксуйце іх, вазьміце даведку ў бліжэйшай мэдычнай установе. Памятайце, што калі вам зрабілася кепска – міліцыянты абавязаныя выклікаць «хуткую дапамогу».

## Што рабіць пры разглядзе адміністрацыйнай справы

Справы аб адміністрацыйных правапарушэньнях разглядае альбо суд ніжэйшага ўзроўню (у раённых судах звычайна ёсьць два ці тры судзьдзі па адміністрацыйных справах і выканаўчай вытворчасьці), альбо іншыя органы, пералічаныя ў разьдзеле 6 КаАП: адміністрацыйныя камісіі пры выканаўчых камітэтах і яшчэ каля 50 відаў дзяржаўных органаў і іх службовых асобаў. Звычайна справа разглядаецца па месцы зьдзяйсьненьня правапарушэньня.

Пастанова аб прыцягненьні да адміністрацыйнай адказнасьці можа быць вынесена судом ці іншым органам толькі на працягу двух месяцаў з моманту зьдзяйсьненьня правапарушэньня. Але памятайце, што гэты тэрмін дадзены заканадаўствам на ўсе стадыі адміністрацыйнага працэсу. Таму вас могуць выклікаць у суд на працягу 2 месяцаў нават тады, калі вас не затрымлівалі, не складалі аніякіх пратаколаў і ўвогуле, здавалася б, ніхто не падазраваў вас у зьдзяйсьненьні правапарушэньня.

Справы аб адміністрацыйных правапарушэньнях слухаюцца адкрыта – гэта значыць у судзе ці любым іншым органе мае права прысутнічаць любы грамадзянін. На практыцы судзьдзя пытаецца ў прысут-

ных: «хто вы?» Няхай вашыя знаёмыя адказваюць, што яны – публіка. На суд абавязкова трэба запрашаць знаёмых ці сьведкаў. На жаль, часьцяком працэсы па адміністрацыйных справах адбываюцца ў цесных пакойчыках, дзе няма магчымасьці зьмясьціць шмат публікі, але ў любым выпадку трэба прадухіліць правядзеньне закрытага працэсу.

Паводле агульнага правіла, усе справы аб адміністрацыйных правапарушэньнях павінны разглядацца ў прысутнасьці правапарушальніка. Разгляд справы ў ягоную адсутнасьць дазваляецца толькі тады, калі ёсьць зьвесткі пра тое, што яму своечасова паведамілі пра час і месца разгляду справы – гэта значыць калі яму ўручаная позва пад подпіс. Але адміністрацыйныя справы па артыкулах, пералічаных у частцы 2 артыкулу 247 КаАП, разглядаюцца выключна ў прысутнасьці правапарушальніка (гэта, напрыклад, дробнае хуліганства, парушэньне парадку правядзеньня мітынгаў, дробны крадзёж, гандаль у непрызначаных месцах, паклёп, абраза, дзейнасьць ад імя незарэгістраваных аб’яднаньняў і інш.).

Затрыманы можа быць дастаўлены ў суд непасрэдна з РУУСу ці спэцразьмеркавальніку. Але ён можа быць вызвалены, а потым выкліканы ў суд позваю, якую ён павінен атрымаць пад подпіс ад супрацоўніка пошты ці ўчастковага. Калі грамадзянін ня зьявіцца без уважлівай падставы ў суд па справе, у якой прысутнасьць правапарушальніка абавязковая, то судзьдзя мае права аформіць прымусовы прывод. Ня трэба баяцца слова «прывод» – яно азначае толькі тое, што да вас дахаты прыйдзе міліцыянт і павядзе вас у суд.

Правапарушальнік мае права заявіць адвод судзьдзе – калі лічыць, што судзьдзя проста ці ўскосна зацікаўлены ў вырашэньні справы. Па палітычна матываваных справах адводы судзьдзе – рэч звычайная, але іх ніколі не задавальняюць.

Памятайце, што вы маеце права ў судзе **азнаёміцца з матэрыяламі справы** (гэта значыць перачытаць усё, што ёсьць у справе) і выкласьці ўсе магчымыя доказы ў сваю абарону: хадайнічаць аб выкліканьні сьведкаў, аб далучэньні да справы рэчавых доказаў і дакумэнтаў, прыцягнуць экспэртаў ці спэцыялістаў для правядзеньня, напрыклад, экспэртызы далучаных да справы фатаздымкаў. Гэта важна, бо калі вы ня зробіце гэтага – судовы працэс будзе праходзіць толькі ў адпаведнасьці з тымі матэрыяламі, якія дадуць супрацоўнікі міліцыі. На жаль, аб’ектыўнасьці ад нашых судоў чакаць ня варта – яны звычайна зараджа-

ныя на абвінавачаньне. Але часам, калі ў выніку добра пабудаванай абароны будзе даведзеная сумнеўнасьць абвінавачаньня, суд можа прыняць аб’ектыўнае рашэньне і апраўдаць невінаватую асобу.

Трэба карыстацца правам **апытваць сьведку** – правапарушальнік, калі справы ідуць «канвэерам», часам можа схапіць сьведкаў-міліцыянтаў на хлусьне: сьведкі даюць сьведчаньні паасобку, таму не пра ўсё яны могуць дамовіцца паміж сабой. Пры апытаньні сьведкаў (як з свайго боку, так і з боку міліцыянтаў) варта памятаць, што сьведкі па адміністрацыйных справах не нясуць адказнасьці за адмову ад паказаньняў і наўмысна скажоныя паказаньні. Гэтым можна скарыстацца на сваю карысьць.

Калі правапарушальнік адмаўляе сваю віну – у судзе абавязкова павінен весьціся пратакол судовага пасяджэньня.

Правапарушальнік мае права патрабаваць перакладніка і адваката. У апошні час улады выкарыстоўваюць незаконную практыку наступнага кшталту: калі падсудны патрабуе ў судзе адваката, які не прысутнічае ў залі, справу пераносяць на іншы тэрмін, але падсуднага не вызваляюць, а накіроўваюць назад у прыёмнік-разьмеркавальнік. Гэтыя дзеяньні ўладаў належыць прызнаць незаконнымі, антыканстытуцыйнымі: яны груба парушаюць правы асобы на абарону падчас судовага працэсу. Адзначым, што адвакат мае права ўдзельнічаць ня толькі ў разглядзе справы судом ці іншым органам, але і на іншых стадыях адміністрацыйнага працэсу, напрыклад падчас азнаямленьня правапарушальніка з матэрыяламі справы.

Замест адваката абарону правапарушальніка падчас разгляду справы ў судзе (альбо ў іншым органе, які ўпаўнаважаны разглядаць адміністрацыйную справу) можа ажыцьцяўляць **прадстаўнік – ім можа быць любы грамадзянін**. Калі правапарушальнік на пачатку працэсу заявіць, што «прысутны тут грамадзянін N будзе маім прадстаўніком» – суд, у адпаведнасьці з артыкулам 62 Канстытуцыі, ня мае права ў гэтым адмовіць. Пра гэта гаворыць пункт 5 пастановы Пленуму Вярхоўнага суду РБ «Аб практыке выкарыстаньня судом заканадаўства, што рэгулюе вытворчасьць па справах аб адміністрацыйных правапарушэньнях» (1999 г., № 1). Прадстаўнік павінен мець пашпарт. Прадстаўніку пажадана мець і копію згаданай пастановы Пленуму Вярхоўнага суду, каб даказаць слушнасьць вашага хадайніцтва. У якасьці прадстаўніка, калі ёсьць магчымасьць, варта запрасіць прад-

стаўніка праваабарончай арганізацыі альбо прадстаўніка любога зарэгістраванага грамадзкага аб’яднаньня, сябрам якога вы зьяўляецеся (дзеля гэтага адмыслова можна ўступіць у шэрагі гэтай арганізацыі).

Калі суд ці іншы ўпаўнаважаны орган не прызнае правапарушальніка вінаватым у зьдзяйсьненьні адміністрацыйнага правапарушэньня – справа спыняецца і лічыцца, што грамадзянін не прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасьці.

Калі суд ці іншы ўпаўнаважаны орган прызнае правапарушальніка вінаватым у зьдзяйсьненьні адміністрацыйнага правапарушэньня, яму адначасова прызначаецца адна зь мераў адміністрацыйнага спагнаньня: папярэджаньне, штраф альбо адміністрацыйны арышт. Папярэджаньне не выкарыстоўваецца ў адносінах да асобаў, якія прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасьці паўторна – гэта значыць на працягу году з таго часу, як у адносінах да іх была вынесеная іншая пастанова аб прызнаньні вінаватым у зьдзяйсьненьні адміністрацыйнага правапарушэньня.

Пастановы па артыкулах асаблівай часткі КаАП, за парушэньні якіх прадугледжаны адміністрацыйны арышт, можа выносіць толькі суд.

Калі вас прызналі правапарушальнікам – гэта значыць, што вы зьдзейсьнілі правіннасьць: наўмыснае ці неасьцярожнае дзеяньне альбо бязьдзеяньне, за якое прадугледжана адміністрацыйная адказнасьць. Гэтая адказнасьць можа быць зафіксавана і ў нейкім падзаконным акце, але ў рашэньні абавязкова павінна быць спасылка на артыкул КаАП, які хаця б спасылаецца на гэты падзаконны акт.

Пастанова аб накладаньні адміністрацыйнага спагнаньня павінна мець усе неабходныя рэквізыты ў адпаведнасьці з арыкулам 261 КаАП. Пастанова агучваецца асобе, у адносінах да якой яна вынесеная, а копія ўручаецца ёй на працягу трох дзён. Калі правапарушальнік не прысутнічаў падчас разгляду справы, копія пастановы высылаецца яму поштаю.

## Як абскарджваць пастановы аб адміністрацыйным правапарушэньні

Калі адміністрацыйную справу разглядае ня суд, а іншы дзяржаўны орган ці службовая асоба, прынятае рашэньне не зьяўляецца канчатковым, яно можа быць абскарджанае накіраваньнем у вышэйшы орган ці вышэйшай службовай асобе. Такое абскарджаньне прыпыняе выкананьне рашэньня па адміністрацыйнай справе. Скарга падаецца ў той

орган, які вынес рашэньне. Гэты орган альбо службовая асоба абавязаны перадаць скаргу ў орган, які правамоцны яе разглядаць. Дзяржаўная пошліна па гэтых скаргах не спаганяецца.

Больш эфэктыўным і пасьпяховым зьяўляецца **абскарджаньне рашэньня па адміністрацыйнай справе ў судзе.** Такім чынам можна абскарджваць любое рашэньне несудовага органу па адміністрацыйных справах, нават ня трэба карыстацца апісаным вышэй абскарджаньнем у вышэйшым несудовым органе. **Дзяржаўная пошліна па такіх скаргах невялікая** (ад 0,5 да 3 базавых адзінак), а эфэктыўнасьць абскарджаньня – вельмі высокая. Прынамсі, па справах, што ня маюць палітычнага падтэксту, судзьдзі вельмі часта адносяцца крытычна да матэрыялаў, якія падаюцца з боку міліцыі, яны спыняюць справу альбо накіроўваюць пратаколы на дапрацоўку. Такім чынам, напрыклад, калі асобу не задавальняе пастанова, прынятая адміністрацыйнай камісіяй выканкаму, найлепей не марнаваць час і не пісаць скаргу ў мясцовы выканаўчы камітэт, а адразу зьвяртацца ў суд. Тэрмін абскарджаньня – 10 дзён. Для напісаньня скаргі належным чынам мэтазгодна пракансультавацца ў мясцовай праваабарончай арганізацыі.

Калі ж вашая справа адразу была вырашаная судом – такое рашэньне зьяўляецца канчатковым і не падлягае касацыйнаму абскарджаньню. Але ў той жа час можна напісаць надзорную скаргу ў вышэстаячы суд, а потым – у Вярхоўны суд. Таксама надзорная скарга можа быць пададзеная ў раённую ці вышэйшую пракуратуру для апратэставаньня рашэньня. Такая скарга таксама не абавязкова прыпыняе выкананьне судовага рашэньня і не зьяўляецца эфэктыўным сродкам абскарджаньня.

Апошні сродак для абскарджаньня, калі вычарпаныя ўсе магчымыя шляхі для перагляду справы на нацыянальным узроўні, – можна паспрабаваць падаць скаргу ў Камісію па правах чалавека ААН.

## Выкананьне пастановы па справе аб адміністрацыйным правапарушэньні

Пастанова суду аб накладаньні адміністрацыйнага спагнаньня падлягае неадкладнаму выкананьню, паколькі яна набывае сілу з моманту абвяшчэньня. Але **тэрмін даўнасьці выкананьня – 3 месяцы.** Гэта значыць, што калі за тры месяцы пасьля яе абвяшчэньня выкананьне пастановы не пачалося – яна губляе сілу. Напрыклад, калі прынятая пастанова аб накладаньні адміністрацыйнага арышту не была выка-

наная на працягу трох месяцаў з моманту абвяшчэньня – яна ўжо ня можа быць выкананая.

Натуральна, што пастанова аб папярэджаньні не патрабуе нейкай асаблівай вытворчасьці дзеля яе выкананьня.

Калі прысуджаны адміністрацыйны штраф – **правапарушальніку даецца 15 дзён для добраахвотнага выкананьня пастановы і выплаты штрафу**. **У гэты час не дазваляецца ажыцьцяўленьне якіх-небудзь дзеяньняў па прымусовым спагнаньні штрафу**. Калі ў гэты 15-дзённы тэрмін судовы выканаўца спрабуе апісаць маёмасьць аштрафаванага – такія дзеяньні зьяўляюцца незаконнымі.

Невялікія адміністрацыйныя штрафы (якія накладаюцца на месцы правапарушэньня службовымі асобамі) могуць сплачвацца на месцы.

Асобам ува ўзросьце ад 16 да 18 гадоў таксама можа быць дадзены штраф, калі яны маюць уласныя крыніцы даходу. Але калі яны зьдзейсьнілі мелкае хуліганства, наўмыснае пашкоджаньне вайсковага білета ці няяўку ў ваенкамат – адміністрацыйны штраф накладаецца на бацькоў.

Памеры штрафаў вагаюцца ад 0,1 да 300 базавых адзінак, а для службовых асобаў – да 500 МЗП. Штраф выплачваецца праз банк пералікам грошай на адпаведны рахунак.

**Калі аштрафаваны не сплаціў грошы ў пятнаццацідзённы тэрмін – спагнаньне накладаецца на заробак** ці прыраўнаваны да заробку прыбытак (стыпэндыя, пэнсія і іншыя рэгулярныя даходы). Нават калі штраф складае 300 базавых адзінак, а стыпэндыя – 13 тысяч, штраф усё роўна павінен сплачвацца з стыпэндыі, нягледзячы на тое, што такімі тэмпамі спагнаньне будзе ажыцьцяўляцца шмат гадоў. Да заробку і іншых рэгулярных даходаў не прыраўноўваюцца разнастайныя кампэнсацыйныя выплаты, выхадныя, чарнобыльскія і дзіцячыя дапамогі. Спагнаньне штрафу выконвае на патрабаваньне судовага выканаўцы (які працуе пры судзе па месцы жыхарства аштрафаванага) бухгальтэрыя па месцы працы даўжніка ў адпаведнасьці з выканаўчым лістом. Скаргі на парушэньні ў дзеяньнях судовага выканаўцы можна падаваць і старшыні таго суду, пры якім працуе судовы выканаўца, і таму органу, які наклаў адміністрацыйнае спагнаньне.

З заробку правапарушальніка ў месяц нельга вылічваць больш за 20 % супольнага даходу (бярэцца ў разьлік сума пасьля выплаты падаткаў). Калі ж бухгальтар мае некалькі выканаўчых лістоў на аднаго чалавека, нават па адной справе, – дазваляецца вылічваць да 50%. На

практыцы судовы выканаўца ўлічвае тыя даходы, што ляжаць на паверхні, – калі чалавек працуе на некалькіх працах, цалкам магчыма, што судовы выканаўца, даведаўшыся пра адну крыніцу даходу, ня стане шукаць іншых.

Калі надзорная інстанцыя адмяняе пастанову аб спагнаньні адміністрацыйнага штрафу – выплачаныя ў лік штрафу сумы мусяць быць вернутыя даўжніку. Таму трэба захоўваць квіткі на выплачаныя ў лік штрафу сумы.

**Калі аштрафаваны ня мае заробку – спагнаньне накладаецца на маёмасьць**, г. зн. на асабістыя рэчы, супольную маёмасьць мужа і жонкі (для гэтага трэба правесьці разьдзел маёмасьці), рахункі ў банку.

Грамадзянскі працэсуальны кодэкс дае сьпіс рэчаў, на якія спагнаньне не пашыраецца, – гэта мінімум, неабходны для нармальнага існаваньня асобы: адзеньне, ежа, мэбля і іншыя рэчы.

Калі спагнаньне накладаецца на маёмасьць, судовы выканаўца робіць вопіс (арышт) маёмасьці даўжніка. Гэтая працэдура праводзіцца ў працоўны дзень, у працоўны час пры прысутнасьці аштрафаванага і двух панятых. Калі аштрафаваны ня можа прысутнічаць, дазваляецца рабіць вопіс у прысутнасьці прадстаўніка ЖЭСу ці выканкаму. Пры ажыцьцяўленьні вопісу судовы выканаўца зыходзіць з таго, што ўся маёмасьць у памяшканьні (пакоі), якое займае даўжнік, належыць даўжніку. Таму ў практыцы выканаўчае вытворчасьці вельмі часта адбываюцца спрэчкі наконт таго, што судовы выканаўца арыштаваў маёмасьць, якая не належала даўжніку, а проста захоўвалася ў ягоным памяшканьні (гэтыя спрэчкі вырашаюцца ў судовым парадку). Адзначым, што судовы выканаўца падчас вопісу ацэньвае маёмасьць прыблізна – ён жа ня ведае, колькі грошай будзе атрымана ад продажу кожнай з рэчаў. Таму судовы выканаўца звычайна апісвае болей рэчаў, чым неабходна. Астатнія застаюцца пад арыштам (іх нельга прадаваць ці зьнішчаць), але не пакідаюць пакою даўжніка, і імі можна карыстацца.

Падчас вопісу аштрафаваны мае права ўказаць рэчы, на якія трэба накласьці арышт у першую чаргу. Выніковым дакумэнтам вопісу зьяўляецца акт вопісу. Ён павінен рабіцца такім чынам, як гэта вызначана ў Інструкцыі аб выканаўчай вытворчасьці, зацьверджанай Міністэрствам юстыцыі яшчэ ў 1985 г., і артыкулам 505 Грамадзянскага працэсуальнага кодэксу. Акт вопісу складаецца судовым выканаўцам і падпісваецца прысутнымі асобамі. Копія акту пакідаецца ўладальніку маёмасьці.

Арыштаваная маёмасьць прадаецца судовым выканаўцам праз аўкцыёны ці камісійныя крамы.

Выкананьне пастановы суду аб адміністрацыйным арышце ажыцьцяўляецца неадкладна – калі суд не дае адтэрміноўкі зь нейкіх паважных падставаў, правапарушальніка накіроўваюць адбываць адміністрацыйны арышт непасрэдна з пакою суду. Час адміністрацыйнага затрыманьня залічваецца ў тэрмін арышту. Тэрмін арышту вызначаецца ў межах 3–15 сутак, але калі чалавек мае некалькі пастановаў аб арышце – ён мусіць адбываць іх адзін за адным. Заробак па асноўным месцы працы падчас арышту не выплачваецца, а саміх арыштаваных могуць прыцягваць да грамадзка-карыснай працы.

Арыштаваныя адбываюць тэрмін арышту ў спэцыяльных прыёмніках альбо, у некаторых выпадках, у ізалятарах часовага ўтрыманьня – у асобных камэрах. З арыштаваных спаганяецца кошт пражываньня і харчаваньня за час арышту. Пры паступленьні чалавека ў спэцпрыёмнік адбываецца рэгістрацыя і запіс у адмысловым часопісе, асабісты і мэдыцынскі дагляд, адабраньне грошай і рэчаў. Арыштаваных фатаграфуюць і бяруць у іх адбіткі пальцаў. На кожнага арыштаванага ў спэцпрыёмніку заводзіцца асабістая справа. Адміністрацыя абавязаная на працягу 24 гадзін паведаміць родным арыштаванага пра ягонае месцазнаходжаньне.

**Арыштаваныя таксама маюць правы** – таму варта патрабаваць азнаямленьня з Палажэньнем аб спэцыяльных прыёмніках пры органах МУС (зацьверджанае прыказам МУС 18 кастрычніка 1999 г. № 206), у якім гэтыя правы замацаваныя. Арыштаваныя маюць права раз у тыдзень мыцца ў лазьні ці прымаць душ, карыстацца сродкамі індывідуальнае гігіены, харчавацца тры разы ў дзень, мець індывідуальнае спальнае месца, карыстацца акулярамі, лекамі, тытунёвымі вырабамі, мець асадку і паперу, пісаць скаргі начальніку ўстановы, пракурору, чытаць газэты і часопісы, кнігі. Пералічаныя рэчы і дадатковыя прадукты харчаваньня арыштаваныя маюць права атрымліваць ад сваіх родных.

У адпаведнасьці з рэжымам, забаронена сумеснае ўтрыманьне здаровых арыштаваных з тымі, у якіх выяўлены інфэкцыйныя захворваньні. Мужчыны і жанчыны ўтрымліваюцца асобна.

На жаль, умовы ў беларускіх спэцпрыёмніках не адпавядаюць ніякім нормам, яны нагадваюць катаваньне і папросту зьневажальныя для людзей. На жаль, міжнародным назіральнікам не дазваляюць навед-

ваць гэтыя сумныя ўстановы. Душныя, цёмныя, маленькія камэры часта робяцца прычынай таго, што арыштаваныя адчуваюць сябе кепска. У такіх выпадках варта патрабаваць выкліку «хуткай дапамогі» – адміністрацыя спэцпрыёмніку ня мае права адмовіць у гэтым. Таксама адміністрацыя, у неабходных выпадках, павінна даставіць хворага ў стацыянар, але пасьля выздараўленьня яго зноў могуць памясьціць у спэцпрыёмнік для адбыцьця арышту.

## Зьбіцьцё пры затрыманьні альбо падчас сьледзтва

Праблема зьбіцьця пры затрыманьні альбо падчас сьледзтва сапраўды існуе. Гэты мэтад выкарыстоўваецца і ў якасьці помсты з боку мянтоў, і як спосаб выбіць патрэбныя сьледчаму сьведчаньні. Часьцей за ўсё зьбівае ня сьледчы, а мент.

Прэвэнтыўная парада: не давайце падставаў для катаваньняў. Гэта значыць не аказвайце непатрэбнага супраціву міліцыі, не ўступайце ў славесную сварку, не рэагуйце на лаянку і правакацыі. Карысна заўжды даць зразумець сьледчаму, што ў вас кепскі стан здароўя. Пры першай жа пагрозе катаваньняў трэба выказваць намер пісаць скаргу на неправамерныя дзеяньні сьледчых органаў. Калі вас катуюць службоўцы, якія ня маюць дачыненьня да вядзеньня вашай справы (апэратыўнікі, мянты, ахоўнікі сьледчага ізалятару), – паведамляйце пра гэта таму, хто вядзе вашую справу і адначасова пішыце скаргу ў пракуратуру і вышэйстаячай службовай асобе таго службоўцы, які ўжываў катаваньні.

Калі вас зьбілі пры затрыманьні ў міліцыі – патрабуйце, каб вас даставілі ў траўмапункт альбо выклікалі «хуткую дапамогу». Тут можна сымуляваць больш істотныя пашкоджаньні, чым вам рэальна былі нанесеныя. Запомніце імя і прозьвішча ўрача, што вам аказваў дапамогу, запомніце дыягназ і прасіце, каб вам выдалі пісьмовую даведку. Калі пасьля катаваньняў вас не даставілі ў шпіталь, а толькі выклікалі «хуткую» – паведаміце ўрачу, хто вас зьбіваў, і даведайцеся ў яго ўсе зьвесткі пра брыгаду і пра выклік, на які брыгада прыехала. Калі вас зьбілі міліцыянты, у вас ёсьць два магчымыя шляхі дзеяньняў: 1) калі ў вас ёсьць падставы меркаваць, што вас у хуткім часе вызваляць, ня трэба даваць міліцыянтам зразумець, што вы маеце намер пісаць скаргу (у гэтым выпадку мянты заўжды па надуманых падставах затрымаюць вас да таго часу, як у вас зьнікнуць сьляды зьбіцьця); 2) калі ў вас няма шанцаў на хуткае вызваленьне, паспрабуйце сабраць як мага бо-

лей доказаў катаваньняў (зьвяртайце ўвагу панятых на факт зьбіцьця, запісвайце гэта ўва ўсіх пратаколах, якія вам даюць на подпіс, а таксама запісвайце туды просьбу аказаць вам мэдычную дапамогу і даць адваката, распавядзіце пра факт зьбіцьця іншым затрыманым і сукамэрнікам). Пасьля збіцьця патрабуйце мэдычнай дапамогі (сымулюйце цялесныя пашкоджаньні і прыступы) і ў прысутнасьці ўрача адзначайце факт катаваньняў ды патрабуйце мэдычнага агляду. Калі дапамога не была аказаная – зьвяртайце на гэта ўвагу ўсіх, з кім вы знаходзіцеся ў камэры. Пры спатканьні з роднымі і абаронцамі прасіце дапамогі ў прадухіленьні катаваньняў (яны таксама могуць пісаць скаргі і заявы пра гэта). Абавязкова пішыце скаргу ў пракуратуру – дзеля гэтага вам трэба як мага больш дакладна запомніць усе абставіны катаваньня, у тым ліку званьне і выгляд ката, абстаноўку кабінэту, выгляд і званьні сьведкаў зьбіцьця.

Для тых, хто знаходзіцца пад вартай у сьледчым ізалятары, можна даць наступную параду – пры ўсіх магчымых выпадках рабіце мэдычны агляд. Дасьведчаныя рэцыдывісты заўжды пры пераводзе з адной сьледчай установы ў іншую патрабуюць фіксацыі свайго стану здароўя ў мэдсанчастцы.

Увогуле можна вылучыць тры асноўныя сытуацыі, зьвязаныя зь зьбіцьцём:

**1. Бессыстэмны кароткачасовы гвалт**, матываваны страхам і нянавісьцю (напрыклад, пасьля масавай акцыі з сутыкненьнямі міліцыянт, які моцна нацярпеўся страху, кідаецца на затрыманых у машыне ці пастарунку). Агрэсар слаба кантралюе сябе, ахвяру выбірае збольшага выпадкова, б'е як прыйдзецца і тым, што апынецца ў руцэ (але ў выпадку бамбізы-амапаўца менавіта гэта і зьяўляецца небясьпечным). Утрымлівайце пасіўную абарону, ухіляйцеся, стаўце блёкі – звычайна гэткі прыпадак мінае даволі хутка. Даваць здачы, калі вы знаходзіцеся ў пастарунку, бадай што ня варта – гэта можа прывесьці да таго, што ўсе прысутныя патэнцыйныя агрэсары сканцэнтруюцца на вас, да таго ж магчымыя праўныя наступствы. Выняткам з гэтай парады ёсьць сытуацыя, калі ўзьнікае сур'ёзная пагроза жыцьцю ці здароўю: у нападніка ў руках востры прадмет, нападнік спрабуе стрэліць у вас з табэльнай зброі, нападнік намагаецца ўдарыць у жывот цяжарную жанчыну (на жаль, наўноўшая беларуская гісторыя ведае такія выпадкі). Псыхолягі раяць «пераключыць» агрэсара слоўным узьдзеяньнем, запытаўшыся ў яго гучна і з рэзкай інтанацыяй нейкую загадка-

вую рэч, напрыклад: «З аквалянгам плаваеш?» Гэта часта (але не заўсёды) спрацоўвае, пажадана, аднак, мець такія загатоўкі загадзя, каб на патрэбу «загаварыць» нападніка.

**2. Бязмэтная, але асэнсаваная праява садызму,** зьвязаная з псыхічнымі ці сэксуальнымі адхіленьнямі агрэсара. У некаторых спэцаддзелах службоўцаў адмыслова прывучаюць да жорсткасьці, маніпулюючы іх псыхікай; нярэдка прышчэпліваецца ірацыянальная нянавісьць да «апазыцыянэраў», наладжваюцца адмысловыя відэапрагляды вучэбных фільмаў пра масавыя дэманстрацыі, вядзецца актыўная прамыўка мазгоў. Прыкладам гэткіх псыхапатычна жорсткіх, але прадуманых садысцкіх дзеяньняў могуць быць паводзіны АМАПу пасьля памятных падзеяў «Маршу Свабоды».

Напады ў такіх сытуацыях могуць быць доўгія і жорсткія (мэта – біць у болевыя кропкі), часта зьвязаныя зь іншымі дзеяньнямі, скіраванымі на прыніжэньне і маральнае катаваньне чалавека. Злачынцы, аднак, звычайна кантралююць сябе і стараюцца не давесьці справу да сьмяротнай небясьпекі, хаця – насуперак распаўсюджанаму міту – мала хвалююцца пра сьляды зьбіцьця.

Няма сэнсу апэляваць да здаровага сэнсу ці спачуваньня людзей, якія могуць разважліва катаваць безабаронных людзей, – ні аднаго, ні другога яны хутчэй за ўсё ня маюць. Вам варта быць маральна гатовымі да агрэсіі, якая можа прывесьці да адчувальных пашкоджаньняў. Калі вас б'юць, імкніцеся абараніць жыцьцёва важныя органы: лепш адбітыя ў кроў рукі, плечы й ногі, чым праломленая галава альбо адбітыя ныркі.

Нягледзячы на боль і стрэс, старайцеся ня страціць адчуваньня рэчаіснасьці і чалавечай годнасьці. Майце на ўвазе: калі вы страціце кантроль над сабой, станеце прыніжацца, прасіць літасьці, адмаўляцца ад сваіх перакананьняў – вы надломіце сваю псыхіку, і гэта можа мець для вас нашмат горшыя наступствы, чым пераломы костак. Косткі дакладна зрастуцца, а псыхіка – не заўсёды. Такім чынам, у падобнай сытуацыі важней абараніцца ад прыніжэньня, чым ад зьбіцьця. Не суўдзельнічайце ў сваім уласным катаваньні («стань, каб мне было зручней цябе біць»), не дазваляйце выкарыстоўваць сябе для катаваньня іншых (прыклад, узяты з жыцьця: некалькі чалавек, скаваных кайданкамі, прымушаюць легчы на падлогу, ад іншых патрабуюць па іх прайсьці), нават калі вам пагражаюць. Увогуле, салідарнасьць у такіх сытуацыях

– неацэнная вартасьць: падтрымлівайце іншых размовамі, спачуваньнем, – гэта надасьць вам сілы.

Калі вы маеце захворваньні альбо інваліднасьць, якія ператвараюць зьбіцьцё ў сьмяротна небясьпечную пагрозу, ясна папярэдзьце агрэсараў – яны не зацікаўленыя ў давядзеньні вас да сьмерці. Калі адчуваеце сябе кепска – патрабуйце мэдычнай дапамогі, ня факт, што яна прыйдзе хутка, але шанец ёсьць.

У камунікаваньнях будзьце неагрэсіўныя, але ўпэўненыя ў сваёй слушнасьці. Бессэнсоўна пераконваць катаў, што вы «прастой чэлавек, проста міма прахадзіл». Нават калі гэта будзе праўдай – вам ніхто не паверыць. Такім чынам вы праявіце страх і няўпэўненасьць, а гэта выклікае дадатковае жаданьне «папрэсаваць».

Не ўхіляйцеся ад размоваў, не маўчыце, калі пра вас гавораць лухту, якой прамываюць мазгі «ахоўнікаў парадку» дзяржпрапагандысты, – адказвайце, бараніце сваю годнасьць. Спрачайцеся, гэта ў вашых інтарэсах! Любы нападнік хоча выглядаць разумнейшым за сваю ахвяру, таму з высокай верагоднасьцю ўцягнецца ў спрэчку – і пры гэтым, хутчэй за ўсё, спыніць агрэсію (ён жа хоча паказаць інтэлект), калі вы, вядома, ня будзеце пасылаць яго «на тры літары». Не адказвайце на лаянку лаянкай: у адрозьненьне ад вашых праціўнікаў, вы – разумны чалавек. Уменьне пераканаўча гаварыць і ўпэўнена паводзіць сябе ў складанай сытуацыі выклікае павагу, нават у непрыяцеля, таму гадуйце ў сябе адпаведныя здольнасьці.

**3. Катаваньне для прымусу:** напрыклад, спроба «прышыць» справу, прымусіўшы ахвяру падпісаць прызнаньне, альбо «выбіваньне» паказаньняў на іншых. Гэта, бадай, найгоршы выпадак. У злачынцы ёсьць мэта і шырокі арсэнал сродкаў, якія могуць улучаць сыстэматычнае зьбіцьцё, шантаж, катаваньне голадам альбо бяссоньнем і г. д. – можна было б напісаць цэлую кніжку, толькі апісваючы тыя мэтады, што выкарыстоўваюцца сучаснымі гестапаўцамі. У гэтай сытуацыі вельмі цяжка даваць парады, яшчэ й таму, што чалавек, які доўгі час церпіць зьдзекі і катаваньне, перажывае пэўнае скрыўленьне ў сваім сьветаадчуваньні, губляючы розум і памяць. Ня шмат шанцаў на тое, што нашыя рэкамэндацыі застануцца на паверхні сьвядомасьці. Адзіная парада – папярэдзьце вашых катаў, што на судзе вы адмовіцеся ад усіх паказаньняў, дадзеных падчас сьледзтва.

Тут шмат што залежыць ад вашых наступных дзеяньняў пасьля катаваньняў. Паведамляйце праз родных і адваката пра факт катаваньняў

няў (абавязкова – у пісьмовай форме, у выглядзе скаргаў!). Хутчэй за ўсё, вашае выратаваньне будзе залежаць не ад вас – найлепшай вашай зброяй стануць вашыя сябры, родныя, аднадумцы, роля якіх – «рыць зямлю», каб выцягнуць вас на волю, актыўна інфармаваць СМІ аб вашых пакутах, дамагацца сустрэчаў, рабіць перадачы і г. д. Як паказвае беларуская практыка, чым болей увагі прыцягнута да зьняволенага і чым актыўней дзейнічаюць ягоныя сябры, тым меншая імавернасьць, што яго будуць катаваць, і тым большая імавернасьць, што ён будзе вызвалены хутчэй, чым яго пасьпеюць зламаць.

## Правілы бясьпекі для ўдзельнікаў вулічных акцыяў

Удзельніку кожнай несанкцыянаванай уладамі акцыі (мітынгу, пікету, раздачы альбо раскідкі газэтаў і ўлётак) трэба быць падрыхтаваным да затрыманьня і ведаць свае дзеяньні, калі гэта здарылася. Асабліва гэта датычыцца масавах мерапрыемстваў – мітынгаў, шэсьцяў, пікетаў. Актывісты арганізацыі павінны мець інструкцыю, што трэба рабіць у выпадку затрыманьня.

На ўсе масавыя мерапрыемствы варта зьяўляцца цьвярозымі, з пашпартам, бяз зброі і без сакрэтных дакумэнтаў альбо кампраматных рэчаў.

Калі вас затрымліваюць падчас масавага «хапуна» – паспрабуйце даведацца максымум інфармацыі пра таго, хто вас затрымлівае. Калі вас завялі ў аўтобус разам зь іншымі затрыманымі – даведайцеся, хто яны, і паведаміце сваё прозьвішча (той, хто першы выйдзе на волю, паведаміць таварышам колькасьць і прозьвішчы затрыманых; таксама можна выклікаць іх у якасьці сьведкаў). Па дарозе ў пастарунак паспрабуйце, калі гэта магчыма, патэлефанаваць праз мабільны тэлефон і паведаміць таварышам, што вас затрымалі (трымаючы ў кішэні тэлефон, набярыце нумар і ўголас спытайце: «Я просты грамадзянін Сяргей Іваноў, за што вы мяне везяце ў Заводзкі РУУС?»). Калі тэлефон адбіраюць – абавязкова адключыце яго.

Калі вас гвалтам хапаюць у натоўпе людзі ў цывільным і без паказу службовага пасьведчаньня – біце іх, вы маеце права аказаць супраціў. Можна крыкам прыцягнуць увагу мінакоў. Калі вас вядуць да легкавога аўтамабіля – паспрабуйце запомніць яго нумар, колер і марку.

Трэба памятаць, што большасьць затрыманьняў адбываецца не падчас самой акцыі, а па яе заканчэньні. За актыўнымі ўдзельнікамі, якіх папярэдне адзьнялі на відэа, палююць людзі ў цывільным. Падчас руху

па вуліцы трэба старацца ісьці не па ходзе транспарту, каб пазьбегнуць затрыманьня з машыны. Удзельнікі акцыяў, якія маюць пры сабе сьцягі, павінны вырашыць пытаньне, куды хутка схаваць сымболіку. Паводзіць сябе трэба спакойна і не правакаваць міліцыю да гвалтоўных дзеяньняў супраць вас.

Своечасова і бясьпечна сысьці з акцыі таксама вельмі важна. Перад тым як сысьці, паглядзіце ўважліва вакол сябе. Калі заўважыце падазроных, адпаведнай зьнешнасьці людзей побач, пастарайцеся адарвацца ад іх. Сыход з акцыі ажыцьцяўляецца невялічкімі групамі па 2–4 чалавекі. Адышоўшы ад месца акцыі, можна аднамамэнтна, у загадзя абумоўленым месцы, разысьціся ў розныя бакі. Калі вы пасьпяхова сышлі – абтэлефануйце сваіх: ці нікога не забралі? Магчыма, камусьці патрэбная дапамога.

Пры затрыманьні найлепей увогуле нічога не казаць пра свой удзел у акцыі. Вялікую ўвагу трэба надаць напісаньню пратаколаў аб адміністрацыйным затрыманьні і адміністрацыйным правапарушэньні. Вас абавязкова павінны зь імі азнаёміць. У тлумачэньнях да пратаколу трэба напісаць сваю вэрсію падзеяў. Ніколі ня трэба ні ў чым прызнавацца: прызнавацца – гэта дрэнная звычка. Згодна з нормамі права, абавязак даказваньня віны ляжыць на органе, які ажыцьцявіў затрыманьне. Гэта азначае, што вы маеце права не даваць аніякіх тлумачэньняў увогуле ці казаць тое, што лічыце неабходным. Даказваць павінны яны, а ня вы. Таму ня трэба займацца самаабгаворамі.

# 5. ПРАВАКАЦЫІ

## Што рабіць, калі падкідваюць грошы

«Прававахоўныя» органы часам выкарыстоўваюць правакацыі супраць актывістаў апазыцыйнага руху. Вядомыя выпадкі, калі падкінутыя ў кватэру, дачу, аўтамабіль альбо ў кішэні буйныя сумы грошай, фальшывыя грошы ці агнястрэльная, халодная зброя служылі падставай для прыцягненьня асобы да крымінальнай адказнасьці альбо цягнулі за сабой шантаж і іншыя непрыемнасьці. Натуральна, прадухіліць усе магчымыя правакацыі дастаткова цяжка, аднак веданьне некаторых простых правілаў дазволіць пазьбегнуць найбольш імаверных правакацыйных тэхнікаў, што звычайна выкарыстоўваюцца «прававахоўнікамі» зыходзячы з стандартных мадэляў.

Трэба разумець усю небясьпеку падкінутых прадметаў – яна мае ня толькі патэнцыйнае юрыдычнае, але і простае псыхалягічнае значэньне. Гэткія правакацыі служаць некалькім мэтам:

- узбуджэньне супраць асобы крымінальнай справы з магчымым давядзеньнем яе да судовага рашэньня (пры гэтым першапачатковыя фальшывыя грошы могуць зьнікнуць зь сьпісу абвінавачаньняў у сілу іх відавочнай бязглуздасьці);
- затрыманьне асобы альбо ўзяцьце яе пад варту з далейшым выбіваньнем патрэбных сьведчаньняў і працяглай ізаляцыяй асобы;
- атрыманьне фармальных падставаў для далейшых сьледчых дзеяньняў, у ходзе якіх можна даведацца пра палітычную дзейнасьць арганізацыі і разбурыць яе;
- шантаж і вэрбоўка асобы ў інфарматары альбо «сакрэтныя супрацоўнікі» (фармат «свабода ў абмен на інфармацыю» найбольш часта выкарыстоўваецца супраць актывістаў сярэдняга зьвяна).

Такім чынам, падкінуты **фальшывыя грошы**. Гэтая мэтодыка вельмі добра адпрацаваная «прававахоўнымі» органамі, паколькі часта выкарыстоўваецца ў барацьбе з эканамічнай злачыннасьцю, хабарніцтвам і карупцыяй. Звычайна гэта робіцца з згоды вышэйшых «прававахоўнікаў». Можна сказаць, што ў пэўным сэнсе дадзеная мэтодыка працуе выкшталцона – працістаяць ёй вельмі цяжка. Таму для абароны ад гэткіх дзеяньняў патрэбныя два фактары: 1) дапамога пісьменнага адваката падчас затрыманьня і сьледзтва, 2) разумныя

дзеяньні падчас вобшуку альбо дагляду, у ходзе якіх знойдзены «фальшывыя» грошы.

Пры правядзеньні вобшуку можна запярэчыць незаконным спробам падкінуць грошы, наркотыкі альбо зброю. У гэтым выпадку трэба кіравацца тымі правіламі, якія мы пералічвалі ў парадах адносна правядзеньня вобшуку: неабходная наяўнасьць пастановы аб правядзеньні вобшуку з санкцыяй пракурора; трэба патрабаваць запрашэньня панятых (найлепей запрасіць і сваіх панятых – суседзяў); вобшук павінен праводзіцца ў прысутнасьці ўладальніка памяшканьня; колькасьць панятых павінна адпавядаць колькасьці пакояў, у якіх адбываецца вобшук; патрабаваць пасьлядоўнага правядзеньня вобшуку (пакой за пакоем); зьвяртаць увагу панятых на тое, што адбываецца, скіроўваць іх увагу на дзеяньні кожнага з «праваахоўнікаў», але адначасова трэба самому сачыць за дзеяньнямі панятых; патрабаваць складаньня пратаколу з занясеньнем у яго прозьвішчаў і пасадаў усіх прысутных (у выпадку калі нехта ад гэтага адмаўляецца, рабіць адзнаку пра прысутнасьць падчас вобшуку неўстаноўленых пабочных асобаў); прасачыць, каб у пратаколе былі падрабязна апісаныя ўсе знойдзеныя і / альбо адабраныя прадметы і пазначаныя іх індывідуальныя прыкметы; у тэкст пратаколу трэба ўносіць усе заўвагі і пярэчаньні супраць дзеяньняў «праваахоўнікаў». Асобна адзначым, што пры адабраньні грошай **трэба пазначаць сэрыі і нумары купюраў і асобна адзначаць наяўнасьць вадзяных знакаў** (настойліва патрабуйце ад міліцыянтаў выкананьня гэтага парадку, але калі гэта не робіцца – варта запісаць гэта самому ў тэксьце пратаколу). Калі вы ня ўпэўненыя, што гэта вашыя грошы, – ні ў якім разе не дакранайцеся да іх і адзначце ў пратаколе, што вы ня маеце да гэтых рэчаў дачыненьня.

Пісьменныя дзеяньні падчас вобшуку памяшканьня могуць прадухіліць падкідваньне недазволеных прадметаў непасрэдна падчас вобшуку. На жаль, ніхто не застрахаваны ад падкідваньня ў кватэру альбо ў офіс фальшывых грошай (таксама як наркотыкаў ці зброі) яшчэ задоўга да вобшуку. Нават пры добра наладжанай офіснай бясьпецы, пільнай «дзьвярной палітыцы» немагчыма прасачыць за кожным, хто ўваходзіць у памяшканьне. Пры адсутнасьці сталай начной варты ў памяшканьне могуць падкінуць фальшывыя грошы нават і ўначы. Калі ж, нечакана для вас, «праваахоўнікі» знайшлі загадзя падкінутыя забароненыя рэчы, у першую чаргу трэба давесьці сваю недатычнасьць да іх: патрабаваць экспэртызы на наяўнасьць на рэчах вашых

адбіткаў пальцаў (калі гэта запакаваныя грошы – адбіткаў пальцаў на ўпакоўцы), поту, а на вашых руках – сьлядоў забароненых рэчываў, збройнага масла альбо фарбы, мікрачасьцінак пораху. У любым выпадку, тут шмат што залежыць ад пісьменнасьці адваката.

Інакш выглядае сытуацыя, калі вам спрабуюць падкінуць фальшывыя грошы непасрэдна пры затрыманьні. Напрыклад, пасьля затрыманьня і дастаўкі ў пастарунак вас папрасілі выкласьці на стол усё, што знаходзіцца ў кішэнях. Пры гэтым трэба ўважліва сачыць за тым, як даглядаюцца выкладзеныя вамі грошы – і рублі, і даляры. Вашы праціўнікі могуць паспрабаваць адцягнуць вашую ўвагу, каб незаўважна падкінуць вам фальшывую купюру. Калі вашыя грошы адбіраюць (пры затрыманьні альбо дзеля экспэртызы), то патрабуйце перапісу нумароў і сэрыяў адабраных купюраў. Таксама патрабуйце занясеньня ў пратакол адабраньня словаў, што ўсе адабраныя купюры маюць вадзяныя знакі, у адваротным выпадку праз нейкі час вам могуць паказаць купюру, выробленую на каляровым ксэраксе, пад нумарам адабранай у вас купюры. Такім чынам вас могуць абвінаваціць у вырабе і распаўсюджваньні фальшывых грошай – для гэтага дастаткова адной выробленай на ксэраксе купюры, а гэты крымінальны артыкул дастаткова цяжкі. Таму шмат што залежыць ад вашай уважлівасьці і настойлівасьці падчас адабраньня грошай і складаньня пратаколу адабраньня.

Часам практыкуецца і іншы варыянт. «Барацьбіты з злачыннасьцю» упускаюць на падлогу (напрыклад, ля стала, дзе адбываецца дагляд) фальшывую купюру, звычайна гэта 100 даляраў. Натуральная чалавечая рэакцыя – падняць грошы, якія ўпалі, альбо міліцыянты могуць нават папрасіць вас падняць з падлогі гэтую купюру. У выніку пры наяўнасьці на фальшывых грошах вашых адбіткаў пальцаў несправядлівае абвінавачаньне вас у распаўсюджваньні фальшывых грошай значна спрашчаецца. Часам гэткі фокус ажыцьцяўляецца каля абменнага пункту.

Таксама вам могуць падкінуць фальшывую купюру пры пераліку грошай, а пасьля могуць папрасіць вас пералічыць іх самастойна (яшчэ да складаньня пратаколу!). Для таго каб справакаваць вас на ўласнаручны пералік і, адпаведна, на дотык да фальшывай купюры, міліцыянты пасьля пераліку могуць нават назваць большую (альбо меншую) суму

грошай – на гэткія хітрыкі ня трэба паддавацца, трэба казаць, што гэты лік не адпавядае рэчаіснасьці, і сказаць, каб міліцыянты самастойна нанава пералічылі грошы. Трэба разумець, што падчас гэтай працэдуры колькасьць грошай ужо ня мае прынцыповага значэньня: міліцыянты ня будуць скажаць яе пры пераліку проста так. Таму пры адабраньні грошай парадак дзеяньняў павінен быць такі:

- вы ў прысутнасьці панятых выкладаеце грошы на стол і ўважліва сочыце за імі;
- на вашых вачах і на вачах панятых адабраныя ў вас грошы пералічваюцца;
- калі сума не адпавядае рэчаіснасьці, вы адзначаеце гэта ўголас і патрабуеце яе пераліку;
- сума адабраных грошай заносіцца ў пратакол з апісаньнем кожнай адабранай купюры з адзнакай нумару, сэрыі і наяўнасьці вадзяных знакаў;
- пасьля гэтага вы чытаеце пратакол, маеце права ўносіць у яго заўвагі, у тым ліку пра колькасьць і ўласьцівасьці адабраных купюраў;
- падпісваеце пратакол.

Буйныя сумы нефальшывых грошай у якасьці правакацыі выкарыстоўваюцца значна радзей (напрыклад, падкідваюць разам з наркотыкамі альбо пры правакаваньні хабару). Гэта зьвязана з тым, што няма забароны грамадзяніну мець пры сабе вялікія грошы (гэта ня ёсьць парушэньнем заканадаўства – вы заўжды можаце адказаць, што пазычылі гэтыя грошы), а для саміх апэратыўнікаў атрыманьне сапраўдных грошай для інсцэнаваньня зьвязанае з пэўнымі адміністрацыйнымі цяжкасьцямі (рэчавыя доказы ў выглядзе вялікіх грошай занадта часта зьнікаюць з матэрыялаў справы). Таму асьцерагацца трэба пераважна абвінавачаньня ў захоўваньні фальшывых грошай.

Натуральна, трэба адмаўляцца ад датычнасьці да тых грошай, якія вам не належаць. Ні ў якім разе **ня трэба дакранацца да тых купюраў, якія вам не належаць**, каб не пакінуць адбіткаў сваіх пальцаў на фальшывых купюрах. У выпадку калі вы сапраўды мелі пры сабе буйную суму грошай і вас спрабуюць абвінаваціць у тым, што гэтыя грошы фальшывыя, – патрабуйце абавязковага складаньня пратаколу адабраньня з абавязковым пазначэньнем усіх нумароў купюр і адзнакай пра наяўнасьць вадзяных знакаў.

## Што рабіць, калі падкідваюць зброю альбо абвінавачваюць у яе нашэньні

Правакацыі з выкарыстаньнем халоднай зброі ня ёсьць распаўсюджанай зьявай, хоць часам гэткі мэтад і выкарыстоўваецца для застрашэньня і наступнай вэрбоўкі апазыцыйных актывістаў (для міліцыянтаў гэта зручна, паколькі дастаць халодную зброю для іх вельмі проста). Таму трэба памятаць, што злачынствам зьяўляецца выраб і продаж халоднай зброі, а захоўваньне і нашэньне халоднай, пнэўматычнай, газавай зброі злачынствам не зьяўляецца. Злачынствам ёсьць таксама нашэньне альбо перавозка халоднай зброі асобай, якая на працягу году прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасьці за гэткае дзеяньне. Так што калі вам падкінулі халодную зброю – ня трэба пужацца: крымінальная адказнасьць вам не пагражае. Асобная парада тым, хто носіць з сабой сьцізорыкі: вы не абавязаныя адрозьніваць якасьці халоднай зброі – для гэтага патрэбныя спэцыяльныя веды, якіх у шараговага чалавека няма (напрыклад, якасьць сталі). Таму калі ў вас знайшлі нож альбо сьцізорык і абвінавачваюць у тым, што гэта быццам бы «халодная зброя» – карысна мець пры сабе даведку, што гэта ня ёсьць халоднай зброяй, а калі даведкі няма – упэўнена патрабаваць правядзеньня экспэртызы прадмета. У любым выпадку, гэта толькі адміністрацыйнае правапарушэньне.

Усё, што мы сказалі пра халодную зброю, пашыраецца на зброю пнэўматычную, газавую і штурхальную (арбалеты).

Найбольш часта міліцыянты (асабліва на ніжэйшым узроўні) выкарыстоўваюць у мэтах правакацыі падкінутыя патроны. Справа ў тым, што падкінуць агнястрэльную зброю досыць цяжка – яе зварот кантралюецца ў органах міліцыі дастаткова строга і яна звычайна мае нумар (паказальна, што Марынічу падкінулі пісталет рэдкай іншаземнай маркі, які выкарыстоўваецца спэцслужбамі і на якім вытраўлены кіслатой нумар). Патроны ж не падлягаюць гэткаму жорсткаму кантролю.

Міліцыянты ўпадабалі наступную мэтодыку: падчас вобшуку альбо дагляду на падлозе рассыпаюцца некалькі патронаў і чалавеку кажуць – «Падбяры». Такім чынам на патронах аказваюцца адбіткі пальцаў – і гэтага ўжо дастаткова для ўзбуджэньня крымінальнай справы. Таму, калі вам у кватэру, у офіс, у машыну падкінулі патроны (альбо нават адзін патрон), гранату (часьцей за ўсё з гладкай паверхняй), галоўная парада – **ні пры якіх абставінах не дакранайцеся да гэтых прадме-**

**таў**, нават калі вас аб гэтым просяць міліцыянты. Абавязкова патрабуйце запрашэньня панятых. Ужо ў прысутнасьці панятых:

- Патрабуйце зьняцьця адбіткаў пальцаў з знойдзеных прадметаў і занясеньня гэтага факту ў пратакол. Калі міліцыянты адмаўляюцца гэта зрабіць (спасылаючыся на адсутнасьць спэцыяліста), адзначайце гэтую адмову ў пратаколе.
- Зьвярніце ўвагу панятых на тое, што ў вас на руках і на вопратцы няма сьлядоў збройнага масла. Патрабуйце зьняцьця мазкоў з далоняў і вопраткі на аналіз утрыманьня на іх мікрачасьцінак мэталу альбо збройнага масла. Калі менты адмаўляюцца гэта зрабіць – патрабуйце занясеньня гэтай адмовы ў пратакол альбо рабіце запіс у пратакол самі.
- Калі вам падкінулі агнястрэльную зброю (пісталет, рэвальвэр, ружжо) – патрабуйце зьняцьця адбіткаў пальцаў ня толькі з паверхні гэтых рэчаў і з курка, але і з унутранага боку (патроны ў абойме, абойма, спускавы мэханізм і іншыя часткі).
- У выпадку калі вам падкідваюць патроны, то падчас дагляду варта ўголас і з прыцягненьнем увагі панятых запатрабаваць ня толькі зьняцьця адбіткаў пальцаў з патронаў, але і экспэртызы пораху і прыкметаў вырабу патронаў (натуральна, гэта немагчыма зрабіць на месцы, аднак гэта можна занесьці ў пратакол і тым самым выклікаць зьбянтэжанасьць правакатараў).
- Пры падкідваньні агнястрэльнай зброі варта запісаць у пратакол нумар, калі ён ёсьць на зброі.

Для мэтаў правакацыі, каб атрымаць вашыя адбіткі на зброі, вам могуць падкінуць нейкія часткі зброі (ствольную каробку, барабан, рамку). Уважліва сачыце за тым, што вам даюць у рукі міліцыянты падчас вобшуку альбо дагляду. Нават калі вам дэманструюць запакаваны ў поліэтыленавы пакуначак патрон, быццам бы знойдзены пры вас,– не дакранайцеся да яго.

**Памятайце! Толькі вашыя адбіткі пальцаў зьяўляюцца для суду асноўным доказам вашай вінаватасьці.** Адзначым, што апошнім часам пашырылася практыка, калі ў адміністрацыйна затрыманых няўрадавых актывістаў (распаўсюднікаў друкаваных матэрыялаў, удзельнікаў масавых акцыяў) бяруць адбіткі пальцаў.

Мы не заахвочваем вас да нашэньня зброі – звычайна гэта незаконна і неразумна. У экстраардынарным выпадку (напрыклад, на вас рыхтуецца замах), калі вам трэба мець пры сабе агняпальную (альбо газа-

вую) зброю і няма дазволу на яе нашэньне – абавязкова трымайце пры сабе заяву ад вашага імя на адрас будзь-якога РУУС у той мясцовасьці пра добраахвотную здачу зброі, пажадана з пазначанай сапраўднай датай. Тлумачыць паходжаньне гэтай зброі неабавязкова (вы вызваляецеся ад адказнасьці пры добраахвотнай здачы любой зброі), але можна спаслацца на тое, што вы гэтыя рэчы выпадкова знайшлі. Гэтая дробязь можа вельмі дапамагчы вам у выпадку затрыманьня.

## Што рабіць, калі падкідваюць наркотыкі

Для некаторых «апэратыўных» супрацоўнікаў і міліцыянтаў ніжэйшага і сярэдняга зьвяна падкінуць чалавеку ў кішэню наркотыкі альбо шпрыц з наркатычным рэчывам – любімы мэтад дзейнасьці. Звычайна гэтая мэтода выкарыстоўваецца на нізавым узроўні «праваахоўнікаў» для барацьбы з наркаманіяй супрацьпраўнымі сродкамі. Такім чынам быццам бы ствараецца падстава для прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці (напрыклад, за «гандаль наркотыкамі»), і для недасьведчанага чалавека гэткая пагроза выглядае дастаткова верагоднай. Часьцей за ўсё гэта ёсьць псыхалягічны сродак для шантажу з наступным прыцягненьнем да «супрацоўніцтва» (г. зн. да «стукацтва»). Для судовага разгляду гэткая правакацыя часьцей за ўсё будзе выглядаць занадта нацягнутай – калі вы дзейнічаеце пісьменна і не нагаворыце супраць сябе лухты. У выпадку, калі наркатычныя рэчывы падкінутыя невінаватай асобе – «даказаць» віну амаль немагчыма, нават шляхам фальсыфікацыі доказаў. Так што збольшага пагрозы ўзбуджэньня крымінальнай справы «за наркотыкі» найчасьцей выкарыстоўваюцца толькі як падстава для затрыманьня чалавека з наступным шантажом пагрозай прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці. Часам гэткая мэтодыка выкарыстоўваецца супраць актывістаў моладзевых палітычных рухаў. Але вядомыя выпадкі, калі праз падкінутыя ў кішэню наркотыкі і грошы людзі праводзілі за кратамі гады.

Дапусьцім, вы заўважылі, што вам у кішэню міліцыянты падкінулі пакуначак зь невядомым рэчывам. Як трэба сябе весьці ў гэткай сытуацыі? Калі гэта было зроблена яшчэ да вашай дастаўкі ў пастарунак, то можна паспрабаваць па дарозе да мянтоўкі пазбавіцца ад «падарунку». Вядомы выпадак, калі дзяўчына, якой у джынсы падклалі пакуначак з гераінам, пазногцямі прарвала дзірачку ў кішэні, прапхнула пакуначак у штаніну, і пры выхадзе з машыны пакуначакываліўся. Міліцыянты тры гадзіны шукалі пры ёй падкінутыя наркотыкі, але нічога не

знайшлі.

Але пазбавіцца ад падкінутага даволі цяжка. Таму калі вас даставілі ў пастарунак – не панікуйце і не абурайцеся. Галоўнае – ня трэба лезьці ў кішэню і спрабаваць выкінуць пакуначак. Калі пакуначак ужо патрапіў вам у кішэню і вы ўжо знаходзіцеся ў пастарунку – дайце вашым працаўнікам зрабіць сваю справу. Аднак калі яны затым зробяць спробу зьдзейсьніць агляд вашай вопраткі альбо асабісты дагляд, ветліва, але цьвёрда і настойліва запатрабуйце запрашэньня панятых і выкананьня ўсяго парадку правядзеньня агляду. Таксама можна заявіць, што вы хочаце добраахвотна выдаць наяўныя наркатычныя рэчывы (натуральна, з тлумачэньнем таго, якім чынам яны да вас патрапілі на самай справе) – у гэтым выпадку вы вызваляецеся ад крымінальнай адказнасьці. Калі вас не папярэдзілі пра магчымасьць добраахвотнай выдачы наркотыкаў – абавязкова адзначце пра гэта пры падпісаньні пратаколу.

Калі вы ўжо заўважылі, што вам падкінулі пакуначак зь невядомымі рэчывамі, то пры асабістым даглядзе ня лезьце самі ў кішэню. Няхай асабісты дагляд праводзяць міліцыянты і няхай яны самі дастануць падкінутую рэч. Пры гэтым уважліва сачыце за рукамі міліцыянтаў і прыцягвайце да гэтага ўвагу панятых. Тое самае важна рабіць пры любым асабістым даглядзе, паколькі наркотыкі могуць падкінуць і непасрэдна падчас дагляду – міліцыянту дастаткова заціснуць пакуначак у далоні, калі ён будзе лезьці да вас у кішэню. Таму калі вы ўпэўненыя, што вам не пасьпелі падкінуць анічога – варта дастаць усе рэчы з кішэні самастойна. Апэратыўнікі любяць пры аглядзе сунуць у руку затрыманаму нейкі пакуначак зь нявіннымі словамі «А гэта што такое?». Калі вы ўзялі пакуначак, каб лепей яго разглядзець, то адбіткі вашых пальцаў будуць абавязкова скарыстаныя супраць вас. Будзьце асьцярожныя, калі падчас дагляду альбо вобшуку прысутнічаюць «праваахоўнікі» зь іншых аддзяленьняў, якія, здаецца, нічым не займаюцца, – менавіта яны часьцяком і зьяўляюцца выканаўцамі правакацыі.

Ужо ў прысутнасьці панятых патрабуйце, каб вам састрыглі пазногці, узялі мазок з далоняў і з рота (для наступнай экспэртызы). Усё забранае ў вашай прысутнасьці павінны апячатаць і адправіць на экспэртызу. Памятайце, што праваахоўным органам будзе вельмі цяжка растлумачыць наяўнасьць наркотыкаў у вашай кішэні без пацьвярджэньня наяўнасьці мікрачасьцінак наркотыку пад пазногцямі, на далонях і ў роце.

Калі вам падкінулі не пакуначак, а шпрыц з бурай ці празрыстай вадкасьцю альбо незразумелую рэч, закручаную ў поліэтылен, таксама ні ў якім разе не дакранайцеся да гэтай рэчы рукамі.

Пры панятых настойліва кажыце, што ўсё гэта правакацыя, і патрабуйце зьняцьця адбіткаў пальцаў з шпрыца, пакуначка альбо скрутку. Зьвярніце ўвагу панятых на тое, што пальчатак у гэты момант на вашых руках няма і што вы ня маеце іх пры сабе. Заўважце і прадэманструйце адсутнасьць сьлядоў ад уколаў на вашых руках. Патрабуйце аналізу вашай мачы на аміконавую кіслату. Калі вам падкінулі шпрыц з бурай вадкасьцю – абавязкова патрабуйце аналізу групы крыві ў вас і ў шпрыцы.

Здараецца, што на шыю вешаюць скрутак, зь якога пазьней пры панятых дастаюць гераін альбо іншы наркотык. Дзеяньні тыя ж – не дакранайцеся да рэчы рукамі, патрабуйце пры панятых узяцьця мазка вашага поту і поту на скрутку, зьняцьця адбіткаў пальцаў. Ізноў-такі, пры панятых адзначце, што ў вас на руках няма сьлядоў ад уколаў.

Патрабуйце, каб усе знойдзеныя прадметы былі зьмешчаныя ў поліэтыленавы пакунак.

Усе пазначаныя патрабаваньні і заўвагі павінны заносіцца ў пратакол асабістага агляду альбо агляду рэчаў. Калі міліцыянты ня робяць гэтага, нягледзячы на вашыя патрабаваньні, – адзначце гэта ў пратаколе ўласнаручна.

Гэткія дзеяньні зробяць амаль немагчымым абвінавачаньне вас у незаконных дзеяньнях з наркатычнымі рэчывамі на ўзроўні, дастатковым для прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці. Таксама і міліцыянты, пабачыўшы, што вы не разгубіліся, што вы дзейнічаеце настойліва і пісьменна, зразумеюць немагчымасьць шантажаваньня вас пагрозай прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці за гэткія дзеяньні.

Ад небясьпекі падкідваньня наркотыкаў ніхто не застрахаваны. Унівэрсальных рэцэптаў процідзеяньня тут няма, паколькі час ад падкідваньня наркотыку да яго выкрыцьця можа займаць ад сутак (пры падкідваньні ў аўтамабіль) да хвілінаў (калі падкідваюць непасрэдна падчас агляду). Стратэгія дзеяньняў залежыць ад таго, на якой стадыі вы зразумелі, што сталі ахвярай правакацыі. Галоўнае – увага да таго, што адбываецца, і пільнасьць да тых рэчаў, да якіх вы дакранаецеся.

# МАЛЫ КАНСЬПІРАТАР

## Ад рэдакцыі

«Малы кансьпіратар» – зборнік артыкулаў, напісаны часова свабоднымі людзьмі. Калі прачытаеце першы разьдзел, магчыма, вы ўжо ня будзеце мець патрэбы ўва ўжываньні парадаў з двух наступных. Калі пазнаёміцеся з другім разьдзелам – будзеце ведаць, на якой прававой падставе вам нельга прышыць тэрмін за чытаньне трэцяга, а калі прачытаеце трэці – будзеце цьвёрда ведаць, чаму найлепей маўчаць пра тое, што вы наогул бралі ў рукі гэтую кніжачку.

## ЯК ПРАЦАВАЦЬ У ПАДПОЛЬЛІ

У Польшчы пачатак барацьбы з чырвонымі для адных быў у 1944 г., для другіх – у 1956-м, для трэціх – у 1976-м. Ёсьць тыя, што за пачатак бяруць стварэньне «Салідарнасьці», а для некаторых гэта пачалося пасьля польска-ярузэльскай вайны. Дакладна вядома адно: дата 13 сьнежня 1981 г. дазволіла кожнаму з нас усьвядоміць сэнс падпольнай працы. Ня трэба было нікога запэўніваць пасьля дэманстратыўных дзеяньняў мужных людзей, якія дапамаглі пераадолець страх і паказалі, што падпольнае жыцьцё дае нам шанец разьвіцьця да свабоды. Толькі ў падпольлі мы былі ўпэўненыя, што грамадзкая арганізацыя, якую мы стварылі, ня будзе зьнішчаная з дня на дзень.

З чырвонымі нельга вызначыць межы кампрамісу, якія б задавальнялі абодва бакі. Чырвоны ведае толькі прынцып пальца і рукі: дасі яму палец – не пасьпееш азірнуцца, як ня стане рукі.

У аснове падпольнай барацьбы ляжыць факт, што нелегальнай зьяўляецца сама ўлада і яе дзеяньні. Яна не прытрымліваецца ня толькі Хартыі правоў чалавека, якія яна ратыфікавала, і Канстытуцыі, якую зацьвердзіла, але нават выканаўчых падзаконных актаў, абавязковых для яе паліцыі, такіх, як забарона выкарыстаньня дубінак у зачыненых памяшканьнях.

### Падпольле

Усім вядомы «ідэал» кансьпірацыі: зачыніцца ў чатырох сьценах і нічога не рабіць, каб нас не накрылі. Падпольная праца заключаецца ня ў тым, што ты сядзіш у склепе і пасылаеш сувязных на ўсе чатыры

бакі сьвету. Кансьпіратар, якога шукае паліцыя, – гэта не «чалавек, за якім ходзяць», а той, пра якога КДБ ня ведае, дзе ён жыве і бывае. Па сутнасьці, кансьпірацыя знаходзіцца на паверхні – але ня той, па якой ходзяць кадэбэшнікі.

Калі ўступаеш з кімсьці ў змову, гэта ня можа быць чалавек ніадкуль. Ён павінен мець пэўныя рэкамэндацыі. Блізкіх памочнікаў шукай сярод правераных і вядомых табе людзей. Толькі калі ўтворыш сетку асноўных кантактаў і справа пачне круціцца, можаш даверыцца пасярэднікам. Калі адразу будзеш гуляць у вялікага кансьпіратара – узьнікне небясьпечнасьць таго, што вырасьце ланцуг пасярэднікаў. Яны будуць прыхільнікамі справы Радзімы, але нічога рабіць ня будуць. Дастаткова аднаго міфамана, рэкамэндаванага табе праз трэція рукі, каб стварыць структуру дзеля самой сябе і якую ты будзеш вымушаны дэмістыфікаваць на працягу месяцаў.

Нягледзячы на тое што ў народзе жыве памяць Самас’еры, мужных ня так шмат. Таму беражы бясьпеку сваіх супрацоўнікаў і сваю асабістую бясьпеку. Часта ў пачатку арганізацыйнай працы, імправізуючы, мы парушаем прыведзеныя тут правілы бясьпекі. Рызыкуем больш з прычыны страху, што ў дзеяньнях згубім хуткасьць рэагаваньня, што запозна адкажам на тое, чаго чакае ад нас грамадзкасьць.

Нас павінна радаваць кожная праява салідарнасьці, мы павінны дзейнічаць так, каб маўклівая большасьць атаесамляла сябе з намі, але ня трэба спадзявацца, што мы ўцягнем яе ў падпольную працу. Толькі ў патрыятычных кніжках увесь народ можа працаваць у падпольлі.

Аднак засьцерагайся амбітнасьці – яна можа аддзяліць кансьпіратараў ад тых, для каго ты працуеш у падпольлі. Не суцяшай сябе марнымі спадзяваньнямі, не рабі камплімэнтаў грамадзкасьці, ведай – на рызыку ідуць нямногія.

Памятай: мы ня можам сабе дазволіць падпольную сацыяльную дзяржаву, у якой сотня чалавек бегае вакол ста тысячаў патрыётаў, праўда, гарачых, але іх крэда – «Вы жывіце з годнасьцю, а мы будзем жыць з камфортам».

## Фірма

Падпольная грамадзкасьць можа ўзгоднена і эфэктыўна дзейнічаць, калі зьнізу ператорыць індывідуальнае прадпрымальніцтва ў незалежныя самакіравальныя грамадзкія структуры фірмы. Ваеннае падпольле Арміі Краёвай, насуперак супрацьлегламу меркаваньню, ня

ўзнікла ў выглядзе піраміды нішаў з простай залежнасьцю. Яно было сукупнасьцю «фірм», паміж якімі былі распрацаваныя функцыянальныя сувязі. Гэта было месьніцтва, а не лаяльнасьць.

Дэвізам падпольля павінна быць правіла: малая група – вялікі бізнэс. Чым больш аўтаномнае аб'яднаньне, тым меней арганізацыйных праблемаў. Парадокс – у падпольлі мы ажыцьцяўляем тыя прынцыпы рацыянальнай арганізацыі працы, якія камунякі імкнуліся вынішчыць. Структура фірмы павінна быць такой, каб максымальна зьменшыць колькасьць кантактаў. Таму спэцыялізаваныя ячэйкі павінны перадаваць адзін аднаму гатовы тавар, які не патрабуе чарговых узгадненьняў, выпраўленьняў, дапаўненьняў.

Калі фірму ліквідуюць, яна аўтаматычна стварае свае чарговыя агенцтвы (напрыклад, выдавецтва арганізуе бібліятэку, якая абслугоўвае сваіх супрацоўнікаў, таварыства навуковых курсаў стварае асабістую паліграфію і г. д.). Думка пра спэцыялізацыю, накіраваная зьверху згодна з рашэньнем, прынятым цэнтрам, зьяўляецца праявай бальшавізму. Паколькі менавіта ты, а ня Ікс, знайшоў спэцыяліста, які можа зрабіць схованкі вашым канспіратарам, – няма прычыны, празь якую ты б перадаў кантакт зь ім у невядомы канал арганізацыі. Няма такой грамадзкай справядлівасьці, у імя якой паляпшэньне ўмоваў бясьпекі працы ў падпольлі не магло б пачацца менавіта з тваёй фірмы.

На пачатку дзейнасьці якой-небудзь арганізацыйнай структуры яе цэнтар павінен скараціць да мінімуму новыя кантакты. КДБ у імкненьні разбурыць фірму можа зрабіць гэта толькі двума спосабамі: знайсьці каго-небудзь з цэнтру (калі гэты чалавек праходзіў па якой-небудзь справе ці яго вышуквала паліцыя) або заслаць у нашую сетку правакатара, які паступова будзе рабіць тут кар'еру. Выпадковыя, адзінкавыя правалы не павінны цягнуць за сабой ланцуг масавых правалаў. Менавіта таму наша канспірацыя зьяўляецца выпрабаваньнем і з арганізацыйнага боку, паколькі мы як грамадзтва маем пэўную долю бальшавізацыі. Толькі хворая бальшавізмам арганізацыя ня можа працаваць без умяшальніцтва шэфа. Бальшавіцкі цэнтар стала пераходзіць на кіраваньне, таму што прамежкавыя зьвёны ня могуць ці ня хочуць (а часьцей – усё разам) прымаць рашэньні.

## Тавар

Кожны з супрацоўнікаў фірмы мае дзьве магчымасьці: пастаўляць ці хлам, ці гатовы прадукт. Каб эфэктыўна працаваць у падпольлі, мы

павінны даводзіць да канца асобныя фрагмэнты кансьпіратыўнай працы і перадаваць яе адпаведным ячэйкам у патрэбным выглядзе. Гэты прынцып датычны сустрэч, інфармацыі, пошты. Калі мы прызначаем сустрэчу, то неабходна вызначыць час, месца, колькасьць удзельнікаў, працягласьць. Калі перадаем інфармацыю, трэба зьвесьці яе да пісьмовай формы, інакш ёсьць небясьпека дэзінфармацыі і плётак. Калі мы перадаем каму-небудзь пакет нелегальнай літаратуры, трэба ведаць дакладную колькасьць гэтай перадаванай літаратуры. Тавар, які варочаецца паміж каапэрантамі ў форме кволенькіх груповак («мы толькі перадаем, у кансьпірацыі лепш меней ведаць»), у рэшце рэшт трапляе ў якую-небудзь «чорную дзірку», у якой ёсьць уваход і ніхто ня ведае выхаду, – і тады большы шанец, што яго знойдзе паліцыя.

У час пасьляваеннага беспартыйнага ўзнаўленьня краіны мы першае пакаленьне, якому пашчасьціла бачыць канкрэтныя вынікі нашай працы ў эпоху камунізму.

У падпольнай працы трэба эканоміць свой час і не ствараць залішніх інфармацыйных каналаў. Напрыклад, дамоўленасьць пра сустрэчу зь незнаёмым калегам зь іншай структуры заўсёды павінна быць аднабаковай і не патрабаваць пацьверджаньня. Зваротны сыгнал перадаецца толькі тады, калі партнэру не падыходзіць час ці месца сустрэчы. Таварам зьяўляецца інфармацыя: «А чакае Б у чацьвер, запасная пятніца, у 17.10 з “Советской Белоруссией” у левай руцэ ля кіёску “Белсаюздрук” на плошчы Перамогі».

## Грошы

Самаахвяраваньне і праца на грамадзкіх пачатках – гэта жахі камунізму. Незацікаўленасьць зьяўляецца найлепшай умовай найгоршай зацікаўленасьці: схаваных, а ня яўных амбіцыяў, схаваных, а ня яўных кампэнсацыяў закамплексаванасьці, схаванага пагарджаньня да сыстэматычнай працы. Хтосьці не прыйшоў своечасова, «бо і так ганяе з раніцы да ночы», не надрукаваў акуратна, «бо ён ня кадравая машыністка», не зрабіў справу, «бо колькі можна цягнуць на сабе, а жыць на штосьці трэба», – гэта касьпіратыўны чыноўнік, які толькі замаруджвае падпольную працу. Хацеў бы штосьці зрабіць для Свабоднай Рэспублікі, але прагне незалежнасьці, якая, паводле словаў Пілсудзкага, павінна каштаваць некалькі капеек і дзьве кроплі крыві.

Памятай: патрыятызм – заўсёды рызыка, якую ты ўзяў на сябе, але праца ёсьць праца. За добра зробленую працу трэба добра плаціць.

Камуністы зьнішчылі культуру працы шляхам недаплаты, прымушаючы працаваць напалову задарма. Нашыя незалежныя самакіраваныя фірмы ня могуць сабе гэтага дазволіць. Трэба цьвёрда плаціць столькі, каб нашы каапэранты маглі нармальна жыць. Сарамлівыя адносіны да грошай («не дзеля грошай працуем у падпольлі») зьяўляюцца лішняй прытворнай сарамлівасьцю. Чырвоныя лічаць, што нам плаціць ЦРУ. А грамадзкасьць і эміграцыя, якія ахвяруюць на барацьбу за незалежнасьць, хочуць толькі аднаго – каб гэтыя грошы выкарыстоўваліся сумленна і па-гаспадарску. Каб дакладна палічыць грошы грамадзкасьці, не патрабуецца квітанцыяў, чэкаў, подпісаў і пячатак. Дастаткова сыстэмы «мець» і «павінен», а таксама добрасумленнасьці.

## Сустрэчы

Сустрэчы павінны праходзіць на нэўтральнай тэрыторыі, трэба пазьбягаць падпольнай працы ў месцы пражываньня. Навошта, каб усе ведалі, хто што робіць, нават тады, калі людзі выдатна ведаюць адзін аднаго і цалкам давяраюць. Гэта паводле старога правіла, што ніхто не паведаміць толькі пра тое, пра што ня ведае. Таму варта абмежаваць колькасьць кантактаў і інфармацыі да патрэбаў падпольнай працы.

Калі ты ідзеш па вуліцы з А і сустрэнеш Б, ты не павінен зь ім вітацца. Навошта А, зь якім ты ідзеш, ведаць пра тваё знаёмства з Б? Убачыўшы кагосьці з падпольшчыкаў на вуліцы, падыходзь толькі тады, калі ён дасьць табе які-небудзь знак. Бо ты ня можаш ведаць, ці мае ён «хвост». Людныя месцы, такія як прыпынкі транспарту, добра падыходзяць для кароткіх сустрэчаў, аднак толькі для візуальных. Калі ты пабачыш, што партнэр пабачыў цябе, зайдзі ў трамвай (і г. д.) – ён зойдзе за табой; або пакажы, што ты вырашыў ісьці пешшу, – твой партнэр пойдзе за табой.

Усе важныя пытаньні, якія патрабуюць спакойнага абмеркаваньня, якіх-небудзь запісаў, перадачы тавару, павінны вырашацца ў памяшканьні. Падслухоўваньне, якога ўсе баяцца, вядзецца толькі ў памяшканьнях, што даўно знаходзяцца пад назіраньнем. Там можна апэраваць толькі інфармацыяй, запісанай на паперы, або з дапамогаю агульных словаў (напрыклад, вазьмі і аднясі яму гэта, скажы ёй, што ён там будзе і г. д.), якія дапаўняюцца запіскамі.

З досьведу апошніх гадоў вынікае, што практычны вынік ад падслухоўваньня вельмі малы. Тут хутчэй размова ідзе пра псыхалягічны

ціск, чым пра магчымасьць кантролю нашых намераў у апэратыўным пляне. Дастаткова, калі тыя, хто дамаўляецца пра сустрэчу, будзе мець папярэдне зарэгістраваны код. Напрыклад, «у кавярне» будзе абазначаць папярэдне выбраную кавярню, а дзень і час будуць наўмысна зьмененыя на пэўны час. Пры пэўнай колькасьці падпольшчыкаў шанцы расшыфраваньня такога коду КДБ роўныя нулю.

## Сувязныя

Сувязныя і кур'еры неабходныя кожнаму кіраўнічаму цэнтру. Яны выконваюць такія справы, як разнос пошты, перанос тавару. Сувязны праводзіць разьведку, а пасьля зацьвярджэньня шэфам прынцыпаў функцыянаваньня (канкрэтным вызначэньнем заданьня: што, адкуль, куды) можа сам выконваць гэтую справу. На выпадак правалу, сувязныя павінны мець пры сабе мінімум рэчаў, якія могуць дэканспіраваць структуру, яны павінны ўмець ад іх лёгка пазбавіцца.

Наладжваньне ў нашай сыстэме сувязі зьяўляецца адным з найбольш эфэктыўных спосабаў дэканспірацыі. Напрыклад, пускаецца плётка, што дзіцёнак Ігрэка, які хаваецца, захварэў на рак. Калі гэтая плётка будзе перададзена далей, без праверкі на першай ступені, яна можа стаць прычынай таго, што Ігрэк вышле наўпрост сувязнога, які пры вяртаньні з інфармацыяй забудзе пра правілы бясьпекі. Дастаткова не заўважыць хваста – і правал гатовы.

Сувязнымі неабходна карыстацца тады, калі без іх немагчыма абысьціся, а не дзеля прынцыпу. Варта заўсёды памятаць, што ў палітычнай дзейнасьці просты перанос ваенных схем і абязьлічаньне кантактаў непажаданыя для атмасфэры, у якой ідзе падпольная праца. «Больш важная за справу – салідарнасьць», – напісаў калісьці Куронь. Гэтай салідарнасьці ня створыш рукамі адных сувязных.

## Нататкі

Нельга мець дома ці насіць з сабою нармальны нататнік. Сьцьверджаньні «Гэта мае старыя знаёмыя», «Гэта сяброўка па пясочніцы» для паліцэйскіх не зьяўляюцца аргумэнтамі. Паліцыя ня ведае, хто для нас зьяўляецца проста знаёмым, а хто – каапэрантам. Яны руплівa правяраюць людзей, адрасы ці тэлефоны, якія знаходзяцца ў нашым нататніку. Вынікі бываюць неверагоднымі. У сяброўкі зь пясочніцы, якая, паводле нашай адзнакі, зьяўляецца баязьліўкай, можа хавацца хтосьці, каго шукаюць, захоўвацца тавар ці штосьці падобнае. Магчы-

мы і такі факт, што наш уласны адрас трапіў у рукі паліцыі толькі таму, што камусьці была лянота зашыфраваць асобаў, якія асацыююцца ў яго выключна зь пясочніцай – «поўнасьцю невінаватым», паводле яго-нага разуменьня, паняцьцем.

Група падпольшчыкаў, хаця і ўключае шмат асобаў, пра дзейнасьць якіх мы ня маем (і добра) ніякага паняцьця, зьяўляецца ўсё ж такі адносна невялікай. Так было заўсёды, дастаткова пачытаць надпісы на магілах апошняй вайны – сем'і маглі з гонарам сказаць: «Гэта мы!». Таму адзін неабдуманы крок, сьлед, адрас можа выклікаць чорны ланцуг правалаў. І таму неабходна шыфраваньне самых неабходных нататак. Не хвалюйся пра тое, што «сам такі нататнік падазроны». Заўсёды можаш адказаць паліцэйскаму: «Я не жадаю, каб мае сябры перажывалі празь мяне такія самыя непрыемнасьці, як я з вамі ў гэты момант». Вуліцы трэба запамінаць, натаваць толькі нумары дамоў. Нататкі лепш запісваць алоўкам і закончаныя справы выціраць гумкай. Закрэсьліваньне не зьнішчае старога запісу.

За выключэньнем шыфраванага нататніка, які пэрыядычна трэба перапісваць, пазбаўляючыся непатрэбнай інфармацыі, усе нататкі неабходна весьці спосабам мініятурызацыі, што дазваляе лёгка выкінуць іх ці зьесьці. Запісы на чым-небудзь выпадковым жорстка караюцца. Адзін дысыдэнт сямідзясятых гадоў запісаў штосьці на плотнай камп'ютэрнай паперы і ў момант правалу, калі б не неспадзяваны ўдар дручком па сьпіне, ніколі б гэтага не праглынуў.

## Тэлефоны

Трэба абмежаваць да мінімуму тэлефонныя размовы, паколькі яны зьяўляюцца самым простым спосабам заўважыць нас. Званіць амаль заўсёды выключна з аўтаматаў ці зь месца працы. Трэба адкінуць дзіцячы этыкет – не называцца, а адразу пытацца: «Ці ёсьць Гена?». І размаўляць без загадкавых фразаў накшталт: «Ты паклаў ужо гэтыя селядцы?» – «Так, я ўжо паклаў іх у шафу» – «Ты што?! Селядзец – у шафу?» – «Ннну… у маразільную шафу»… Праўда, бывае, што перапужаныя абывацелі пры інфармаваньні адзін аднаго, напрыклад, пра ліпкія рукі якога-небудзь чыноўніка, кажуць: «Ведаеш, гэта не тэлефонная размова, гэта я табе распавяду пры сустрэчы». Гэта гарантуе нам інфармацыйны шум, які эфэктна маскіруе падпольную дзейнасьць. Аднак чорт ня сьпіць. У падпольлі павінен дзейнічаць агульны жыцьцёвы прынцып – тэлефон служыць узаемаразуменьню, а не балбатні.

Калі чуем у тэлефоне шчаўчкі і разумеем, што «размова кантралюецца», гэта не азначае, што мы ўжо дасягнулі ідэалу ўсеўладзьдзя паліцэйскай дзяржавы, апісанай Оруэлам у «1984 годзе». Гэта толькі пацьвярджае, што камуністы па-ранейшаму імкнуцца да свайго ідэалу: кантраляваць усё, што магчыма, і за колькі магчыма.

## Паштовая скрыня

Паштовая скрыня – гэта шлюз, які прыпыняе ланцуг у выпадку правалу. Гэта памяшканьне, празь якое кантактуюць асобныя арганізацыйныя ячэйкі: служыць для закідваньня матэрыялаў, перадачы інфармацыі і г. д. Паштовую скрыню нельга выкарыстоўваць зачаста ці зрэдку. Калі выкарыстоўваецца занадта часта, рух каля яе выклікае непатрэбную ўвагу суседзяў (у выпадку з кватэрай) або працаўнікоў (у выпадку з крамаю). Калі паштовая скрыня выкарыстоўваецца занадта рэдка, сувязь паміж людзьмі паслабляецца. Ніхто ня будзе сядзець двойчы ў тыдзень па некалькі гадзінаў, каб раз на месяц адчыніць камусьці дзьверы. Утрыманьне паштовай скрыні, якая мае добрую схованку або суседняе памяшканьне, што служыць для захоўваньня матэрыялаў, зьвязана з адносна невялікай рызыкай. Калі хтосьці, хто пагадзіўся функцыянаваць у якасьці кантактнай скрыні, выказвае шмат умоваў і перасьцярогаў, найлепш адмовіцца ад яго дапамогі. Гэта патрабуе ад цябе менш намаганьняў, чым сыстэматычная тэрапія, якую праводзіць твой каапэрант.

У летапіс польска-ярузэльскай вайны ўвойдзе кансьпіратар, які ўва ўтрыманую ім скрыню ўпусьціў першага чалавека з таварам, і нікога больш. Хаця наступныя давалі сыгнал пра свой прыход раней дамоўленым спосабам, ён толькі затрымліваў дыханьне. Бо ня мог ён адчыніць дзверы, калі меў настолькі каштоўны тавар.

## Кантора

Калі ты хочаш пазьбегнуць доўгіх тэлефонных размоваў і сустрэчаў у горадзе, патрэбна адчыніць кантору, у якой ты будзеш прымаць сувязных і сталых супрацоўнікаў. Калі кіруеш працай 7–10 чалавек, без канторы закансьпіруешся да сьмерці. Будзеш бегаць толькі дзеля таго, каб падтрымліваць кансьпіратыўныя кантакты, якія пры першай выпадковай аварыі выклікаюць перашкоды ў працы арганізацыі. Натуральна, кантору і паштовую скрыню, як месца сыходжаньня розных ніцяў, трэба ахоўваць.

## Схованкі

Захоўвай правіла: схаванае найгоршым чынам усё ж такі лепей, чым навідавоку.

Візыты паліцыі, умоўна кажучы, бываюць трох відаў. Першы від – гэта прыход людзей, якія бегла аглядаюць кватэру. А раптам якая матрыца павелічыцеля ўманціравана ў друкаваную машынку або хтосьці выкінуў у сьметніцу рамку для афсэтнага друку?

Другі від візыту – гэта сыстэматычны ператрус, які, хочаш ня хочаш, патрабуе прагляду ўсіх кніжак, скрыняў, папераў. Гэта нудная руплівая шматгадзінная праца.

Трэці від агляду – калі паліцыя мае ўпэўненасьць, што ў памяшканьні знаходзіцца склад ці друкарня, – тады ўжо пошукі да пераможнага канца. Тэарэтычна цудаў не бывае – што чалавек схаваў, тое чалавек знойдзе.

Практычна «візыты трэцяга віду» здараюцца выключна рэдка, другога – таксама рэдка, а 90 % правалаў пры ператрусах зьяўляюцца вынікам нядбайнасьці ў падпольнай працы: усё ляжыць навідавоку. Часам дастаткова, што загляне да нас суседка, нават не абавязкова даносчыца, проста пляткарка. Замест таго каб верыць у «што-небудзь», падлічваем рызыку. У момант любога правалу ёсьць шанец штосьці ўратаваць. Важна, каб схованкі ці патаемныя ўваходы-выхады адпавядалі функцыі памяшканьня. Той, хто сваю працу разглядае сур'ёзна, павінен мець дома схованку для дробязяў, куды за некалькі сэкундаў можна б было схаваць якую-небудзь невялікую рэч, і іншую схованку – на невялікую колькасьць падпольнай літаратуры. Тут ёсьць абавязковае правіла: не закансьпіравацца насьмерць. Адзін асобнік якой-небудзь кнігі ці часопісу не стварае ніякай пагрозы. Такую рызыку мы мусім дзяліць зь мільёнамі салідарных грамадзян.

## Падпольная літаратура

Падпольная літаратура – гэта мэта і сродак дзеяньня. Яна зьяўляецца спосабам грамадзкай сувязі. Забясьпечвае сувязь паміж падзеленымі кансьпірацыяй каапэрантамі. Фірмачы могуць праз свой падпольны друк атаесамляць сябе з пэўным інтэлектуальным узроўнем асяродку і палітычным выбарам фірмы.

Падпольная літаратура зьяўляецца для пачаткоўцаў школай падпольнай працы. Страх і яго пераадоленьне можна вымяраць стосамі схаванай і перанесенай падпольнай літаратуры. Сетка распаўсюд-

жаньня літаратуры – напачатку галоўная крыніца інфармацыі, грошай, матэрыялаў.

Вытворчасьць і распаўсюд падпольнай літаратуры ўводзіць нас у элемэнтарныя правілы падпольнай працы: ізаляваньне розных функцыяў (напрыклад, паліграфіі – г. зв. тэхнікай друку), стварэньне скрыняў-шлюзаў (напрыклад, паміж рэдакцыяй і друкарняй), строга абавязковае аддзяленьне опту ад розьніцы (у распаўсюджваньні і забясьпечваньні).

Варта зьвярнуць увагу на факт, што з часам нашы каапэранты выходзяць між сабою на прамыя сувязі без дазволу цэнтру. Напрыклад, цэнтар выключае з выкарыстаньня нейкую аптовую базу з прычыны пагрозы правалу, але старыя сувязі яе кіраўніка з кліентам, які не падазрае пра небясьпеку, прыводзяць да таго, што першы трапляе ў кацёл з намерам выканаць джэнтэльмэнскае пагадненьне: «Пакінь мне 50 асобнікаў «Малога кансьпіратара», бо далёка ехаць да новай паштовай скрыні».

## Паліцыя

Адносіны падпольшчыкаў з паліцыяй павінны мець значную дыстанцыю. Паліцыя не ўсемагутная і не ўсюдыісная, але таксама не зьяўляецца бандай дурняў з садысцкімі схільнасьцямі. Гэта адзін з найстарэйшых у сьвеце інстытутаў, і яе досьвед трэба ацаніць раней, чым аддаючы ёй рэмень і шнуркі як арыштант.

Паліцыя падобна да іншых установаў краіны, і тайныя агенты нярэдка «змываюцца» за некалькі хвілінаў да канца працы, аднак у паліцыі трапляюцца і людзі, што маюць прыроджаны інстынкт паляўнічага. У адным гарадку быў, напрыклад, паведамляльнік, які вырашыў выявіць дысыдэнтаў і прагульваўся па вуліцах падчас сканчэньня ТВ-праграмаў. Тыя, у каго пасьля сканчэньня праграмы было запаленае сьвятло, траплялі пад падазрэньне. Цяпер было дастаткова праслухаць пару размоваў, каб вызначыць крыніцу заразы.

На шчасьце, паліцэйскія паводле прызваньня сустракаюцца нячаста. Слава паліцыі заключаецца ў руціннасьці і агромністым бюджэце. Нават калі 90% магутнасьці фабрыкі МУС вырабляе брак, нават калі на фальшывы выклік туды зьяўляюцца адначасова некалькі дзясяткаў калябарантаў – паліцыя застаецца больш дзейсным інстытутам камуністаў, чым партыя або армія.

Факт, што пасьля выкраданьня «Салідарнасьцю» падстрэленага Яна

Наражыяка паліцыя, ня маючы ніякага сьледу, пайшла па ніці тэлефонаў з нататніка, канфіскаванага падчас першай «справы Наражыяка» ў 1980 г., даказвае, што нічога ў яе дасье не губляецца нават празь некалькі гадоў. Таму ўвесь час трэба пралічваць рызыку: ня трэба падымаць гвалт пасьля кожнага сыгналу, які сьведчыць пра небясьпеку, але «апёк» павінен выклікаць хаця б каранцін. Тут трэба лічыцца з сур'ёзным запозьненьнем дзеяньняў працаўніка. Паліцыя – не швайцарскі гадзіньнічак, а савецкая бюракратычная машына.

## Хвост

Сачэньне КДБ бывае розным. Часам мэтанакіраванае («клоп», прымацаваны да аўтамабіля, які дазваляе пільнаваць на адлегласьці; стварэньне «пастоў» у прыватных кватэрах, якія служаць для падслухоўваньня і назіраньня), у іншы раз нахабнае, надакучлівае. Яно заўсёды ставіць за мэту пазбавіць нас спакою падчас падпольнай працы. Дакладны хвост дазваляе напасьці на сьляды тваіх кантактаў. Нахабны – разьлічаны на псыхалягічнае дзеяньне – напужаць цябе.

Кансьпіратыўная група дапамагае і пазбаўляе адначасова. Палягчае цяжкасьць сталай рызыкі, выпрацоўвае прывыканьне, памякчае стрэсы, аднак таксама прытупляе пільнасьць. Памылковая ўпэўненасьць, што кансьпіратары больш высокага ўзроўню больш падвергнутыя небясьпечнасьці назіраньня, а табою, маленькім вінцікам, ніхто не цікавіцца. Калі памятаеш пра тое, што заўсёды ў цябе можа зьявіцца хвост, твае шанцы пазьбегнуць сачэньня павялічваюцца. Дакладны хвост – гэта цэлая брыгада з 10–12 чалавек, што перасоўваецца на трох-чатырох аўтамабілях. Калі ты едзеш аўтобусам ці ідзеш пешшу, ён страхуе цябе сьпераду і ззаду.

Калі ты заўважыў сачэньне, першы твой абавязак – пазбавіцца ад хваста, схавацца з вачэй. Найлепш – натуральным і спакойным чынам, каб паліцыя не зарыентавалася, што ты ведаеш пра сачэньне. Горш – выкарыстоўваць хітрасьці, выходзячы праз прахадныя двары, дамы з мноствам выхадаў і складанай планіроўкі, зьмяняць напрамак руху.

Тваёй першай думкай павінна быць – я пагарэў (наколькі і як надоўга – гэтага ты яшчэ ня ведаеш), і гэта павінна скончыцца на мне. Я ня маю права навесьці паліцыю яшчэ на каго-небудзь, не магу нічога выпраўляць пры сьпешцы.

Калі ты пакінуў аўтамабіль, не вяртайся да яго (у іх застанецца твой здымак, адзін на 10 мільёнаў здымкаў тваіх суграмадзянаў, але ня адрас).

## Кацёл

Калі паліцыя нападзе на сьлед кансьпіратыўнай кватэры, яна робіць у ёй кацёл (засаду), гэта значыць пачынае на працягу некалькіх дзён ці нават тыдня дзяжурыць у ёй у тры зьмены, хапаючы тых, хто ўваходзіць у гэтае памяшканьне. Таму кожнае памяшканьне павінна мець някідкую, але ўсё ж бачную сыгналізацыю, што перасьцерагала б пра «кацёл». (Лепш за ўсё ўсталяваць сыгналізацыю перад памяшканьнем і непасрэдна перад уваходам.) Працуючы ў падпольлі, памятай, што адчынены дом адчынены і для паліцыі.

## Правал

Трэба чакаць правалу, нават у самы нечаканы момант. Добра, калі зь зьдзіўленьнем, расчараваньнем ці палёгкаю задаеш сабе пытаньне Салжаніцына: «Гэта ўжо?». Трэба памятаць, што яно зьяўляецца толькі адным з доўгага, вельмі доўгага шэрагу.

Пры падключэньні каапэранта да працы трэба абмеркаваць зь ім алібі на выпадак правалу. Падчас вочнай стаўкі з паліцыяй ідэалам становіцца маўчаньне, але ня так ужо і блага – перш чым рашуча адмовіцца ад паказаньняў – даць кароткае (хаця б непраўдападобнае) алібі, якое тлумачыць сытуацыю. Асабліва таму, што паліцыя наогул часта ня ведае, з кім мае справу, і ня варта ствараць вобраз прафэсійнага кансьпіратара.

Пры арышце трэба памятаць, што чым болей хтосьці рашучы, тым карацейшым будзе для яго фізычнае і псыхічнае ўзьдзеяньне КДБ. Чым хутчэй яны запэўняцца, што нічога ад нас не даб'юцца, тым хутчэй перастануць мучыць. Ведаючы вопыт мінулага, можна прывесьці мноства прыкладаў людзей, якія рашуча адмаўляліся ад паказаньняў і былі вызваленыя з-пад арышту РАНЕЙ за тых, якія іх «сыпалі».

Пасьля праходу праз браму сьледчага ізалятару неабходна на час забыць пра ўсё, што страціў і, магчыма, надоўга. Пачнецца другі этап барацьбы, які зьяўляецца найцяжэйшым выпрабаваньнем нашай годнасьці, веры ў чалавека і чалавечую салідарнасьць.

## Адсідка

Нават адзінокія, ізаляваныя, пакараныя карцэрам за кантакт з таварышамі, «рэсацыялізаваныя» службай турэмнай аховы, мы можам быць моцнымі ўспамінамі, верай у тых, хто нам паверыў, застаўся з намі і цяпер змагаецца за нашу свабоду. Праходзячы праз браму тур-

мы, неабходна падумаць, што ўсё пачынаецца зноў, а ня тое, што прыйшоў канец.

Сядзець у турме трэба вучыцца. Ёсць людзі – выдатныя таварышы ў барацьбе, працы і забаве, але пакутлівыя ў якасьці сукамэрнікаў. Закрыты сьвет камэры патрабуе паніжэньня рэгістру, глушэньня агрэсіі, не надзяляць увагі сваёй асаблівасьці ці тэмпэрамэнту. Патрабуе больш такту, ураўнаважанасьці, кантролю эмоцыяў, чым утрымліваецца ў любым кодэксе свабодных людзей. Трэба ўмець сядзець, каб не парушыць спакойнай атмасфэры сукамэрнікаў. Трэба складаць сабе плян на дзень, навязваць дысцыпліну заняткаў, падпарадкаваць сябе ўнутраным абмежаваньням, каб зьнешнія абмежаваньні (турэмныя правілы, ціск сумеснага жыцьця зь людзьмі, якім нельга верыць да канца, і г. д.) не зламілі нас. У лістах да родных нельга занадта раскрывацца, пісаць, пра што і пра каго хвалюемся, – іх чытае наш сьледчы, а ня толькі турэмная цэнзура.

## Боль

Больш за ўсё людзі баяцца болю і адзіноты. І тое, і другое асацыюецца з найгоршым, з тым, што ліквідуе сувязь паміж людзьмі. Аднак фізычны боль можна ўявіць. Кожны з нас час ад часу яе адчувае: ламае руку, ідзе да стаматоляга, кладзецца на апэрацыю. Адзінае, што ты не павінен даваць згоды на гэты боль: гэта ня боль па асабістым выбары, чалавек проста зьміраецца з сваім лёсам.

Арышт, турма, катаваньне, біцьцё – гэта боль і адзінота, на якія чалавек павінен рашыцца сам. Спачуваньне зламаным і пакутнікам, спачуваньне чалавечаму падзеньню і слабасьці ня можа быць дазволам, дадзеным звыш «у імя дараваньня, бо невядома, што кожны з нас раскажа, калі яму пачнуць вырываць пазногці». Аднак ніхто пазногцяў не вырываў, а адмовіўся ён ад сябе ў выніку адной размовы перад сталом КДБэшніка, «таму што мае жонку і дзяцей». Дык вось, наша салідарнасьць – гэта салідарнасьць адносна іншых людзей, якія таксама маюць жонак і дзяцей.

## Культура

Барацьба з чырвонымі зводзіцца да сутыкненьня ў сфэры, якую шырока разумеем як культуру. Кінуты ў наш бок выклік гучыць так: хто хутчэй – мы ці апарат прымусу і гвалту – паддасца саветызацыі? Не ўспрымай прымітывізм і хамства як глупства. Не недаацэньвай праціў-

ніка, памятай, што наш КДБ зьяўляецца малодшым братам усесаюзнага (расейскага) КДБ. Гэтая традыцыя ніколі не паміраe зусім: сілаю і слабасьцю чырвоных зьяўляецца іх бюракратычная руціна. Мы абавязаны іх перамагчы ў сфэры культуры: хутчэй уводзіць інавацыі, вынаходзіць новыя патэнты падпольнай працы, прыводзіць да разгубленасьці камуністаў праз стварэньне ім чарговых палёў барацьбы. Хтосьці, хто на пачатку польска-ярузэльскай вайны разаслаў ліст з вайсковым штампам, які заклікаў часова ўстрымацца ад рэпрэсіяў у адносінах да дзеячоў «Салідарнасьці», перамог чырвоных інтэлектам. Савецкую машыну нярэдка закліноўвае ад адной пясчынкі.

## Страх

Апошняя вайна паказала, што адна справа – насіць значку «Салідарнасьць», але зусім іншае – падтрымаць яе справай. Калі хтосьці прапануе сваё памяшканьне ў якасьці паштовай скрыні і пры гэтым пытаецца: «Гэта надоўга?» – можаш быць упэўнены, што праз пару тыдняў ён пачне даваць расколіну і, пераконваючы ў «правале», распавядзе табе нейкую гісторыю пра падазроных тыпаў, што круцяцца вакол.

Страх амаль ніколі не праяўляецца ў форме заявы «Не хачу гэтага рабіць, таму што баюся». Чалавек, які баіцца працаваць у падпольлі, наагул рацыяналізуе свой страх і рэагуе агрэсіяй на тых, хто паставіў яго перад неабходнасьцю драматычнага выбару. Падпольшчыкі абвінавачваюцца ў «піянэрскіх гульнях», у адсутнасьці ці лішку ветлівасьці, у тым, што ня маюць часу пагаварыць на трывіяльныя тэмы, або наадварот – абвінавачваюцца ў тым, што сядзяць і сядзяць, нібыта толькі і чакаюць КДБ...

Людзі з заечым сэрцам агульнымі фразамі кажуць пра неабходнасьць захаваньня народнай эліты – і няцяжка здагадацца, што менавіта сябе лічаць гэтымі найлепшымі, безь якіх Радзіма не абыйдзецца ў будучым, пра маральны супраціў, лепш за ўсё бачны для праціўніка, пра тое, што ўсялякая хітрасьць ураўноўвае нас з хітрым праціўнікам... Пры гэтым трэба быць гатовым да таго, што гэтыя рацыяналізацыі асабістага страху нараджаюцца ў пакутах і авалодваюць намі паступова. Нейкі чалавек тыднямі сьцьвярджаў сабе, што зьбіраецца данесьці на суайчыньніка, які займаўся прастытуцыяй, хоць насамрэч рыхтаваўся выдаць... Царква асуджае гвалт, і тыя, хто насамрэч працуюць у падпольлі, таксама баяцца, але замест таго, каб апранаць на свой страх годныя маскі, спрабуюць перамагчы яго салідарнасьцю і братэр-

ствам. Людзі, якія абсалютна ня ведаюць страху, – самыя небясьпечныя супрацоўнікі, але, на шчасьце, яны рэдкія.

## Містыфікацыя

Па магчымасьці спрабуй вызначыць сфэру сваёй кампэтэнцыі і тое, што канкрэтна ты выконваеш у яе рамках. Калі А, Б і В перад размовай ня вызначаць, хто што павінен рабіць і пад чыім кіраўніцтвам, то прынцып «найлепш меней ведаць» можа прывесьці да таго, што несьвядома прыкладзеш руку да ўзьнікненьня якой-небудзь містыфікацыі. Для кагосьці станеш кімсьці зь «яго людзей», хтосьці павышэй будзе дабудоўваць твае замкі на пяску, магчыма таксама, што, ня кажучы да канца чаго-небудзь у імя канспірацыі, павялічыш колькасьць інфармацыйных шумоў. Калі зьяўляешся пасярэднікам у якім-небудзь кантакце, які служыць бясьпецы больш высокага арганізацыйнага зьвяна, імкніся канкрэтызаваць інфармацыю, якую перадаеш, з тым каб не ўзьнікала неабходнасьць удакладняць яе праз кантакт зацікаўленых бакоў. Напрыклад, сыгнал тыпу «КДБ усё ведае аб Іксе» можа толькі перашкодзіць працы Ікса.

## Маніі

Дэманстратыўная сочка КДБ, а таксама страх перад усюдыіснай паліцыяй можа прывесьці да навязьлівай ідэі акружэньня з усіх бакоў. Акрамя маніі перасьледу, якая лёгка ўзьнікае ўва ўмовах паляваньня на людзей, варта абараняцца ад людзкой мудрасьці, якая зводзіцца да сьцьвярджэньня, што ўсё зьяўляецца правакацыяй: той, каго яшчэ не схапілі, толькі таму «ходзіць на свабодзе», бо ўладам гэта выгадна.

Адмаўляючы рэальнасьць таго, што мы робім, мы самі сябе кастрыруем. Гэта прыём, да якога зьвяртаецца грамадзтва без усялякіх дзеяньняў з боку паліцыі. Ацэнка рэчаіснасьці ў катэгорыях вялікай змовы (імпэрыялістаў, Камінтэрну ці жыдамасонаў) ці вялікай правакацыі (маскалі, якія прагнуць, каб мы зарэзалі сябе ўласнымі рукамі, КДБ, які пусьціў партыю ў лібэралізацыю, каб яе скампрамэтаваць, ці войскі, якія… і г. д.) мае характар маніякальны.

## Балбатлівасьць

Старая прымаўка кажа: балбатун горшы за даносчыка. Бо балбатуна цяжэй выявіць, пляткар не бярэ на сябе ніякай адказнасьці. Таму калі робіш заўвагі пра падпольную працу, пазбаў іх ад дэталяў, якія дэ-

кансьпіруюць каго-небудзь, а тым болей не давай з разьбегу якіх-небудзь прозьвішчаў і адрасоў. А найперш – па-за колам найбліжэйшых супрацоўнікаў не вядзі так званых вольных размоваў. Іншая прымаўка часу апошняй вайны кажа: «Нават найлепшы кансьпіратар на нейкі час, як халадзільнік, павінен размарозіцца». Аднак істотна, каб пры размарожваньні ён ведаў, на якой кухні гэта адбываецца і ці прысутнічаюць пры гэтым свае. Тайна, якую найперш трэба захоўваць у падпольнай працы, гэта структура арганізацыі і ананімнасьць падпольшчыкаў. Асобныя людзі, пайманыя зь якім-небудзь таварам, пакуль самі не прагаварацца пра сваё становішча ў арганізацыі, маюць адносна высокія шанцы выйсьці сухімі з вады – г. зн. зь невялікім прысудам. І сваёй рашучасьцю выратуюць дзясяткі таварышаў.

## Свабода

У 1944 г. палякі і іншыя народы Ўсходняй Эўропы былі пазбаўленыя правоў. Ступень бяспраўя ў розныя пэрыяды была розная, бо няма нічога больш элястычнага, чым «сацыялістычны правапарадак». 13 лютага 1981 г. зьяўляецца толькі асаблівым выпадкам гэтай агульнай праўды камунізму: бяспраўе было афіцыйна прызнанае ў якасьці закону ваеннага становішча. Пры камунізьме адно дакладна: межы нашай свабоды з пачатку і да канца залежаць ад ступені нашага супраціву. Гэта павінен памятаць кожны, хто стаў на шлях апазыцыйнай дзейнасьці. Згодна з тлумачэньнем марксістаў, свабода – гэта ўсьвядомленая неабходнасьць нашай няволі. Мы лічым, што свабоды маюць ня столькі, колькі даюць, а столькі, колькі мы самі яе возьмем. Калі не пачнём будаўніцтва свабоднага грамадзтва з асобы, якая вучыцца здабываць сабе свабоду, то пасьля перамогі над камунякамі мы зноў вернемся на першыя старонкі гэтай кніжачкі. Таму змагаемся ня толькі за перамогу над камунай, але і з камунаю ў нас саміх.

Напачатку кожнаму цяжка працаваць у падпольлі. Усе баяцца, калі ўпершыню бяруць пачак такіх кніжак, як гэтая, і павінны аднесьці іх да незнаёмага чалавека, які напэўна баіцца ня менш за першага. Аднак калі абодва пераадолеюць страх, гэта будзе адпавядаць таму, быццам яны самі выламалі дзьверы сваёй турмы, у якую іх замкнулі. Пасьля выламваюць наступныя і наступныя. Усьміхаюцца адзін аднаму. Таму што свабода ня тое, у што дастаткова верыць. Неабходна яе практыкаваць.

[…]

## ГУЛЬНЯ Ў СЬЛЕДЗТВА

Прапаноўваю табе згуляць у сьледзтва. Зыходныя прынцыпы простыя: ты затрыманы (а пасьля арыштаваны) у сувязі з сваёй дзейнасьцю ў падпольлі. Ты не адзін, разам з табой арыштавалі групу тваіх паплечнікаў. Юрыдычнае азначэньне ня важнае (пад сьледзтвам яно, як правіла, мае папярэдні характар).

Я – сьледчы, прызначаны маім начальнікам для допыту менавіта цябе. Сьледзтва зьяўляецца барацьбой за інфармацыю. Вядома, інфармацыю на тэму дзейнасьці тваёй групы мы сабралі апэратыўнымі мэтадамі (сачэньне, падслухоўваньне, праз агентаў, якія дзейнічаюць у тваім асяродку); нягледзячы на вялікія тэхнічныя магчымасьці, апэратыўны матэрыял, аднак, як звычайна, ня поўны. Але што больш важна, яго нельга выкарыстоўваць як доказ у судовым паседжаньні. Суд ня прыме ў якасьці доваду здымкі, якія зрабіў наш агент (стаіш каля дому з Іксом), стужкі з запісам падслуханай тэлефоннай размовы.

Для суду істотным доказам будзе выключна прызнаньне аднаго з вас дваіх або паказаньні трэціх асобаў, якія ведалі пра вашы ўзаемасувязі. Значыць, патрэбны твае паказаньні, фармальна і ў адпаведанасьці з працэдурай, надрукаваныя на друкарскай машынцы, на блянку пэўнай формы, з тваім подпісам на кожнай старонцы. Яны патрэбныя ня толькі для таго, каб падрыхтаваць судовы працэс, у якім ты, Ікс і астатнія асобы будзеце асуджаныя і прыгавораныя. Ці дойдзе справа да суду і каго ў ім у рэшце рэшт будуць судзіць, ад нас мала залежыць: такога кшталту рашэньне ў нашай сыстэме палітычнае, а не паліцэйскае. Фармальна-прававая разьвязка тваёй справы ў вялікай ступені будзе залежаць ад непрадбачанай палітычнай каньюнктуры. Аднак твае паказаньні патрэбныя нам ня толькі дзеля таго, каб цябе асудзіць. Нам таксама трэба павялічыць нашыя паліцэйскія картатэкі любой інфармацыяй аб людзях, якія займаюцца апазыцыйнай дзейнасьцю.

Нам трэба таксама разбурыць сувязі з тваімі таварышамі.

Праграма-максымум – гэта палажэньне, калі ты выйдзеш адсюль у якасьці нашага супрацоўніка (што насамрэч можам арганізаваць). Аднак будзе дастаткова, калі выйдзеш адсюль скампрамэтаваным чалавекам, што даў паказаньні, якія абцяжарваюць тваіх сяброў. Дастаткова, калі выйдзеш зламаным чалавекам, з пачуцьцём жыцьцёвага

краху і бессэнсоўнасьці далейшага ўдзелу ў апазыцыйнай дзейнасьці. Таму нам так патрэбныя твае паказаньні.

Да гэтага часу ты ўпарта маўчыш. Я буду старацца вымусіць цябе гаварыць. Я маю шмат часу, а час працуе на маю карысьць. Адзінота, стрэс, абумоўлены знаходжаньнем у турме, паступова здымаюць тваю несаступлівасьць. Я маю вялікі службовы досьвед: умею карыстацца ветлівасьцю і крыкам. Ведаю, калі частаваць цыгарэтай, а калі ляпаць кулаком па стале. Твае псыхалягічныя рэакцыі па вяртаньні з допытаў мне добра вядомыя. Мяне інфармуе твой сукамэрнік, які працуе на КДБ у якасьці агента ў камэры. Натуральна, ты не настолькі неасьцярожны, каб яму даверыцца, але ня здолееш прыкідвацца, што сьпіш, калі ты пакутуеш ад бяссоньніцы, чытаць, калі цябе ахоплівае панічная гонка думак. У рэшце рэшт, усё ж такі шмат зь ім гаворыш – значна больш, чым табе падаецца.

Саманадзейны ў нейкай каштоўнасьці (цалкам мне чужой і вартай нагадваньня толькі ў той ступені, у якой яна можа быць выкарыстаная ў якасьці аргумэнту, які перапыняе тваё маўчаньне), ты думаў, што ОРГАНАМ будзе цяжка весьці сьледзтва па тваёй справе, якая для цябе была натуральным чынам чыстая. Твая ідэалёгія і твая мараль – адпаведным чынам выкарыстаныя спэцыялістам, якім я зьяўляюся, – у сьледчай сытуацыі могуць быць ужытыя для разьмякчэньня цябе. Пакарыстаемся імі тады, калі станецца так, што ня будуць дзейнічаць твае прымітыўныя эгаістычныя інстынкты – страх перад турмой і жаданьне хутчэй выйсьці адсюль. Калі не пачнеш даваць паказаньні, абараняючы сябе, – можа быць, захочаш абараняць іншых, абараняць справу, даказваць чысьціню сваіх намераў і мэтадаў барацьбы. Любы мэтад добры. Размова ідзе пра тое, каб ты пачаў даваць паказаньні.

А вось узоры, якім чынам я буду з табою размаўляць. Я буду карыстацца старымі, праверанымі прыёмамі. Нават дзіўна, што на 90 % яны эфэктыўныя.

Адчуй сытуацыю. Не чытай у сьпешцы. Рабі паўзы пасьля кожнага майго аргумэнту. Можаш карыстацца мэтадам псыхадрамы. Папрасі таварыша сыграць маю ролю. Друкаваныя словы няхай ператворацца ў голас сьледчага. Правер свае псыхалягічныя рэакцыі. Адкінь усялякае жаданьне весьці паляміку, пераўпэўніваць мяне, тлумачыць мне. Заставайся маўклівы.

Пасьля абдумай тыя выпадкі, у якіх ты зрэагаваў востра эмацыйна. Прадумай ці абмяркуй зь сябрам прычыны, дзеля якіх нават у гэтых

найцяжэйшых для цябе варунках – варта было маўчаць. Магчыма, гэта табе калі-небудзь спатрэбіцца.

1. Калі ты не дасі паказаньняў пра тое, што я ў цябе пытаю, – на жаль, мы будзем вымушаныя цябе затрымаць. Калі ты хочаш пайсьці адсюль дадому – прашу даць простую інфармацыю: ад каго ты атрымаў гэтыя ўлёткі?

2. Твая справа нескладаная і толькі з прычыны асабістай упартасьці ты вінаваты, што пракурор вырашыў цябе затрымаць. Такіх простых спраў аб улётках у нас насамрэч мноства. Мы ж ня можам арыштоўваць усіх затрыманых з улёткай. Як органы перасьледу, мы ведаем, што тыя, хто адразу нам скажа, адкуль, дзе, ад каго атрымалі ўлёткі, не настолькі задзейнічаныя ў распаўсюджваньні ўлётак, каб варта было іх арыштоўваць. Нас цікавяць тыя, хто працуе оптам, а не ў раздроб. А аптавікі наогул адмаўляюцца ад паказаньняў. Так, як і ты. Пасядзіш для пачатку тры месяцы – тады вырашыш даваць паказаньні.

3. Ты атрымаў санкцыю пракурора, таму што не хацеў казаць. Я зачытваю табе паказаньні Ікса. Ты яго выдатна ведаеш. І ты ведаеш, што яго ўдзел у вашай дзейнасьці быў большым, чым твой. Ікс на дадзены момант на свабодзе.

4. Любы пракурор і любы суд расцэняць тваё маўчаньне як абцяжваючыя абставіны. Гэтаму адпавядае параграф у кодэксе. Пра тое, што суд пры вызначэньні пакараньня бярэ пад увагу паводзіны абвінавачанага пасьля ўчыненьня злачынства, а значыць, шчырае прызнаньне віны, раскрыцьцё органам абставінаў сваёй злачыннай дзейнасьці і г. д. Гэта заўсёды можа быць падставай для спыненьня часовага арышту, закрыцьця справы, а ў сытуацыі, калі дойдзе справа да суду, гэта зьяўляецца гарантыяй, што атрымаеш мінімальны тэрмін (напрыклад, з адтэрміноўкай выкананьня). І для суду ня будзе ўсё роўна, ці пачаў ты даваць паказаньні адразу альбо празь некалькі месяцаў з пачатку сьледзтва.

5. Маўчыш, герой. Жарэш народны хлеб, а цяпер маўчыш, як вораг. Мы тут размаўляем з табой таму, каб аддзяліць тых, хто жадаў дабра для краіны, ад ворагаў, але быў выкарыстаны сапраўднымі ворагамі. А ты – вораг, і з такімі, як ты, мы разьлічымся раз і назаўсёды. Выйдзеш такім як ёсьць, абарванцам.

6. Спадарыня, вам 30 гадоў, у вас двое дзяцей. У нас шмат матэрыялаў, якія абцяжарваюць вашую віну. Можам вас або абвінаваціць у распаўсюджваньні прафсаюзнай прэсы, альбо ўва ўдзеле ў злачыннай ар-

ганізацыі, якая мела за мэту зьвяржэньне існага ладу. У другім выпадку вас будзе судзіць ваенна-палявы суд. Як мінімум, вам сьвеціць 5 гадоў. А вы ведаеце, што для жанчыны ў турме гэта значыць штосьці іншае. Калі вы выйдзеце, будзеце састарэлай жанчынай. І запытайце сваіх сукамерніц – тых, хто прыйшоў з турмаў, – колькі жанчын зь пяцігадовымі прысудамі маюць да каго вярнуцца. Я, натуральна, маю на ўвазе мужа. Можа, гэта выстаўляе нас не ў найлепшым сьвятле, але гэта жыцьцё. Так можна лягчэй заключыць простую дамову: вы нам распавядаеце ўсё пра свае сувязі ў рэгіёне, мы гэта пакідаем у сябе, а вам арганізуем справу аб распаўсюджваньні ўлётак Свабоднага прафсаюзу. І тады вы маеце шанец выйсьці з залі суду – атрымаеце два гады з адтэрміноўкай выкананьня ці штосьці ў гэтым родзе.

7. Я цытаваў вам, спадар, фрагмэнты паказаньняў іншых асобаў, арыштаваных па той самай справе. Вашыя калегі настолькі пачцівыя, што прызналіся ўва ўсім, што ўчынілі. Можна зь імі не пагаджацца, але нельга адмовіць у павазе. Вы ж звычайны баязьлівец.

8. Пасьля вочнай стаўкі з Іксом у вас, напэўна, не засталося сумневаў, што вашыя калегі даюць нам дастаткова шчырыя прызнаньні. І не сумнявайцеся, што вы ўсе ў нас у поўным камплекце. Дасьведчаныя рэцыдывісты правільна сьцьвярджаюць – вы атрымаеце магчымасьць паразмаўляць зь імі ў турме, – што ўсялякая справа, у якой ёсьць судзельнікі, заўсёды наперад прайграная ў момант арышту. Групу заўсёды ўдаецца разгаварыць. Гэта, будзьце ўпэўненыя, апраўдваецца і ў справах аб шпіянажы, і ў афэрах гаспадарчых, і ў справах валютных. І да вашага ведама, у любой справе арыштаваныя, рана ці позна, пачынаюць гаварыць. Напрыклад, у вашай групе загаварылі ўсе. Толькі вы не рашаецеся, і гэта будзе вам дорага каштаваць. Бо, як бачыце, усе ў рэшце рэшт жадаюць уратаваць сваю шкуру. А абараняючы сваю шкуру, перакідваюць сваю адказнасьць на сутаварышаў. І той, хто маўчыць, становіцца ўсё болей абцяжараным паказаньнямі іншых, а калі нарэшце рашаецца гаварыць – ужо позна. Суд заўсёды верыць таму, хто першы даў паказаньні. Таму вернемся да фрагмэнту паказаньняў вашага калегі Ікса, які сьцьвярджае, што гэта вы даручылі яму арганізацыю паштовых скрыняў для кантактаў у Горадні, Берасьці, а таксама арганізацыю канспіратыўных сходаў з удзелам духоўных асобаў…

9. Спадарыня напэўна ня любіць свайго дзіцёнка, бо аддае перавагу сядзець у турме замест таго, каб заняцца ім. А дзіцёнак плача цэлымі днямі і ходзіць па суседзях, бо баіцца заставацца адзін дома. Відаць,

давядзецца пазбавіць вас бацькоўскіх правоў, бо па гэтым канале праходзілі матэрыялы, якія маюць значэньне для бясьпекі краіны. Калі вы не жадаеце атрымаць справу аб шпіянажы – маеце толькі адзін спосаб гэтага пазьбегнуць: указаць асобу, ад каго вы атрымалі гэтыя матэрыялы. Калі гэты чалавек дасьць паказаньні, што гэта былі нейкія газэткі, то на наступны дзень вы будзеце вольныя.

10. Давайце згуляем з адкрытымі картамі. Мы ведаем, што вы перадавалі пэўныя матэрыялы за мяжу. Мы ведаем пра гэты канал перакідкі. Са зьвестак контравыведкі мы таксама ведаем, што праз гэты канал праходзілі матэрыялы, якія маюць значэньне для бясьпекі краіны. Калі вы не жадаеце, каб мы завялі справу аб шпіянажы – маеце толькі адзін спосаб гэтага пазьбегнуць: назваць асобу, ад якой вы атрымалі матэрыялы. Калі гэты чалавек дасьць паказаньні, што гэта былі нейкія газэткі, то на наступны дзень вы будзеце вольныя.

11. Мы ведаем, што вы дзейнічалі з ідэйных і маральных меркаваньняў. Людзі, што ўцягнулі вас у гэтую дзейнасьць, пэўныя рэчы для вас перабольшылі, выкарысталі вашую даверлівасьць, адсутнасьць досьведу і імкненьне да нейкага аўтарытэту. Зрэшты, мы таксама згодныя, што ўлады ня мелі рацыю да лістапада – і ня толькі да лістапада. Толькі і ўсяго, што вы сталі іх зброяй і не ўяўляеце, што гэта за людзі, якія іх палітычныя мэты, якія іх сувязі і знаёмствы. Ці ведаеце вы, напрыклад, што такі паважаны вамі кіраўнік рэгіянальнай групы ў сталінскія часы быў перакананым атэістам, у часы Гамулкі – агентам Візэнталя, што той тып мае рахунак у заходніх банках, езьдзіць на «мэрсэдэсе» і забясьпечаны да канца жыцьця. І нават той, здавалася б, сьціплы Ікс – ваш непасрэдны начальнік, хіба ён калі-небудзь казаў вам тое, колькі даляраў і ад каго атрымаў цяпер, падчас ваеннага становішча, на гэтую вашу дзейнасьць? Вам канкрэтныя доказы?

12. Спадарыня мае дзяцей? Я ўжо забыў. Не? Гэта добра, гэта вельмі добра, што менш людзей будзе пакутаваць! Аднак з другога боку, калі вас напаткае клімакс, тады для вас усё будзе страчана.

13. Вы разумееце, што матэрыялы, сабраныя сьледзтвам, дазваляюць абвінаваціць вас у шпіянажы і неадкладна перадаць справу ў ваенны суд? Вы ведаеце, што на прадпрыемствах Ікса ўвесь час выраблялася зброя? Вы ведаеце, што рабілася ў аддзеле П-8? Вы ня ведаеце? Затое мы ведаем, каму з П-8 перадавалі грошы. І пасылкі. Гэта называлася нібыта «дапамогай для рэпрэсаваных». Ды вы ня маеце ўяўленьня пра пэўныя ўзаемасувязі. Гэта выбрыкі выведвальных службаў – і мы

запэўніваем, што любая выведка заплаціць любыя грошы за такую нявінную інфармацыю, як прозьвішчы і адрасы асобаў, звольненых за парушэньне працоўнай дысцыпліны з аддзелаў вытворчасьці ўзбраеньняў. Нават за п'янства. А тым болей за забастоўку. Бо для любой выведкі гэта патэнцыйныя агенты. І вы прымалі ўдзел у тым, што было звычайнай вэрбоўкай агентаў. Мы толькі ня ўпэўненыя – вы прыкідваліся дурнем ці былі настолькі наіўным, што вамі карысталіся як сродкам у звычайнай бруднай шпіёнскай працы? Хіба мы шмат ад вас патрабуем? Жадаем ведаць – але дакладна, з падрабязнасьцямі, – хто акрамя вас на гэтым прадпрыемстве арганізаваў гэтую дапамогу для рэпрэсаваных. Бо калі гэта звычайная дапамога, то за гэта нікому нічога ня будзе, так што можаце маўчаць далей. І будзьце асьцярожныя, пасьля выхаду адсюль – што, зрэшты, адбудзецца няхутка – вас змогуць зьбіць на пераходзе ці знайсьці ў сваёй кватэры з усімі прызнакамі самазабойства. Вывведкі ўмеюць гэта інсцэнаваць.

14. Мы ведаем, што неаднаразова Ікс перадаваў вам пэўныя сумы грошай, зь якіх вы павінны былі частку перадаць на стварэньне пунктаў афсэтнага друку, частку ж перадаць на дапамогу для сем'яў арыштаваных. Ікс шчыры ў размовах з намі і да дробязяў дакладны. Мы нават ведаем, у якой колькасьці і дзе ён мяняў грошы. Ікс скардзіўся, што вы ніколі не давалі справаздачы за гэтыя грошы. Вы не жадаеце казаць, колькі і каму вы перадалі. З пункту гледжаньня прапаганды нам будзе прасьцей паказаць вас у судзе як звычайнага падманшчыка ці махляра. Атрымаецца выдатненькая справа з прысваеньнем круглай сумы састарэлым плэйбоем, які ў сваёй установе рабіў выгляд падпольнага дзеяча. А сьведкі на тое, што вы спусьцілі грошы, выдаткаваныя на друк, у начных бардэлях, у нас заўсёды пад рукой. Вы, відаць, ведаеце, што кожная другая прастытутка працуе на нас. Карацей кажучы, перад вамі выбар: даць патрэбныя паказаньні і сесьці на лаву падсудных у працэсе падпольнай «Салідарнасьці» разам зь людзьмі, якія маюць нейкую палітычную вагу, ці… Ці праз сваю дуркаватую ўпартасьць забясьпечыць сабе маленькі, ціхі працэсік з гарадзкімі прастытуткамі з начных бардэляў у якасьці сьведкаў абвінавачаньня. Прапаную яшчэ раз гэта абдумаць.

15. Маўчаньнем вы шкодзіце ня толькі сабе, але і ўсім астатнім. На папцы з улёткамі, якая была знойдзена падчас вобшуку ў вашай кватэры, запісаны тэлефон спадарыні Н. Мы яе затрымалі. Як вы ведаеце, яна асоба псыхічна няўстойлівая. Цяжка гэтаму зьдзіўляцца – дома

пакінула малога дзіцёнка. Мы атрымалі ад яе паказаньні і да раніцы будзе вырашана, атрымае яна санкцыю на арышт або будзе выпушчаная пад залог. На жаль, яе тлумачэньні прымітыўныя і сьлізкія – пракурор будзе схільны прымяніць арышт, баючыся ашуканства. А вы яму дапаможаце прыняць рашэньне, калі не жадаеце адказваць на простыя пытаньні – адкуль у вас яе тэлефон і што вас зь ёю зьвязвала?

16. Як вы добра разумееце, мы арыштавалі вас, спадарыня, дзякуючы паказаньням спадарыні Н. Вы ж ведаеце, што яна заўсёды была асобай псыхічна няўстойлівай. Пасьля дачы шчырых, вычарпальных паказаньняў нечакана зламалася і спрабавала скончыць жыцьцё самагубствам. Псыхіятар паставіў дыягназ – дэпрэсія, і цяпер яна знаходзіцца ў спэцаддзяленьні для падсудных. Вы ведаеце, спадарыня, там дастаткова цяжкія ўмовы, нават для здаровых людзей. Мы абое ведаем, што менавіта вы ўцягнулі сваю сяброўку ў антыдзяржаўную дзейнасьць і ў вашай арганізацыйнай структуры вы былі ў пэўным значэньні яе начальніцай. З усімі наступствамі, у прыватнасьці маральнымі, якія з гэтага выцякаюць. Калі б мы мелі вашыя паказаньні, ну проста паказаньні, то ўдзел гэтай псыхічна хворай дзяўчыны зводзіўся б да некалькіх выездаў у суседнюю вобласьць (па вашым загадзе) і да нерэгулярнай дапамогі пры транспартаваньні літаратуры, дык насамрэч мы маглі б яе зараз выпусьціць. Мы таксама не зацікаўленыя ў турэмных самазабойствах, а з гэтай дзяўчынай можа здарыцца markрознае… Так што давайце дамовімся. Спыненьне часовага арышту знаходзіцца ў вашых руках.

17. Спадар, вашая нявеста арыштавана па гэтай самай справе, спрабуе вас абараніць. Даўно дае паказаньні. Мы вам зачытвалі ўрывак зь яе тлумачэньняў. Бо як прывыклі дзейнічаць у гэтых сытуацыях жанчыны – перабольшвае свой удзел у справе, бярэ на сябе тое, што, вядома, было вашай дзейнасьцю, атрымоўвае такім чынам вялікі тэрмін. Можа, у рэшце рэшт, вы паставіцеся да яе паказаньняў крытычна, але самі бачыце, што яна ўсё блытае. Ня кожны такі псыхічна ўстойлівы, як вы. А з другога боку, скажу вам па-сяброўску, хаця, можа, і не павінен гэтага рабіць, назіраньне з асабістай практыкі. Вы гуляеце ў карты? Ну так скажыце, каму лягчэй віставаць – таму, хто лепш гуляе, ці таму, хто гуляе горш? Калі б вы былі разумным гульцом, вы б вялі гэтую гульню. Так, каб я мусіў дапытваць вашу нявесту, падрыхтаваны ўжо вашымі паказаньнямі, а не наадварот. Зрэшты, навошта я вам гэта тлумачу? Высакародных учынкаў вы ня робіце. Часта нават сутэнэры выраша-

юць такога кшталту дылемы маральнага характару больш рыцарскім спосабам. Герой падпольля, чорт вазьмі! Спакойна чакае, пакуль жанчына за яго атрымае прысуд.

18. Спадар ведае, што антыдзяржаўныя матэрыялы мы знайшлі ня ў вашай прыватнай кватэры (якой у вас няма), а ў кватэры вашых бацькоў. Вы ведаеце, дзе і на якой пасадзе працуе ваш бацька. Вы не жадаеце нам паведаміць, адкуль гэтыя матэрыялы там узяліся? Тым самым вы дазваляеце дапусьціць, што яны ў аднолькавай ступені маглі належаць вашаму бацьку. І мы вырашылі гэта праверыць. Толькі пасьля гэтай праверкі, вы ж у гэтым не сумняваецеся, ваш бацька стане апошнім чалавекам. Здаецца, яму засталося два гады да пэнсіі, ці ня так?

19. Вы інтэлігентная маладая жанчына. Паспрачаемся, што вы маеце пэўную ідэалёгію, нейкія погляды, нейкую праграму. Затое падчас сьледзтва вы паводзіце сябе, як поўная ідыётка. Штосьці ўзяла, штосьці прынесла, з кімсьці сустрэлася. Гэта вядома з паказаньняў іншых. Аднак тыя, іншыя, пры дачы паказаньняў неяк паказваюць сябе. Напрыклад, Ікс напісаў нам сваё поўнае палітычнае крэда. І ён на сваім працэсе выступіць як дзяяч. А вы на гэтым працэсе паўстанеце яго каханкай, якую ён выкарыстоўваў у якасьці кансьпіратыўнай дзяўчынкі на пабягушках. Ня ведаю, ці падабаецца вам гэтая роля.

20. Вашы сябры з гэтага, як вы кажаце, «падпольля» ўвесь час паводзілі сябе як дылетанты. Не трымаліся правілаў кансьпірацыі. Вы вінаватыя ў іх глупствах і неасьцярожнасьцях, бо вас так хутка арыштавалі. Мы ведаем, што вы значна лепш – арганізацыйна і прафэсійна. Калі б гэтая група працавала згодна з вашымі прынцыпамі (пра што мы ведаем дзякуючы паказаньням Ікса) – значна цяжэй было б вас выкрыць. Вы – прафэсіянал высокага ўзроўню, і мы ўмеем цаніць прафэсіянала. На жаль, вы зьвязаліся з бандай саплякоў. І вы бачыце – працэс вашай групы (як і іншыя працэсы) калісьці стане матэрыялам для гісторыка. І будучы гісторык ацэніць вас або як арганізаванае, палітычна мудрае падпольле, або як слабакоў. І ці захочаце вы рэканструяваць арганізацыйныя прынцыпы вашай сеткі распаўсюджваньня падпольнай літаратуры?

21. Так што гэта вы будзеце тым другім эшалонам, які бутэлькамі з палівам будзе зьнішчаць войскі і міліцыю? Не абарочвайся. Мае калегі нічога ня робяць, толькі стаяць. Мы маем час. Ну, хто гэта табе даў?

22. У вас перад носам брашурка. Што гэта, на вашую думку? Хто гэта

напісаў? Зь якой мэтай? Вы маўчыце? Вас вучылі маўчаць. Рознымі мэтадамі. Некалі існавала такая інструкцыя пра тое, як уставаць і сядаць, выпіскі з кодэксу з скажоным тлумачэньнем законаў. «Грамадзянін і служба бясьпекі». Вось гэты тэкст. Вы ведаеце, што гэта? Звычайная шпіёнская інструкцыя. Тэкст інструкцыі, якая павінна дапамагчы ў выпадку правалу. Вы ведаеце, на падставе чаго гэта было распрацавана? Вось фатакопія, якую наша контрразьведка атрымала ў адным з цэнтраў амэрыкнскае выведкі – Усходнеэўрапейскім сэктары. «Sensitivity Training as a Tool for Strengthening the Resistance to Brain-Washing». Калі вы ня ведаеце ангельскай, перакладаю: «Трэніроўка адчувальнасьці ў якасьці супрацьдзеяньня прамываньню мазгоў». Паглядзіце і параўнайце. Усе 22 пункты адпавядаюць – ці ня праўда? Вы і далей будзеце маўчаць у адпаведнасьці з гэтай шпіёнскай інструкцыяй?

**Варшава, 1983 г.**